
Przegląd Środkowo-Wschodni

9/2024



Uniwersytet Warszawski
Instytut Studiów Interkulturowych Europy Środkowo-Wschodniej

Przegląd Środkowo-Wschodni

Przegląd Środkowo-Wschodni

9/2024

Uniwersytet Warszawski
Instytut Studiów Interkulturowych Europy Środkowo-Wschodniej

Warszawa 2024

Rada Naukowa

CSc. Madina Alekseeva
Dr hab. Joanna Gierowska-Kałłaur (*Polska Akademia Nauk*)
Dr hab. Jerzy Gordziejew (*Uniwersytet Jagielloński*)
CSc. Alexander Grishchenko
PhD Magnus Ilmjärv (*Tallinna Ülikool*)
Prof. dr hist. Ēriks Jēkabsons (*Latvijas Universitāte*)
Prof. PhDr. Peter Káša (*Prešovská univerzita v Prešove*)
dr hab. Jadwiga Kozłowska-Doda (*Uniwersytet Marii Curie-Skłodowskiej*)
CSc. Roman Kyselov (*Національна академія наук України*)
doc. CSc. Andrei Liuby
dr Dangiras Mačiulis (*Lietuvos istorijos institutas*)
Prof. DSc. Viktor Moisiienko (*Житомирський державний університет імені Івана Франка*)
doc. dr Nataliya Nyagolova (*Великотърновски университет „Св. св. Кирил и Методий”*)
doc. CSc. Oksana Ostapchuk
PhDr. Marek Příhoda, Ph.D. (*Univerzita Karlova*)
Dr. Roman Smolorz (*Universität zu Köln*)
doc. CSc. Andrii Smyrnov (*Національний університет „Острозька академія”*)

Recenzenci tomu

Jazep Januszkiewicz
Aliaksandr Kraucewicz (*Uniwersytet Warszawski*)
Andrei Liuby
Uladzimir Padalinski (*Uniwersytet Jagielloński*)
Ina Sorkina (*Uniwersytet Warszawski*)
Anatol Vialiki (*Polska Akademia Nauk*)

Redakcja naukowa

Jerzy Grzybowski – redaktor naczelny
Joanna Getka – z-ca redaktora naczelnego
Marzena Grzybowska – sekretarz redakcji

Grzegorz Gąsior
Monika Grącka
Katarzyna Karwowska
Joanna Kozłowska
Rostysław Kramar
Iwona Krycka-Michnowska
Marcin Niemojewski

Spis treści

ARTYKUŁY

Віктар Якубаў, *Удзел грамадзян ВКЛ у войску II Ілжэдзмітрыя ў 1608–1610 гг.* 9

Юрый Тамковіч, *Феномен рыцарства ў Вялікім Княстве Літоўскім у XIV – XVI стагоддзях: гістарыяграфія пытання* 51

Мікола Хаўстовіч, *Рукапісы беларускай* Энеіды 87

Dangiras Mačiulis, *„Obcy" w kulturze narodowej: kwestia orientacji kulturowej na Litwie w okresie międzywojennym XX wieku* 103

Андрэй Мастыка, *Месца і значэнне памяці аб Акце 25 сакавіка для беларускага студэнцкага руху ў міжваеннай Вільні* 125

Kevin Foglar, *Legal challenges Faced by Hasidic non-profit Organisations in Poland* 145

Сцяпан Захаркевіч, *Пошукі і прэзентацыі агульных ідэнтыфікацый беларусаў напрыканцы XX – першай чвэрці XXI ст.: прыклад „бульбашоў"* 159

Jakob Wunderwald, M.A., *History's Receding Potentiality: From Vasil Bykaŭ to Eva Viežnaviec* 185

Тетяна Трофименко, *Українська поезія та музика після 24 лютого 2022 року* 203

Tomasz Cudowski, Wyspa Krym *Wasilija Aksionowa odczytana na nowo* 229

RECENZJE

Павел Котаў, *Метадалогія і дэмагогія або яшчэ раз пра год нараджэння Францішка Скарыны* 249

Noty o Autorach 263

ARTYKUŁY

This article is distributed under the terms of the Creative Commons Attribution 3.0 PL
© Copyright by Uniwersytet Warszawski Katedra Studiów Interkulturowych Europy Środkowo-Wschodniej & individual articles to their Authors

doi: 10.32612/uw.2543618X.2024.pp.9-49

Przegląd Środkowo-Wschodni, 9, 2024
ISSN 2543-618X eISSN 2545-1324

Nr art. 20240901

Data przesłania: 19.04.2024
Data akceptacji: 27.06.2024

Віктар Якубаў

Wydział Artes liberales, Warszawski Uniwersytet
yakubau@yahoo.com
ORCID: 0000-0002-5239-1598

Удзел грамадзян ВКЛ ў войску II Ілжэдзмітрыя ў 1608–1610 гг.

Udział obywateli WKL w wojsku Dymitra Samozwańca II w latach 1608–1610

Głównym celem artykułu jest odnalezienie i uwypuklenie udziału przedstawicieli Wielkiego Księstwa Litewskiego w ruchu Dymitra Samozwańca II podczas rosyjskiej „Wielkiej Smuty". Autor podjął próbę udowodnienia udziału przedstawicieli ziem białoruskich WKL w armii najemnej Dymitra Samozwańca II i istnienia odrębnego dowództwa składającego się z przedstawicieli ukraińskiej magnaterii Korony Polskiej, która dowodziła w obozie Samozwańca w Tuszynie. Dymitr Samozwaniec I i Dymitr Samozwaniec II zostali oficjalnie zignorowani przez elity rządzące WKL, a król Zygmunt Waza zabronił obywatelom i szlachcie udziału w atakach na Moskwian. Początkowo do Samozwańców dołączyła powiatowa szlachta kresowa – J. Budzilla, J. Kernażycki, M. Wilamowski i zbóje A. Lisowskiego, a dopiero po zakończeniu rokoszu w WKL, latem 1608 r. dowódcami pułków zostali kapitanowie weterani armii Wielkiego Księstwa Litewskiego: J.P. Sapieha, J. Tyszkewicz, A. Mlocky, E. Strawiński i inni. W przeciwieństwie do ziem ukraińskich Królestwa Polskiego, magnateria WKL, z wyjątkiem Tyszkiewiczów, nie poparła Dymitra Samozwańca. Obecnie brakuje dowodów na to, jaki stosunek do tego miał król Zygmunt Waza. Wiadomo, iż J.P. Sapieha został hetmanem północnej groty armii Dymitra Samozwańca II. On i jego kapitanowie pochodzący z WKL wykonywali najważniejsze zadania bojowe w latach 1609–1610, okupując północ Rosji próbowali uniemożliwić przemarsz M. Skopina Szujskego i Szwedów na Moskwę jesienią 1609 r. Po rozpoczęciu wojny między Rosją a Rzecząpospolitą 1609–1618, ucieczce Dymitra Samozwańca II

i przysiędze złożonej przez bojarów moskiewskich na wierność księciu Władysławowi, najemnicy z WKL, z własnej woli, wstąpili do armii państwowej.
Słowa kluczowe: Wielkie Księstwo Litewskie, Dymitr Samozwaniec II, wojska najemne, magnaci ochotnicy

Адной з закрытых тэмаў для афіцыйнай гістарычнай навукі Беларусі да гэтага часу з'яўляецца ўдзел і роля прадстаўнікоў беларускіх земляў ВКЛ у руху Самазванцаў ў Маскоўскай дзяржаве 1606–1611 г. Для расійскай і польскай гістарыяграфіі і грамадскай думкі XIX–XX ст. пры разглядзе падзей Расійскай Смуты было абсалютна характэрна ігнараваць удзел іх продкаў сучасных беларусаў і ўкраінцаў. Сённяшнія дыктатарскія рэжымы Расіі і Беларусі, нават больш чым пры цары, палітызавалі гэтую тэму, робячы з яе ідэалагічнае абгрунтаванне міжцывілізацыйнага супрацьстаяння. Мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца выяўленне „грамадзян" ВКЛ і іх ролі сярод удзельнікаў Ілжэдзмітрыяды 1606–1610 г.

Першага Ілжэдзмітрыя, ані магнатэрыя, ані дзяржаўныя структуры ВКЛ у адрозненні ад казакоў і шляхты (Мнішкі, Вішнявецкія) польскіх і ўкраінскіх земляў Польскага каралеўства (Кароны) не падтрымала[1]. Адзіная вядомая павятовая інструкцыя ВКЛ 1604 г. - слонімскага сойміка, прызнала "царэвіча", але заклікала трымаць мір з Масквой[2]. Аднак, калі Самазванец стаў царом Дзмітрыем I (1605–1606), а сандамірскі ваявода Юры і Марына Мнішак паехалі да яго ў Маскву, сенатары ВКЛ пачалі дамаўляцца з пераможцамі. Тым больш, што шлях вясельнага аршака праходзіў праз Берасце, Слонім, Менск і Оршу. У Слоніме, ім і іх свіце ў 1969 чалавек, на чале з кароннымі магнатамі Вішнявецкімі, Тарло, Стадніцкімі на Вялікдзень 1606 г. вялікі канцлер ВКЛ Леў Сапега зладзіў баль. 31

[1] А.В. Дземідовіч, *Вялікае Княства Літоўскае ў адносінахРэчы Паспалітай з Расіей і Швецыяй у першай трэці XVII ст.*, Мінск 2021, с. 44–55.

[2] Амброзяк Т., *Отношение литовских сеймиков к Смуте и интервенции Речи Посполитой в Москве* [w:] *Смута как исторический и социокультурный феномен.* Материалы всероссийской научной конференции 22.04.2013, Москва, 2013 с.181–182.

сакавіка ў Нясвіжы, з будучай царыцай і яе бацькам віленскі ваявода Мікалай Радзівіл правёў прыватныя перамовы[3]. Рэчы Паспалітай неабходна было пацвердзіць мір з Масквой пры новым цары, таму на вяселле Дзмітрыя I з Марынай Мнішак была выпраўлена вялікае пасольства на чале з веліжскім старастам Аляксандрам Гасеўскім[4] і малгоскім кашталянам Мікалаем Аляснiцкім[5]. Шлюбныя ўрачыстасці скончыліся трагедыяй 27 траўня 1606 г. Змоўшчыкі справакавалі пагром супраць замежнікаў, пад час якога забілі цара. Тых з гасцей хто выжыў, кінулі ў маскоўскія турмы, уключна з вялікімі пасламі і Мнішкамі. Забойцы цара Дзмітра I, начале з новым царом Васілем Шуйскім (1606–1610), афіцыйна тлумачылі масквічам, што той збіраўся разам з „літвой" замяніць праваслаўе на каталіцтва, а баяр і дваран – на магнатаў і шляхту. Гвалт над пасламі быў абразай дзяржавы і мог стаць законнай прычынай для пачатку вайны[6].

Аб падзеях у Маскве ў ВКЛ стала вядома ўжо ў канцы траўня 1606 г. Адразу пасля забойства, па Расіі пачаўся рух новых Самазванцаў і казацтва. Выведка ВКЛ вымушана была кантактаваць з імі. Летам 1606 г. Міхаіл Малчанаў абвесціў у Самборы пры двары Ежы Мнішака сябе „царом Дзмітром" і натхніў Івана Балотнікава на паўстанне. Аднак, як і ў выпадку першага Самазванца, сенат ВКЛ блакаваў на дзяржаўным узроўні ідэю інтэрвенцыі на Усход. Як толькі самазваны „цар" паспрабаваў пераслаць у Пуціўль праз землі ВКЛ, атрад наймітаў на падтрымку балотнікаўцаў, людзі Л. Сапегі перахапілі „гетмана" і яго салдат. Вялікі канцлер ВКЛ, як каардынатар дыпламатыі і выведкі на Усходзе, даслаў у каронны

[3] Dyaryusz Waclawa Dyamentowskiego (1605–1609) [w:] A. Hirschberg, *Polska a Moskwa w pierwszej połowie weku XVII*, Lwów 1901, s. 24–26.

[4] Сын ротмістра паляка, літвін у другім пакаленні, пачаткова слуга Л. Сапегі. Меў грамадства і маёмасць у Віцебску і Вільні. Niesiecki K., *Herbarz polski: w X t.,* t. IV, Lipsk 1839, c. 221.

[5] A.G. Przepiórka, *Od Staroduba do Moskwy. Działania wojsk Dymitra II Samozwańca 1607–1608*, Zabrze 2007, s. 19.

[6] Biblioteka Naukowa Polskiej Akademii Nauk i Polskiej Akademii Umiejętności (BN PAN PAU w Krakowie), sygn. 363, №23.

Самбор свайго слугу (Яна) Грыдзіча, каб „дазіраць" самазванца, але той уцек ад прымусовага нагляду „каяцца" ў кляштар бернардынаў. Рашучыя дзеянні канцылярыі ВКЛ паспрыялі таму, каб М. Малчанаў знік з далягляду і з'явіўся толькі праз паўгады ў свіце новага Самазванца, які аб'явіўся ўжо ў ВКЛ.

6 снежня 1606 г. іншы самазванец, які абвесціў сябе ўнукам Івана IV Жахлівага – Ілжэпётр, аб'явіўся ў Копысі дзеля таго, каб сустрэць „дзядзю". Яго пад кантролем паноў Зяновіча і Сянькевіча даставілі на сустрэчу з аршанскім старастам, мсціслаўскім ваяводам Андрэем Сапегам. У сувязі з візітам Ілжэпятра ў Віцебску 8 студзеня 1607 г. упершыню ўзгадваецца „цудам выратаваны цар Дзмітры". Верагодней за ўсё, гэта быў валацуга – настаўнік з ваколіц Шклова – Іван Нагі. Нягледзячы на некалькі стагоддзяў прафесійных гісторычных даследаванняў, дакументальна даказаць яго сувязь ці інспірацыю спецслужбамі ВКЛ дагэтуль няўдалося. Наадварот, канцлер і сенатары ВКЛ выступалі супраць авантуры і дзейсна супрацьдзейнічалі ёй. Паводле афіцыйнай версіі віцебскі „Дзмітры", неўзабаве „спужаўся" і ўцек у Прапойск, дзе яго схапілі і кінулі ў турму людзі чачэрскага, прапойскага старасты і берасцейскага ваяводы Крыштофа Зяновіча, а Ілжэпятра дэпартавалі назад з тэрыторыі ВКЛ у Маскоўскае царства[7].

Галоўнай прычынай зацягвання рэакцыі на знявагу пасольства была вайна са Швецыяй у Інфлянтах 1600–1611 г. і рокаш 1606–1609 г. Пад ціскам гэтых праблем Жыгімонт Ваза, як вялікі князь ВКЛ афіцыйна забараняў беларускім мяшчанам нападаць на маскоўскіх купцоў па абодва бакі мяжы ў 1604–1608 г[8]. Тым не меньш у канцы 1606 г. манарх паспрабаваў аб'яднаць грамадства, прапанаваўшы ў інструкцыях на павятовыя соймікі пачаць і перамагчы ў наступальнай вайне супраць Масквы. Аднак нават прыдворныя раялісты

[7] И.О. Тюменцев, *Смута в России в начале XVIII ст.: движение Лжедмитрия*, Волгоград 1999, с. 54–58, 61, 71–79.

[8] Нацыянальны Гістарычны Архіў (НГАБ), КМФ-18, Метрыка Літоўская, спр. 289, воп. 1, арк. 188, 320, 338, 375.

выступалі супраць падтрымкі новага Ілжэдзмітрыя[9]. Магнаты ВКЛ з досведу папярэдніх войнаў разумелі ў што могуць ператварыцца ўдары ў адказ і маршы войскаў па Беларусі, дзе Хадкевічы, Сапегі, Радзівілы і іншыя мелі свае латыфундыі. З усіх вядомых нам інструкцый ВКЛ гэтага перыяду, толькі рэчыцкая і пінская шляхта падтрымала вайну супраць Масквы, а віцебская патрабавала вызваліць з палону паслоў[10]. Пінчукі патлумачыла сваю пазіцыю: "бо такога разліцця крыві братоў нашых… разрабавання ўласнасці нашаму народу, ні ад якога іншага народа не было". Прычым Маскоўскую дзяржаву прапанавалася далучыць цалкам[11].

Пасля дасягнення дамоў з балотнікаўцамі, чачэрскі староста К. Зяновіч 23 траўня 1607 г. выправіў Ілжэдзмітрыя II на ўсход, пад суправаджэннем чачэрскага ўрадніка Рагазінскага (Рагазы), паддзячага А. Рукіна і прапойскага купца Георгія Кашчыца. Каля Паповай гары „цара" перадалі у Старадуб расійскім паўстанцам і данскому казацкаму атаману родам з Тарнопаля – Івана Заруцкага. На землі казацкага Старадубскага палка асабліва ў памежныя вескі Паповай гары і Раслаўля ад прыгону ўцякала шмат беларускіх сялян і мяшчанства[12], таму для выведкі ВКЛ зладзіць падтрымку Самазванца ў гэтым рэгіене было цалкам рэальна. Царская прапаганда Васіля Шуйскага афіцыйна абвесціла новага Ілжэдзмітра „жыдом-выхрыстам". З мэтай высвятлення асобы „цара" Л. Сапега накіраваў у Старадуб нейкага „жыда Якуба", які быў жаўнерам-наймітам Дзмітрыя І. Апошні пазнаў „цара" і нават павез лісты ад таго да Жыгімонта Вазы. За дзеянні свайго падначаленага Л. Сапега і кароль былі вымушаны тлумачацца. Дадзеная нестыкоўка дазваляе І. Цюменцаву

---

[9] Archiwum Państwowe na Wawielu, Archiwum Sanguszkow, (APW AS) №51.

[10] Амброзяк Т., Отношение литовских сеймиков …, op. cit., с.182.

[11] Biblioteka książąt Czartoryjskich (BCzart), sign. 103, № 258.

[12] Хроленок Е.В. Персональный состав Стародубских казаков накануне Деулинского перемирия (1614–1617): «Письма дозора» 1614 г. // История, политология, социология, философия: теоретические и практические аспекты, Новосибирск, 2018, № 6–7(8), С. 20–26.

казаць аб адсутнасці сувязі Ілжэдзмітрыя са спецслужбамі Рэчы Паспалітай, хаця аўтар следам за савецкай гістарыяграфіяй лічыць, што з лютага па травень 1607 г. шклоўскага валацугу да далейшай ролі падрыхтавалі на землях Беларусі польскі авантурыст Мікалай Мехавіцкі і К. Зяновіч[13].

Ад самага пачатку паходу, ужо 12 чэрвеня 1607 г. „цар Дзмітры" запрасіў да сябе ў наёмнікі жыхароў Магілёва, потым звярнуўся да грамадзян Оршы, Крычава, Мсціслаўя, Менска, Чарнігава. Пры гэтым вярбоўшчыку Зэрстыроўскаму, які быў скіраваны да магілёўцаў, было дазволена абяцаць жаўнерам у 2–3 разы большы жолд чым ім плаціліў Рэчы Паспалітай, а таксама падарункі і землі пасля перамогі. Аналагічныя прапановы шляхце ВКЛ павезла высакародная асоба – наваградскі ваявода Фёдар (Тэадор/Фрыдэрык) Скумін Тышкевіч. Тым часам, Мікалай Харлінскі[14] і Валенты Валеўскі з аналагічнай місіяй накіраваліся на землі Кароны. Праз сына Крыштофа Зяновіча, Мікалая Багуслава, „Дзмітры I" пераслаў Жыгімонту Вазе ліст з прапановай аднавіць „перарваныя" адносіны, але той адмовіўся прызнаць самазванца і загадаў Л. Сапегу сачыць за выкананнем забароны прапускаць наймітаў у Вялікае княства Маскоўскае (ВКМ)[15].

У адрозненні ад першага Самазванца, дзяржаўныя структуры ВКЛ не здолелі стрымаць свавольны рух памежнай шляхты і мяшчанства, якое прагнула ўзбагаціцца на вайне суседа. Пасля перасячэння маскоўскай мяжы да Ілжэдзмітрыя II, як прыватныя асобы, пачалі далучацца прадстаўнікі ВКЛ. У пачатку верасня 1607 г. з ВКЛ да „царка" прыбыў мазырскі харужы Восіп (Юзэф, Эзоп) Будзіла[16]. Апошні з нейкім „наймітам з Мсціслаўля" меў пры сабе 200 кавалерыі. Вярагодна, у большасці з мяшчан ВКЛ была сфар-

[13] Тюменцев И.О., *Смута в России…*, op. cit., с. 75–77.

[14] Мікалай Харлінскі vel Харленскі, сын падкаморыя кіеўскага. S. Uruski, *Rodzina.Herbarz szlachty polskiej*, Warszawa 1905, т. II, с. 150.

[15] И.О. Тюменцев, *Смута в России…*, op. cit., с. 98–101.

[16] *Памятники смутного времени*, Москва 2001, с. 167.

мавана пяхота, якую прывеў да Ілжэдзмітрыя II (?) Воўк[17], а са шляхты ВКЛ – роты Марка Вілямоўскага і Яна Кернажыцкага[18] – ветэранаў вайны ВКЛ са шведамі ў Інфлянтах 1600–1605 г. Мікалай Мехавіцкі прывеў у табар некалькі атрадаў польскай конніцы, ён стаў гетманам, а Г. Кашчыц падскарбіем Самазванца II[19].

Баявая дзейнасць патрабвала грошай. Летам 1607 г. кіеўскі падкаморы Шчэсны Харлінскі дакладаў К. Радзівілу, аб тым, што князь з роду валынскіх Гедымінавічаў – Раман Ружынскі атрымаў ад кракаўскага кашталяна Мікалая Зэбжыдоўскага 60000 злотых на найм войска. Прыгадаем, што і М.Зэбжыдоўскі і Януш Радзівіл у гэты час былі лідарамі рокашу. Пасля таго, як кароль разбіў іх пад Гузавам, наём жаўнераў на Маскву стаў яшчэ больш паспяховым. Ужо восенню роты Ружынскага налічвалі 700 – 1000 гусар і каля 400 пяхоты. Самуэль Тышкевіч прывеў з ВКЛ у лагер Ілжэдзмітрыя II яшчэ 700 коннікаў і 200 пяхоты[20]. Прыбыцце пасілкаў у табары ішло нераўнамерна. Перад паходам на Бранск, у абозе Самазванца караняжаў Р. Ружынскага было каля 500 коннікаў, а ў С. Тышкевіча – 700 гусар і 5 харугваў казакоў. Неўзабаве з кіеўскага ваяводства Кароны прыйшлі Адам Вішнявецкі з 200 гусарамі, паны Мялешка і Хруслінскі

---

[17] Вядомыя даследчыкам Ваўкі гэта шляхта, якая паходзіла з ВКЛ: з Полацкага, Пінскага і Рэчыцкага паветаў. Магчыма, што сярод іх знаходзіўся Яраш, які ўдзельнічаў у аблозе Смаленска (K. Żojdź, *Wszyscy ludzie króla: Zygmunt III Waza i jego stronnicy w Wielkim Księstwie Litewskim w pierwszych dekadach XVII wieku,* Toruń 2019, c. 347) або Максім, якога набіліtаваў сойм у 1616 г. за абарону Смаленска. K. Niesiecki, *Herbarz polskij*, Lipsk 1842, т. IX, с. 410.

[18] Нацыянальны Гістарычны Архіў Беларусі (НГАБ), спр. 85, воп. 1. арк. 429 Прывілей Марку Велямоўскаму на ўладанні ў Віцебскім ваяводстве ў Лужэснянскай воласці: Кучына, Жэчалава, Данілаўшчызна, Сухое ад 21.04.1606 г.; Ян Кернажыцкі вярагодна паходзіў з менскай шляхты. S. Uruski, Rodzina. *Herbarz szlachty polskiej*, Warszawa 1909, т. VI, s. 323.

[19] И.О. Тюменцев, *Смута в России*..., op. cit., с. 101–102.

[20] Вярагодней за ўсё гаворка ідзе пра сына берасцейскага ваяводы Юрыя Тышкевіча – Самуэль, які загінуў на неакрэсленай „маскоўскай вайне". K. Niesiecki, *Herbarz polski: w X t.,* т. VIII, Lipsk 1842, s. 176.

з брацлаўкага ваяводства[21]. Адтуль жа прыбылі Мікалай Веляглоўскі Карытко – 12 рот (каля 800 гусар і казакоў), Войцэх Рудніцкі – 120 вершнікаў, Анджэй Хруслінскі – 200 пяцігорцаў, Стэфан Казімірскі – 150 пяцігорцаў. Колькасць наймітаў з Рэчы Паспалітай у войску „царка" вырасла да 4000[22]. Пры гэтым шмат наймітаў, якія апынуліся ў табарах Самазванца, з'язджала бязладна рабаваць па Масковіі.

Зімой 1607–1608 г. – ваявода наваградскі „Стары" (Тэадор) Скумін Тышкевіч прыбыў у лагер Ілжэдзмітрыя II, з ротмістрам Габрыэлем Тупальскім з 400 коньмі кавалерыі і Ян Мікулінскі[23] з 450 былымі інфлянцкімі жаўнерамі. Каля 700 былых ракашан і бандытаў з ВКЛ прыйшло на чале з асуджаным на баніцыю злачынцам Аляксандрам Юзэфам (Эзопам) Лісоўскім[24]. „Цар" скіраваў лісоўчыкаў да данскіх казакоў. Лісоўскі злучыўся з імі і разграміў праціўнікаў Ілжэдзмітрыя II у ваколіцах Разані, Арла і Міхайлава. Вясной яго аддзелы складалі да 2500 ваяроў, сярод якіх пераважалі казакі і рускія[25].

Вясной 1608 г. у войску Самазванца было каля 2000 літвінаў, да якіх далучыўся Павел Руцкі[26] з 1150 ваярамі. Адзначым, што на гэты час у табары была больш добраахвотнікаў з земляў Польскага каралеўства і асабліва той яго часткі, якая зараз з'яўляецца ўкраінскай. У сакавіку 1608 г. князь Р. Ружынскі мёў 1800 коней, у асноўным з Кіеўскага і Брацлаўскага ваяводства. Акрамя яго з Галіцыі прыйшоў Аляксандр Збароўскі (сын былога гетмана Запарожскай Сечы), Мікалай Струсь (любецкі староста, які меў ула-

[21] *Historia wojny moskiewskiej przez Mikołaja Scibora z Marchocic Marchockiego*, Poznań 1841, s. 10.

[22] И.О. Тюменцев, *Смута в России…*, op. cit., с. 109–111.

[23] Іван/Ян Мікулінскі – род з Брацлаўскага ваяводства. S. Uruski, *Rodzina. Herbarz szlachty polskiej*, Warszawa 1914, т. XI, с. 60.

[24] Ротмістр ВКЛ А. Лісоўскі з'яўляўся сынам полькага ратмістра на службе ВКЛ. Першапачаткова ён быў слугам Януша Радзівіла. K. Niesiecki, *Herbarz polski: w X t.,* т. VI. Lipsk 1841, s. 133–134.

[25] *Памятники смутного времени*, Москва 2001, с. 331, 169, 211, 172.

[26] *Баркулабаўскі летапіс* „Беларускія летапісы і хронікі", Мінск 1997, с. 216.

данні на Галічыне і Падоллі), Я. Мікулінскі (450 чал.), Мікалай Веляглоўскі Карытка (600), Валенты Валеўскі (660), Адам Вішнявецкі (960). Разам наймітаў-замежнікаў у табарах Ілжэдзмітрыя II набіралася ад 5620 да 9200. Да іх належыць дадаць каля 3000 запарожскіх і 5000 данскіх і волжскіх казакоў Івана Заруцкага. У першай вялікай бітве – пад Болхавам 30 красавіка 1608 г. у войску Самазванца шляхта Рэчы Паспалітай складала каля 5000 на 12000 агульнай колькасці жаўнераў. Менавіта кавалерыя наймітаў разграміла войскі Шуйскіх[27].

Са снежня 1607 па травень 1608 г. у Маскве да цара Васіля Шуйскага адбывалася новае пасольства ад Жыгімонта Вазы. Начале яго быў полацкі Рурыкавіч – Ян Друцкі Саколінскі і паляк Станіслаў Віткоўскі. Для ВКЛ была актуальна пралангацыя міра з Масквой і вызваленне з турмы вялікіх паслоў А. Гасеўскага, М. Аляскіцкага і іншых гасцей вяселля Дзмітрыя I[28]. Перамовы зацягнуліся, але паслы дамагліся вызвалення і злучэння іх з вялікім пасольствам А. Гасеўскага. Хаця на практыцы памежным ваяводам і гетманам было загадана затрымліваць расійскіх паўстанцаў і наймітаў, якія ішлі ім на дапамогу, дыпламаты шантажавалі Васіля Шуйскага, што калі цар не выпусціць палонных, кароль падтрымае Ілжэпетра і Ілжэдзмітра. Падчас перамоваў з В. Шуйскім, Е. Мнішак выракся „зяця" і па просьбе цара скіраваў да наймітаў Самазванца ад імя Вялікага пасольства Пятра Баркоўскага і пляменніка М. Аляскіцкага, а пазней паноў Дамарадскага і Бучынскага з паведамленнем. Разлік рабіўся на тое, што хутка будзе заключаны міждзяржаўны мір, а грамадзяне Кароны і ВКЛ пакінуць межы ВКМ. Хаця наймітыпраігнаравалі заклікі дыпламатаў, у ліпені 1608 г. вялікае пасольства і цар заключылі перамір'е і не на два, як планавалася, а на чатыры гады[29]. Выпускаючы дыпламатаў дамоў, В. Шуйскі скіра-

[27] И.О. Тюменцев, *Смута в России*..., op. cit., с.114, 115, 140, 146, 157.

[28] А.В. Дземідовіч, *Вялікае Княства Літоўскае*..., op. cit., с. 2021, с. 57.

[29] Нацыянальны Гістарычны Архіў Беларусі (НГАБ). КМФ – 18. Метрыка ВКЛ, Воп – 1. спр. 596. арк.1–14.

ваў да Жыгімонта Вазы просьбу забраць сваіх падданых у Ілжэдзмітрыя[30].

Вясной 1608 г. у Ілжэдзмітрыя II назбіралася каля 27000 чалавек. Яны разбілі войскі В. Шуйскага ў мілі ад Масквы і ў канцы чэрвеня 1608 г. стварылі ўмацаваны Тушынскі лагер. Прадстаўнікоў Рэчы Паспалітай было сярод іх каля 5600 чалавек, 3000 запарожскіх і 5000 данскіх казакоў. Летам 1608 г. да іх далучылася рота Бабоўскага „з Літвы". Большасць войска тушынцаў складалі расійскія правінцыйныя баяры іх слугі, казакі, халопы і татары. Яшчэ вясной 1608 г. Самазванец скіраваў з Арла на Разань полк А. Лісоўскага. Палкоўнік разграміў войска верных Шуйскім разанскіх і арзамаскіх дваран. Пасля перамогі ён набраў ажно 30000 разанцаў, данскіх і запарожскіх казакоў і павёў іх з вялікім абозам у Тушына. Па дарозе яны захапілі Каломну. Нягледзячы на тое, што тры палкі кінутыя з Масквы на Мядзвежым бродзе разбілі войска А. Лісоўскага 27 чэрвеня 1608 г., перахапілі абоз і вярнулі Каломну – асноўныя сілы лісоўчыкаў зайшлі ў Тушынскі лагер[31]. У траўні 1608 г. Вялікія Лукі, Невель, Завалочча перайшлі на бок Самазванца, ў жніўні да іх далучыліся Тарапец, Белая і іншыя замачкі „літоўскай украіны".

Пасля завяршэння пастракашовага супрацьстаяння Я. Радзівіла і Я.К. Хадкевіча ў ВКЛ у чэрвені 1608 г., жаўнеры пайшлі наймацца на ўсход. Летам 1608 г. да тушынцаў прыбылі Яраш (Геранім) Стравінскі[32] з братамі і 500 гусарамі, Андрэй Млоцкі[33] – 150 гусараў з гарадзенскай канфедэрацыі, (Станіслаў?) Стараборoўскі[34] з 200 гусарамі, паны Арлікоўскі, Капычынскі, бацка

[30] И.О. Тюменцев, *Смута в России*..., op. cit., с. 73, 161.

[31] Ibidem, с. 166, 178–179.

[32] Браты Геранім (Яраш), Бальтазар, Эразм Крыштоф Стравінскія, шляхта Менскага і Троцкага ваяводства. K. Niesiecki, *Herbarz polski*: w X t. T. VIII. Lipsk 1841, s. 535.

[33] Ротмістр войска ВКЛ у Інфлянтах, паляк, які ажаніўся з літвінкай і асеў ў ВКЛ быў слугам Аляксандра Хадкевіча (K. Niesiecki, *Herbarz polski: w X t.,* т. VI. Lipsk 1841, с. 425–426; K. Żojdź, *Wszyscy ludzie króla...,* op. cit., s. 288).

[34] Вярагодней за ўсё, што гэта быў адзін з пяці сыноў кашталяна Пятра

і сын Бохвалы[35] з 200 жаўнерамі. Роты караняжаў Аляксандра Збароўскага і (Станіслава ці Яна) Стадніцкага тады мелі 500 гусараў, літвіны М. Вілямоўскага – 700–800, Я. Мікулінскага – 450 ваяроў. У ліпені–жніўні 1608 г. палітычную сітуацыю ў стане наймітаў на карысць ВКЛ змяніў прыход Яна Пятра Сапегі з 1720 жаўнерамі набранымі з былых берасцейскіх і гарадзенскіх канфедэратаў інфлянцкага войска ВКЛ[36].

Неабходна адзначыць, што кароль і віленскі біскуп па просьбе Л. Сапегі пераконвалі і забаранялі Я.П. Сапегу ісці да тушынцаў. Апошні аднак не паслухаўся. Свавольны ўчынак падарваў давер Л. Сапегі да ротмістра-пляменніка на некалькі год. Хаця спакусліва было б пайсці за сцверджаннямі В. Шуйскага і В. Сабескага і заяўляць аб існаванні патаемнай дамовы ротмістра з каралём[37], але на сённяшні дзень у мемуарах, карэспандэнцыі і іншых дакументальных крыніцах адсутнічаюць пераканаўчыя доказы сувязі вялікага канцлера ВКЛ ці каралеўскага двара з Я.П. Сапегам. Таму шэраг даследчыкаў робіць выснову аб прыватным характары ўдзелу праслаўленага ротімстра ў маскоўскай вайне ў якасці наймітa, ініцыятыве якога супраціўляліся дзяржаўныя структуры ВКЛ. Зрэшты, каб дамова існавала, падзеі 1609 – 1611 г. разгортваліся б інакш. Магчыма, што асабістым стымулам да ўдзелу ў Дзмітрыядзе для Я.П. Сапегі была яго сувязь з „украінскай" магнатэрыяй.

Пры перасячэнні дзяржаўнай мяжы з ВКМ[38] абраны маршалкам новастворанай канфедэрацыі Я.П. Сапега пачаў караць марадзёраў

Стаброўскага, палітычнага рэпрэсаванага пасля рокашу 1606–1609. K. Niesiecki, *Herbarz polski: w X t.,* т. VIII, Lipsk 1841, s. 474.

[35] Боўфал-Дарашкевіч род у Слонімскім і Гарадзенскім павеце. S. Uruski, *Rodzina. Herbarz szlachty polskiej*, т. I., Warszawa 1904, s. 366–367.

[36] *Дневники Яна Петра Сапеги (1608–1611),* Масква 2012, с. 36; И.О. Тюменцев, *Смута в России…*, op. cit., с. 181–182.

[37] W. Sobieski, *Żółkiewski na Kremlu,* Warszawa 1920, s. 8.

[38] В.У. Якубаў, *Першыя канфедэрацыі войска Вялікага Княства Літоўскага і іх уплыў на сітуацыю ў Вялікім Княстве Літоўскім у 1604–1608 гадах* „Веснік Полацкага дзяржаўнага універсітэта" 2008, № 7, с. 34–44.

смерцю, канфіскацыяй маёмасці і выгнаннем[39]. Аднак, ротмістры наймітаў, якія ішлі на ўсход асобна, мелі праблемы з дысцыплінай ужо падчас пастояў у ВКЛ. Так, рота „сапежынцаў" пад камандаваннем Яна Алендзкага разрабавала каштоўнасці Гасеўскіх, якія былі на захаванні ў віцебскіх камяніцах Войнаў і Герлінскіх. Перад маршам на Маскву роты П. Руцкага, А. Лісоўскага і А. Млоцкага спляндравалі маёнтак Гуменое віленскага біскупства, а лісоўчыкі – радзівілаўскі Клецк і Брагінскі замак Вішнявецкіх[40].

Увайшоўшы ў межы Расейскага царства, Я.П. Сапега спачатку адрэзаў верны Шуйскім Смаленск ад Масквы, а потым, калі даведаўся, што В. Шуйскі выпусціў палонных і накіраваў іх пад канвоем маскоўскіх войскаў да мяжы ВКЛ, пайшоў ім на перахоп. Па дарозе паслы і канваіры пасварыліся, Марына Мнішак, Е. Мнішак, і М. Аляскіцкі выправіліся на Белую, а А. Гасеўскі, С. Вітоўскі, Я. Сакалінскі перайшлі мяжу ВКЛ пад Веліжам. 14 жніўня атрад скіраваны Самазванцам, які складалі роты А. Збароўскага, Я. Стадніцкага, П. Руцкага вызваліў Мнішкаў спад варты. Сапежынцы не сталі спяшацца ў Тушына, а пайшлі да збароўцаў, якія пачакалі іх ў Любініцах. 18–19 жніўня адбыліся перамовы, на якіх Мнішкі аб нечым дамовіліся з „інфлянцамі" і ўсе разам вырушылі да „цара" пад Маскву[41].

Працягваючы ўнутрыдынастычнае супрацьстаянне з Жыгімонтам Вазам на чужой тэрыторыі, Карл IX спрабаваў нацкаваць на Рэч Паспалітую Барыса Гадунова, а потым В. Шуйскага. Працяглыя перамовы 27 лютага 1609 г. завяршыліся Выбаргскімі трактатам з Васілем Шуйскім, паводле якога шведскія гарнізоны павінны былі размясціцца ў Інгерманландыі, Карэліі і на Пскоўшчыне і цар наймаў сабе на службу 2000 вершнікаў і 3000 пехураў. Аднак, яшчэ летам 1608 г., калі на Пскоўшчыну з Масквы вярнуліся мясцовыя

[39] *Дневники Яна Петра Сапеги (1608–1611),* с. 39.

[40] Biblioteka Czartoryjskich (BCzart), Rkps. 102, №. 117; Якубаў В.У., *Першыя...*, op. cit., с. 36.

[41] И.О. Тюменцев, *Смута в России…*, op. cit., с. 186–189.

баяры і ваяры, яны распавялі землякам аб змове Шуйскіх са шведамі. Іх сведчанняў аб „здрадзе цара" хапіла, каб да Ілжэдзмітрыя II перайшлі Себеж, Апочка, Остраў, Ізборск і Краснае. Пскавічы адмовіліся ўпускаць у горад шведаў і, калі тушынскае войска з „гарадоў Літоўскай украіны" падышло пад Пскоў у пачатку жніўня 1608 г., горад адкрыў ім брамы. Тое ж зрабіла большасць прыбалтыйскіх гарадоў: Івангарад, Капор'е, Ладага, Арэшак, Карэла, Ям. Толькі Ноўгарад захаваў адданасць В.Шуйскаму.

З прыходам Я.П. Сапегі ў Тушынскім лагеры налічваў 10000 наймітаў, з якіх 6350 складалі прастаўнікі ВКЛ. Яшчэ больш узмацніў пазіцыі выхадцаў з ВКЛ падвод праз Паволжжа і Уладзімір А. Лісоўскага, які меў прыблізна 5000 літоўскіх і паўднёварасійскіх ваяроў. Паміж Р. Ружынскім і Я.П. Сапегам пачаліся бурлівыя перамовы аб умовах аб'яднання і субардынацыі[42]. Праз некалькі тыдняў, у канцы верасня, у войску Ілжэдзмітрыя II пачаліся складанасці з забеспячэннем Тушына. Тым часам, Р. Ружынскі забіў М. Мехнавіцага і абвесціў сябе вярхоўным гетманам Самазванца, а А. Вішнявецкі быў выгнаны з лагеру.

Каб пазбегнуць далейшых канфліктаў, Ілжэдзмітры II пачаў рассылаць жаўнераў на ўтрыманне па рэгіёнах. У Тушыне засталіся каля 10000 караняжаў, казакоў і расіян пад кіраўніцтвам Р. Ружынскага і І. Заруцкага. Я.П. Сапега быў прызначаны гетманам над наймітамі з ВКЛ і скіраваны са змешаным маскоўска-літоўскім войскам пашыраць уладу Самазванца на паўноч ад Масквы. Яго сілы былі наступнымі: полк Я. Стравінскага – 500 гусараў, М. Вілямоўскага – 700 капійнікаў (гусар і пяцігорцаў) і 200 казакоў, Я. Мікулінскага – 700 капійнікаў і 300 казакоў з гарматамі, роты пяцігорцаў Дзевялтоўскага[43] і Мірскага[44]. Разам з ім з Тушына выйшаў 6-тысячны

[42] Ibidem, c. 160–164, 190–192, 196–197, 201.

[43] S. Uruski, *Rodzina.Herbarz szlachty polskiej*, т. III, Warszawa 1906, c. 360; K. Niesiecki, *Herbarz polski: w X t.,* т. III. Lipsk 1839, c. 473–474.

[44] *Дневники Я.П. Сапеги*, с. 441.

полк маскоўскіх тушынцаў на чале з А. Лісоўскім. Роты А. Млоцкага і Баброўскага былі скіраваны з Тушына ў Серпухаў, адкуль на Каломну, дзе засталіся да развалу тушынскага лагера[45]. Зімой 1608–1609 г. караняжы Р. Ружынскага атрымалі ад Ілжэдзмітрыя II „у кармленне" землі на поўдзень ад Масквы, а сапежынцы – засталіся на поўначы. Маскоўскія ваяводы ў гэты час афіцыйна называлі Я.П. Сапегу „гетманам, панам, каштэлянічам кіеўскім, старастам веліжскім і керапецкім", а яго войска „літвой"[46].

22 верасня/2 кастрычніка 1608 г. на полі бітвы пад Рахманцавым у 2 мілях ад Троіца Сергіева манастыра войскам Я.П. Сапегі камандавалі А. Лісоўскі, Я. Мікулінскі, М. Велямоўскі, Я. Стравінскі. Сапежынцы разгромілі каля 15000 войск І. Шуйскага. Гэта параза спрычынілася да самавольнага выезду баяр з Масквы, асабліва тых, чыім дамам „ад літвы і рускіх вароў" пагражала разрабаванне, а пераможцы падышлі пад знакамітую сваім багаццем Троіцка Сергіеўскую лаўру. Манастыр быў моцнай фартэцыяй з 3000 ваяроў, 110 гарматамі і запасам зброі. Войска Я.П. Сапегі восенню 1608 г. мела каля 7000 кавалерыі і 3000 пяхоты з 14 палявымі і толькі адной штурмавой гарматай. Пачалася зацяжная аблога. Пад мурамі Троіцы былі створаны два палявыя лагеры, якія сталі базай сапежынцаў на наступныя два гады. У начы на 1 лістапада адбыўся першы няўдалы вялікі штурм. Больш таго, абложаныя зладзілі паспяховыя вылазкі: 9 лістапада яны захапілі 8 гармат сапежынцаў, а ў баі 28 лістапада забілі Юрыя Горскага, паранілі А. Лісоўскага і Яна Тышкевіча. Атрад наймітаў пад кіраўніцтвам Паўла Руцкага і расійскіх тушынцаў (1150 вершнікаў) у гэты ж час узяў у аблогу Іосіфа Валакаламскі манастыр і на працягу шмат месяцаў спрабаваў яго ўзяць штурмам[47].

---

[45] *Ibidem,* с. 60, 62; И.О. Тюменцев, *Смута в России…*, op. cit., с. 222, 251–253.

[46] *Памятники смутного времени,* Москва 2001, с. 357–366, 391–396.

[47] И.О. Тюменцев, *Оборона Троице – Сергиева монастыря 1608–1610 гг.*, Москва 2007, с. 15–23, 36; И.О. Тюменцев, *Смута в России…*, op. cit., с. 222–228, 233–234.

З мэтай прывядзення да прысягі „цару Дзмітрыю" Пераяслаўля-Залескага ў кастрычніку 1608 г. з Троіцкага лагеру Я.П. Сапега скіраваў літвіна Пятра Галавача[48], расійскага шведа Цімафея Б'югава і італьянскага найміта дона Хуана Крузацці з 300 запарожцамі, 3 ротамі гусараў і некалькіх сотняў пераяслаўскіх дваран. Яны занялі месца збору прыхільнікаў Шуйскіх і забралі сабе на службу каля 200 мясцовых дваран і татар. Іх атрад пачаў павялічыўся да 800 ваяроў. Пасля гэтага ўзмацнення ротмістры загадалі Растову прысягнуць на адданасць „цару Дзмітрыю". Мітрапаліт Філарэт і ваявода Т. Сеітаў сабраўшы 2000 маскоўскіх, растоўскіх, яраслаўскіх і ўладзімірскіх ваяроў, адмовіліся скласці прысягу. У выніку аддзелы П. Галавача рушылі на Растоў. У бітве 15 кастрычніка 1608 г. тушынцы разграмілі Т. Сеітава і ўварваліся ў горад. Яны разрабавалі і спалілі Растоў, а палоннага мітрапаліта накіравалі ў Тушына[49].

Пасля перамогі П. Галавач разаслаў ганцоў з патрабаваннем прысягі мясцовасцей на поўначы. Часта маскоўскія баяры спачатку прыязджалі прысягаць да Я.П. Сапегі, пасля чаго „гетман" адсылаў іх да „царэвіча". Першымі, ужо 18 кастрычніка ў лагер да Я.П. Сапегі прыехалі прысягаць яраслаўцы, праз дзень усцюжцы, раманаўцы, пашахонцы, кастрамічы, валагодцы і галічане. За кастрычнік – лістапад 1608 г. Суздаль, Юр'еў Польскі, Уладзімір, Арзамас, Мурам, Саратаў, касімаўскія і цемнікаўскія татары, абралі сабе ваяводу і даслалі пасольства не ў Тушына, а да Я.П. Сапегі пад Троіцу. Уладу „цара Дзмітрыя" прызнала большая частка краіны, але, абяцаных ім грошай, найманае войска не атрымала. Тады на агульным рыцарскім коле ў Тушына Андрэй Млоцкі прапанаваў увесці ў Расіі падатак – „панасоўшчыну", сродкі якога пайшлі б на ўзнагароду наймітам. Жаўнеры прымусілі Самазванца выпісаць ім адпаведныя граматы, забралі акладныя кнігі і іх прадстаўнікі

[48] S. Uruski, *Rodzina.Herbarz szlachty polskiej*, т. V, Warszawa 1908, c.166.
[49] И.О. Тюменцев, *Смута в России*..., op. cit., с. 236–239.

паехалі разам расійскімі тушынцамі збіраць гаспадаравы падаткі. Больш таго, як у часы вайсковых канфедэрацый у ВКЛ, гетман Я.П. Сапега распісаў зімовыя Лёжы сваім ваярам на землях „цара" ў паўночнай Расіі, дзе жаўнеры бралі стацыю на свае ўтрыманне з мясцовага насельніцтва.

Пётр Галавач і Ц. Б'югаў, якіх падтрымалі розныя групоўкі яраслаўскіх баяраў, неўзабаве ўвайшлі ў канфлікт паміж сабой. Нягледзячы на тое, што гарнізоны наймітаў Самазванца цалкам выціснулі з уезда бандытаў і свавольнікаў-загоншчыкаў, аднак „літва, палякі і казакі", як і самі расіяне, няшчадна рабавалі сялян і мяшчан. Адзіны, хто мог ім загадаць і ўтрымліваў дысцыпліну, быў Самуіл Тышкевіч. У лістападзе 1608 г. збіраць „панасоўшчыну" па яраслаўскіх уездах пачалі роты Канецкага, Янушкоўскага і М. Уяздоўскага, праз месяц – М. Ксенафонтаў і І. Незбытоўскі. Зімой 1608–1609 г. на Залессі, у Юр'еўскім і Суздальскім паветах мясцовае насельніцтва сцвярджала, што іх рабавала"літва". Менавіта там кватараваліся аддзелы (Я.) Мікулінскага і (Б.?) Стравінскага. Рэагуючы на звароты мясцовых, сілы гетмана з рота Я. Сабалеўскага правялі аблавы супраць марадзераў і „шмат хлопцаў, пайманых на загонах" пасадзілі ў суздальскую турму. Аднак праблема не знікла. Прыстаўствы ў Закубежскай воласці атрымалі Барацкі і М. Завязкі, у юр'еўскай воласці – Адамовіч, кіржацкі манастыр – Станіслаў Стаброўскі, Пераяслаў – Х. Канвінскі, А. Юшынскі, Я. Лазоўскі. Некаторыя наймиты нападалі нават на прадстаўнікоў афіцыйнай „царскай" адміністрацыі. Так, пан Страла з палку Я. Мікулінскага, забраў грошы з падаткаў, якія сабралі тушынцы Т. Крашыньскі і П. Міхалеўскі. Нейкі ротмістр „Яныш" Буякоўскі „ўчыніў ліхую смуту" ў Суздалі, таму мясцовы расійскі ваявода прасіў Я.П. Сапегі яго замяніць. Гэта не перашкодзіла Самуілу Корсаку разрабаваць маёнтак думнага дз'яка П. Трэц'якова. Раззлаваныя сваволяй, мясцовыя жыхары зладзілі змову, але яе выкрылі, а кіраўніцтва пакаралі[50].

[50] Ibidem, c. 222, 244–246, 333–337, 343, 351–355, 361–362.

Прыстаўства Я. Сабалеўскага размяшчалася ва Уладзіміры. Ён і іншыя ротмістры атрымалі загад вынішчаць дэзертыраў, загоншчыкаў і бунтаўнікоў супраць „цара Дзмітрыя". Уладзімірскі ваявода М. Вільямінаў пры дапамозе рот А. Прыклонскага і М. Акульскага разбілі і павесілі запарожскага атамана Налівайку, які рабаваў ваколіцы Уладзіміра, а камандзір гарнізона Кастрамы Хуан Крузацці пакараў бунтаўніка Яна Унгары. Спробы вярнуць дысцыпліну былі спозненымі. Калі татарскія і тушынскія атрады былі разбітыя пад Ніжнім Ноўгарадам, паўстала мясцовае насельніцтва ў Галічы, Волагдзе, Кастраме Памор'і, Яраслаўлі і Ноўгарадскіх пяцінах. У снежні 1608 г. маскіруючы барацьбу за ўладу паміж баярскімі групоўкамі змаганнем за радзіму, апалчэнцы мабілізаваліся пад слоганы прапаганды Васіля Шуйскага, які ў граматах сцвярджаў што рух Ілжэдзмітрыя II „арганізаваны Літвою каб забіць праваслаўе" і што „богаадступнікі літоўскія людзі і рускія здраднікі", „ўзялі Самазванца са Старадуба, а ўзяла яго Літва"[51].

На падаўленне паўстанцаў Ілжэдзмітры II скіраваў аддзелы Я.П. Сапегі на Кастраму, на Яраслаўль – А. Лісоўскага, Яраша і Эразма Стравінскіх, Р. Ружынскага – (Яна?) Бонка Ланцкронскага і Казакоўскага – да Усцюга і Бялозера. Аляксандр Сабалеўскі разам з суздальскімі тушынцамі пайшоў караць Шую, Кінешму і Юр'евец. 11 снежня А. Лісоўскі і Я. Стравінскі занялі Яраслаўль, разграмілі апалчэнцаў пад Вялікай Соллю, затым 23 снежня пад Данілавым, і ўжо 28 снежня 1608 г. захапілі Кастраму, а 2 студзеня 1609 – Галіч. У гэты ж час А. Сабалеўскі разбіў шуян. Паўстанцы вярнуліся і разбілі суздальскіх рускіх тушынцаў пад Шуяй, але прысланае падмацаванне на чале з М. Сабалеўскім, Я. Жычэўскім, Я. Мерскім і Дзевялтоўскім 17 лютага 1609 г. адкінула апалчэнцаў ад Суздаля. Разбітыя ледзьве здолелі ўцячы на лыжах. Пераследуючы іх, найміты з ВКЛ спалілі Шую, Плёс і Халуй[52].

---

[51] Ibidem, c. 357, 392 – 393.

[52] *Дневники Я.П. Сапеги,…*, op. cit., с. 76–78; И.О. Тюменцев, *Оборона…*, op. cit., с. 36; И.О. Тюменцев, *Смута в России* 19…, op. cit., с. 293–294, 414.

Калі на поўначы справы Самазванца ішлі больш меньш добра, дык на поўдні Тушынскі лагер перажываў заняпад. Хмялеўскі не здолеў ўзяць Каломну, а Р. Ружынскі быў паранены пад Красным сялом. У студзені 1609 г. рэйд смалян выбіў тысячу запарожцаў Чыжа з Дарагабужа. Самазванец хранічна не плаціў за службу, а таму тушынскія найміты даслалі паслоў на вальны сойм Рэчы Паспалітай і выставілі Ілжэдзмітрыю II рахунак на 17 мільёнаў злотых або 5 мільёнаў рублёў. "Цар Дзмітры" 11 лютага паспрабаваў уцячы з Тушына, але быў затрыманы. Пры ўсёй складанасці сітуацыі на гэты момант у войску Ілжэдзмітрыя II налічвалася ажно 40000 капійнікаў, размешчаных у сямі лагерах[53]. Авантура дасягнула піку папулярнасці не толькі сярод расіян, але сярод грамадзян Рэчы Паспалітай.

На месцы дыслакацыі найміты супрацоўнічалі з маскоўскімі баярамі. Так, яраслаўскі ваявода выправіў у паход 200 „літвы", казакоў і татар на чале з П. Галавачом, якія разбілі 11 сакавіка 1609 г. пад Раманавам валагодскае і паморскае апалчэнне. Аднак, як толькі войска тушынцаў сканцэнтравалася ў Яраслаўлі, пакінула Раманаў і ваколіцу, апошні зноў апынуўся ў руках апалчэнцаў. 27 сакавіка 1609 г., супраць тушынцаў паўстаў Уладзімір, а перад гэтым Мурам. А. Лісоўскі і М. Вілямоўскі накіраваліся на падтрымку Уладзіміра-Суздальскай групоўкі[54].

У канцы сакавіка – пачатку красавіка 1609 г. А. Млоцкі заблакаваў гарнізон верны Шуйскім у Каломне і перахапіў усе абозы з поўдня да Масквы. Ужо ў сярэдзіне красавіка ў Маскве пачаліся цынга, голад і змовы супраць Васіля Шуйскага. Толькі 17 ліпеня 1609 г. маскоўскія войскі здолелі адагнаць А. Млоцкага ад Каломны і расчысціць шлях для дастаўкі харчавання ў Маскву. У гэты ж час 3000 казакоў і пяцігорцаў А. Лісоўскага і Я. Стравінскага пера-

[53] *Памятники смутного времени*,…, op. cit., с. 61; И.О. Тюменцев, *Смута в России*…, op. cit., с. 398–400.

[54] И.О. Тюменцев, *Оборона*…, op. cit., с. 41.

духілілі чарговае паўстанне суздальцаў. Потым яны падышлі да Уладзіміра, дзе 3 красавіка разбілі і загналі мясцовых апалчэнцаў у горад. Узяць гэтую фартэцыю амаль без артылерыі было немагчыма. Тым больш, паколькі 9 красавіка паўстаўшыя яраслаўцы перабілі тамтэйшы гарнізон, а ротмістры Страла і С. Тышкевіч ледзьве выратаваліся, лісоўчыкам давялося здымацца з пад Уладзіміра. Яны пайшлі на злучэнне з Я. Мікулінскім, А. Ружынскім, В. Будзілам і іншымі сапежынцамі, каб выпраўляць сітуацыю. Паралельна ротмістр Сума і растоўскі ваявода І. Навумаў занялі Кастраму і адпомсцілі за забойства мясцовымі паўстанцамі прыхільнікаў Ілжэдзмітрыя II. Да іх на падмацаванне прыйшоў полк С. Тышкевіча. Сілы тушынцаў у Кастраме склалі каля 1000 шабляў[55].

Войскі на чале з В. Будзілам і Я. Мікулінскім у баях 6–9 траўня 1609 г. разбілі астраханскіх, сібірскіх і мясцовых паўстанцаў пад Яраслаўлем, спалілі і захапілі яго пасад. Аднак за ўвесь май літвіны так і не здолелі ўзяць мураваны крэмль і Яфімаў манастыр. Пасля чаго адышлі да асноўных сілаў на чуткі аб разгроме групоўкі Я. Кернажыцкага і аб руху апалчэнняў М. Скопіна Шуйскага і шведаў з Ноўгарада[56]. Пакуль ішлі баі за Яраслаўль, апалчэнцы напалі (з Уладзіміра) на Суздаль і (з Мурама) на Касімаў. У адказ тушынцы і ротмістр Сума ўдарамі з Суздаля ў чэрвені спалілі пасады Уладзіміра, а полк Я. Мікулінскага – захапіў Угліч. З сярэдзіны чэрвеня А. Лісоўскі, В. Будзіла і тушынцы занялі Юр'евец Паволжскі, спалілі Кінешму і імкнуліся прарвацца ў Кастраму, дзе апалчэнцы ўзялі ў аблогу ў Іпацеўскім манастыры гарнізон. У 3-дзённым баі літвіны разгромілі паволжскіх апалчэнцаў, забілі іх кіраўніцтва, але 28 ліпеня не здолелі захапіць варожы флот, каб пераправіцца праз Волгу ў Кастраму. Калі яны адступілі ў накірунку Троіцы, Іпац'еўскі манастыр здаўся апалчэнцам[57].

---

[55] И.О. Тюменцев, *Смута в России*…, op. cit., с. 411–414, 448.

[56] *Из дневника И. Будиллы* [w:] *Памятники смутного времени*, Москва 2001, с. 177–178; И.О. Тюменцев, *Смута в России*…, op. cit., с. 414–416.

[57] И.О. Тюменцев, *Смута в России*…, op. cit., с. 418, 444.

Перамога Я.П. Сапегі над войскамі Шуйскіх пад Рахманцавым восенню 1608 г. і дамова В. Шуйскага аб здачы шведам Карэліі, зрабілі магчымым рух на поўнач для войска Самазванца. Полк Яна Кернажыцкага ў сярэдзіне лістапада 1608 г. разграміў сілы Міхаіла Скопін Шуйскага і заблакаваў Ноўгарад да вясны 1609 г. Яго полк складалі 2000 нізавых казакоў палкоўніка Грыца і каля 6000 расійскіх тушыцаў з Пскова і „літоўскай украіны". У лютым 1609 г. атрад Мікалая Касакоўскага зрабіў рэйд на Усцюжну Жэлезнапольскую[58]. Вычарпанне мясцовых рэсурсаў і тое, што Я.П. Сапега і Я. Кернажыцкі паверылі дэзінфармацыі царскай прапагнады аб падыходзе да Ноўгарад 15000 шведскіх падмацаванняў да М. Скопін Шуйскага, спрычыніліся для пачатку стратээгічнага адступлення. У рэчаіснасці шведскіх наймітаў прыйшло 3000 вершнікаў і 2000 пяхоты да якіх далучылася тысяча мясцовых прыхільнікаў Шуйскіх[59].

Пачынючы вайсковую кампанію ў Маскоўскай дзяржаве шведы разлічвалі акупаваць Наўгарод і Пскоў, а прынамсі іх прыбалтыйскія воласці. Каб гэты план не стаў рэчаіснаццю адразу пасля прыхода шведскага арміі, М. Скопін Шуйскаму прышлося выплаціць наймітам Я. Дэлагардзі аванс за будучы паход і перадаць Швецыі Карэлу. Толькі пасля гэтага ў траўні 1609 г. саюзнікі вырушылі ў паход на Маскву. На чуткі аб пачатку выправы шведаў і скопінцаў адбыліся гарадскія перавароты ў Таржку, Тарапцу, Ржэве, Холму, Белай, Старай Русе. Скопінцы пад Цверру разбілі каля 500 наймітаў, падмацаваных запарожцамі, на чале са Станіславам Панятоўскім[60]. Масавыя сутыкненні адбыліся ў Пскове, але праскопінскіх паўстанцаў удалося апанаваць, пасля чаго пскавічы адбілі наўгародцаў і шведаў ад горада. Пачаткам агульных поспехаў наўгародцаў – скопінцаў стала тое, што перадавы атрад саюзных ім

[58] А.А. Селин, *Смута на Северо-Западе в начале XVI века: очерки из жизни новгородского общества,* СПб, 2017, с. 360.

[59] И.О. Тюменцев, *Смута в России*…, op. cit., с. 247–248, 391.

[60] *Памятники смутного времени*…, op. cit., с. 385.

шведаў Э. Горна, знянацку застаў п'яных казакоў у вёсцы Каменцы і іх разграміў. Я. Кернажыцкі адышоў са Старай Русы да Ржэва з 30 таварышамі[61]. Войскі, якія складаліся з наўгародцаў, шведаў і найміта Міхайла Скопін Шуйскага, дагнала і разбіла групу адступаючых пад Тарапцом 15 траўня 1609 г.

У Троіцкім і Тушынскім лагерах пачалася канцэнтрацыя сіл на рашаючыя дзеянні, якія суправаджаліся адпраўкай нарабаванай „рухлядзі" ў Літву. З вялікімі цяжкасцямі на поўнач з Тушына ўдалося выправіць 1500 ваяроў А. Збароўскага і баярына І. Шахоўскага. Самі тушынцы няўдала паспрабавалі штурмаваць Маскву 5 чэрвеня. „Царык" выклікаў Я.П. Сапегу сабе на дапамогу, але апошні вырашыў сваімі сіламі штурмаваць Троіцу. Тым часам, кавалерысцкія палкі С. Панятоўскага, А. Збароўскага і Я. Мікулінскага з Угліча, 2000 вершнікаў з Рэчы Паспалітай і 1000 рускіх тушынцаў выправілася на падтрымку Я. Кернажыцкага на Таржок. У чэрвені 1609 г. пад булавой Я.П. Сапегі было каля 3000 наймітаў і 5000 сялян-тушынцаў. 28–29 чэрвеня 1609 г. ён паспрабаваў правесці штурм Троіца Сергееўскага манастыра, але большасць сялян паўцякала са штурмавых калон і абозу. Пасля чарговай няўдачы, частку сваіх войскаў Я.П. Сапега павёў на Цвер, але на бітву не паспеў. Гэтыя падмацаванні, якая злучыліся з сіламі Я. Кернажыцкага, дазволілі сабраць каля 2000 гусар і 6000 запарожскіх казакоў[62].

17 чэрвеня 1609 г. адбылася бітва пад Таржком. Апалчэнцы М. Скопін Шуйскага апёрліся на нямецкіх кнехтаў і горадскія ўмацаванні, якіх рыцарская кавалерыя „літоўскія людзі" А. Збароўскага[63] не сталі штурмаваць. Пасля паспяховых атак на розных участках бітвы камандаванне загадала адыходзіць у Цвер і запрасіла новага падмацавання з Тушына. Ідучы на канцэнтрацыю 27 чэрвеня Я.

---

[61] И.О. Тюменцев, *Смута в России*..., op. cit., с. 437–439.

[62] И.О. Тюменцев, *Оборона Троице – Сергиева*..., op. cit., с. 47–48; И.О. Тюменцев, *Смута в России*..., op. cit., с. 441–442.

[63] *Памятники смутного времени*,..., op. cit., с. 394–396.

Мікулінскі перамог апалчэнцаў пад Гарадцом, аднак дазнаўшыся аб паразе пад Таржком, адыйшоў да Калязіна[64].

У Цверы адбылася канцэнтрацыя паўночных сілаў Ілжэдзмітрыя II. З Тушына прывялі роты паны Хруслінскі, Цаглінскі, Бялінскі, Карытка, Павала і Я. Тышкевіч, з Троіцы – М. Вілямоўскі, з Яраслаўля – А. Ружынскі. Разам было каля 4000 ваяроў. 11 чэрвеня адбылася бітва пад Цверу. Пасля зацятай сечы гусары апракінулі нанятую шведамі кавалерыю і прагналі апалчэнцаў з поля. Пасля чаго пераможцы зайшлі ў Цвер на адпачынак[65]. Скопінцы нечаканым начным ударам 13 чэрвеня 1609 г. выбілі тушынцаў з пасадаў Цвяры.

Развіваючы поспех у пасадзе, войскі Шуйскіх і найміты чатыры разы няўдала штурмавалі цвярскія ўмацаванні – „осыпь", дзе сядзеў гарнізон на чале з „панам Красоўскім і літоўскім людам". Страты, якія штурмуючыя панеслі ў Цверы, так уразілі нямеціх наймітаў, што яшчэ ў лютым 1610 г. яны адмовіліся ісці на прыступ Дзмітрава, які абаранялі сапежынцы. Так ці інакш, пасля перамогі пад Цверам, шведскія найміты запатрабавалі аплаты, а паколькі ў М. Скопін Шуйскага грошай не было, большасць французаў і немцаў вырушыла дадому. Я. Дэлагадзі затрымаў пры сабе толькі каля 2000 жаўнераў[66].

Сканцэнтраваўшыся пад Троіцка Сергіеўскім манастыром, А. Збароўскі, Я.П. Сапега, Касцінецкі, М. Вілямоўскі, Б. Ланцкронскі і рускія тушынцы, ноччу 29 ліпеня 1609 г. трэці раз няўдала штурмавалі манастыр. Аднак 28 жніўня ротмістр Сума ўдалай атакай пад Суздалем спыніў паспяховы дагэтуль марш ніжагародскага апалчэння на Маскву. Калі ў верасні 1609 г. узнавіўся рух М. Скопін Шуйскага да Волгі, супраць яго з пад Троіцы выйшаў гетман Я.П. Сапега, А. Лісоўскі, А. Збароўскі, Б. Ланцкронскі[67].

---

[64] *Ibidem,* с. 180, И.О. Тюменцев, *Смута в России…*, op. cit., с. 443.

[65] И.О. Тюменцев, *Смута в России…*, op. cit., с. 445.

[66] *Памятники смутного времени,…*, op. cit., с. 397; *Дневники Я.П. Сапеги,…*, op. cit., с. 186; И.О. Тюменцев, *Смута в России…*, op. cit., с. 447.

[67] И.О. Тюменцев, *Смута в России…*, op. cit., с. 451.

Сітуацыя наймітаў-грамадзян Рэчы Паспалітай на службе Ілжэзмітрыя II змяняецца з уступлення ВКЛ і Польскай кароны ў міждзяржаўную вайну з Вялікім княствам Маскоўскім. Пасля канчатковага спынення рокашу на Варшаўскім вальным сойме1609 г. у Жыгімонта Вазы вызваліліся рукі. Аднак сенатары з ВКЛ, на чале з Хадкевічамі і Радзівіламі, запратэставалі супраць непадрыхтаванага нападу і заблакавалі разгляд пытання аб пачатку вайны з Масквой. Л. Сапега выказаўся на сойме за вайну, але, адначасова, адмоўна выказаўся наконт намераў караля ў лістах да Радзівілаў. У выніку вальны сойм 1609 г. скіраваў ухваленыя падаткі на выплату войскам у Інфлянтах, іх канфедэрацыям і прадухіленню іншых небяспекаў[68]. Тым не менш, ужо вясной 1609 г. стомленыя рабаўніцтвамі сваіх уладанняў войскамі канфедэратаў і добраахвотнікаў, якія ішлі на ўсход, сенатары ВКЛ змянілі свой ранейшы антываенны настрой. Літоўскія сенатары прапанавалі каралю вывесці жаўнераў ці ў Інфлянты, ці пад Пскоў і Вялікія Лукі[69].

Да жніўня 1609 г. кароль спрабаваў пераадолець унутрыпалітычны супраціў магнатаў ВКЛ і толькі пасля поспехаў войска ВКЛ у Інфлянтах зімой – летам 1609 г., абвесціў аб пачатку паходу на Смаленск. Гэта было зроблена без афіцыйнага дазволу вальнага сойму і сенату Рэчы Паспалітай, што з'яўлалася парушэннем права. Вырашальную ролю ў прыспешванні нападу на Смаленск, адыгралі Л. Сапега і А. Гасеўскі, якія пераканалі караля, што горад адразу здасца. Роты выстаўленыя Сапегамі з'явіліся пад мурамі Смаленска ў сярэдзіне верасня 1609 г. Праз некалькі тыдняў з каралём падышлі сілы іншых магнатаў ВКЛ і Каронны[70]. Войскі Жыгімонта Вазы не мелі сур'езнай артылерыі і не былі падрыхтаваны да штурмавых прац, а таму завязлі пад Смаленскам да 3 чэрвеня 1611 г.

Першай аперацыяй сапежынцаў, на якую паўплывала зборы караля пад Смаленск, сталі падзеі пад Калязінам. 14 жніўня 1609 г.

---

[68] А. Дземідовіч, *Вялікае Княства Літоўскае*..., op. cit., с. 61.

[69] APW, AS, №51.

[70] BCzart, sign. 104, №216.

роты Будзілы, Чаплінскага, Тышкевіча і Каліноўскага занялі Рабаў манастыр і заблакавалі пераправу М. Скопін Шуйскага і шведаў праз Волгу. 18 жніўня яны загналі ў палявы лагер, адрэзалі ад Волгі частку скопінцаў і нямецкіх наймітаў, але штурмаваць Калязінскія ўмацаванні не сталі. Калі да рыцарства вярнуліся з Тушына паслы і распавялі, што Жыгімонт Ваза плануе наступ з Вільні на Смаленск, найманае рыцарства, баючыся, што „царок" уцячэ і ім не заплоціць ня скончыўшы аблогу, зняліся з лагера і паехалі да Я.П. Сапегі пад Троіцу[71].

Лінія абароны тушынцаў значна аслабла. Каб паспець хутчэй за канкурэнтаў да Тушына, у Пераяслаўлі ад асноўных сілаў Я.П. Сапегі канчаткова аддзяліліся палкі караняжаў А. Збароўскага, Ланцкронскага і Касцянецкага. Маючы досвед марнавання перамог канфедэрацыямі інфлянцкага войска ВКЛ і разумеючы, што грошай у Самазванца няма, гетман абвесціў агульны збор усіх сваіх войскаў у лагеры каля Троіцы. З Растова былі выкліканы гусары Я. Мікулінскага, на замену якім накіраваліся 2000 казакоў А. Лісоўскага. Каля тысячы рускіх тушынцаў складалі гарнізон Пераяслаўля Залескага, на падтрымку якога вырушылі гусары Стэцкевіча і казакі Церлікоўскага. Э. Стравінскаму яшчэ ўдалося разграміць рэйд скопінцаў пад Дзмітравам, але 8 верасня адбылося паўстанне ў Пераяслаўлі Залескім і 4 роты гарнізона горада былі знішчаны. Асноўныя сілы М. Скопін Шуйскага атабараліся ў Пераяслаўлі і Аляксандравай слабадзе. Праз некалькі тыдняў А. Лісоўскі паспрабаваў адбіць горад. Пацярпеўшы няўдачу, лісоўчыкі зняліся з базы ў Растове і вярнуўся ў Суздаль. Пасля іх прыхода, Я. Стравінскі паспяхова прарваўся з Суздаля да Троіцы[72].

Наймиты ў Тушынскім лагеры склалі канфедэрацыю, якой Ілжэдмітры II паабяцаў перадаць Северскую і Разанскую зямлю

[71] *Памятники смутного времени…*, op. cit., с. 180–181; И.О. Тюменцев, *Смута в России…*, op. cit., с. 453.

[72] И.О. Тюменцев, *Смута в России…*, op. cit., с. 454 – 455.

ў якасці кампенсацыі іх заробку і страт. Аб новай канфедэрацыі Я.П. Сапега даведаўся ад паслоў 27 верасня 1609 г. у сваім лагеры. Аднак замест таго, каб далучыцца для пабрацімаў, ён пачаў сепаратныя перамовы з Жыгімонтам Вазам і Л. Сапегам аб прызнанні імі даўгоў па аплаце, якія ён нарабіў на службе Ілжэдзмітрыю II. Казакі Веляглоўскага і Кернажыцкага, якія кватараваліся ў Вязьме, абвесцілі аб далучэнні да войскаў Рэчы Паспалітай.

Працягваючы змаганне за Самазванца і ўзнагароды, 11 кастрычніка тушынскія канфедэраты правялі начны штурм Масквы, але прарвацца ў горад ня здолелі. Апошнім буйным поспехам тушынцаў у кастрычніку 1609 г. стала авалоданне Іосіфа Валкаламскім манастыром. Каб пазбегнуць кары за супраціўленне, капітулючыя адчынілі брамы не П. Руцкому, а Р. Ружынскаму. Развіваючы поспех, тушынскі гетман узяў з сабой каля 2000 палякаў і 18 кастрычніка 1609 г. прыйшоў на дапамогу Я.П. Сапегу пад Троіцу. Аднак два дні раней, нечаканым ударам абоз скопінцаў прарваўся праз аблогу ў Троіцкі манастыр. Далейшая аблога стала бяссэнсоўнай. Да таго ж сустрэўшыся, два гетманы не паладзілі. У выніку, на бітву з М. Скопін Шуйскім пад Аляксандраву Слабаду выйшлі караняжы і тушынскія расіяне, падмацаваныя толькі некалькімі ротамі літвінаў. Ім удалося пад сялом Корына знішчыць перадавыя часткі апалчэнцаў, але ў баях 19–24 кастрычніка 1609 г. шведы і скопінцы схаваліся за ўмацаваннямі і не выходзілі біцца ў полі. Штурмаваць бастыёны і засекі без артылерыі атакуючым каштавала шмат крыві. Калі пачаліся маразы, Р. Ружынскі адступіў да Троіцы, а потым – у Тушына[73]. 26 кастрычніка 1609 г. А. Млоцкі разграміў канвой з харчаваннем і зноў пачаў аблогу Каломну.

Пасля прыхода ружынцаў у Тушына туды ж прыбыла пасольства ад Жыгімонта Вазы. Кіраўніцтва Рэчы Паспалітай ніколі не прызнавала Ілжэдзмітра II царом і, спрабуючы звабіць сваіх суайчыннікаў да сябе пад Смаленск, Жыгімонт Ваза тым не менш,

[73] Ibidem, c. 456–461.

не хацеў прызнаць яго даўгі. 10 снежня 1609 г. паслы ад караля абвінавацілі тушынскіх наймітаў у правакацыі вайны Рэчы Паспалітай са Швецыяй і Масквой, што магло пагражаць пазбаўленнем іх шляхецтва і баніцыяй. Дзякуючы А. Млоцкаму, які пабіўся на шаблях з папярэднім паслом тушынцаў да караля, на павестцы агульнага сходу стала ідэя сапежанцаў аб выплаце каралем кампенсацыі службы на „царка" за кошт акупацыі імі Смаленшчыны і Севершчыны, але ўжо ад імя Жыгімонта Вазы. Каралеўскія паслы, аднак, не пагадзіліся з прапановамі жаўнерскага кола і пачалі персанальныя перамовы з камандзірамі баяздольных частак аб пераходзе на дзяржаўную службу. Публічныя перамовы, якія суправаджаліся дэманстратыўнай пагардай і пагрозамі Самазванцу, прывялі да спробы ўцёку „царыка" з Тушына. Найміты яго аднак злавілі і пасадзілі пад арышт.

Уцячы ў Калугу з-пад аховы Ілжэдзмітрыю II ўдалося пры дапамозе расейскіх тушынцаў толькі 27 снежня 1609 г. Цяпер Самазванец стаў патрыётам, пачаў барацьбу супраць замежнікаў і здраднікаў. Ужо 3 студзеня 1610 г. расіяне, верныя Ілжэдзмітрыю II, напалі і разбілі атрад А. Млоцкага. Тады ж Ф. Тышкевіч пачаў перамовы з Самазванцам, а Я. Кернажыцкі ўвеў сваіх запарожскіх казакоў у Калугу. Частка тушынскіх баяр вярнулася ў Маскву да Шуйскіх дзе абвесціла, што „літва збіраецца на пабег" з Тушына[74].

Адступленне сапежынцаў восенню 1609 г. не азначала руху М. Скопін Шуйскага наперад. Я. Дэлагардзі, выконваючы загады шведскага караля настойваў на тым, каб новая партыя наймітаў далучылася да манарха толькі пасля рэальнай перадачы Швецыі Івангарада і іншых замкаў, паколькі расійскі гарнізон Карэлы адмовіўся разглядаць здачу апошнім і нават не запусціў паслоў ад М. Скопін Шуйскага ў горад. Разгром рэгулярнай шведскай арміі ў Інфлянтах Я.К. Хадкевічам у верасні 1609 г і набліжэння войскаў Рэчы Паспалітай да Смаленска прымусілі Карла IX пагадзіцца накіра-

[74] Ibidem, c. 467–471.

ваць Шуйскім у Аляксандраву Слабаду 4000 еўрапейскіх наймітаў. Толькі атрымаўшы падмацаванне на пачатку студзеня 1610 г. войскі М. Скопін Шуйскага з 50000 рускіх апалчэнцаў, 1330 шведскімі кавалерыстамі і 900 пехурамі падышлі пад Троіцу. Пасля ўпартых баёў з 12 па 27 студзеня і спробаў выцягнуць ворага на бітву ў поле, Я.П. Сапега быў вымушаны адступаць у Дзімітраў. Калі 19 лютага 1610 г. пад горад падышлі асноўныя сілы Шуйскіх, 400 сапежынцаў і тысяча казакоў пайшлі ў атаку. Пасля боя расіяне адступілі да Троіцы, але і сапежынцы, спаліўшы ўмацаванні Дзмітрава, вырушылі праз Ржэў на Тушына. Ранняй вясной 1610 г. А. Лісоўскі выправіўся з Суздаля праз Цвер і Вялікія Лукі на Пскоў. Па дарозе лісоўчыкі спалілі Растоў і Калязін манастыр[75].

Уцёкі „царка" прымусілі Я.П. Сапегу і Р. Ружынскага пагадзіцца на далучэнне да войска Жыгімонта Вазы і збірацца да Смаленска. У лютым 1610 г. М. Мінішак і большасць тушынцаў прызнала царом Уладзіслава, але Ф. Тышкевіч прывез у Тушына ліст ад Ілжэдзмітрыя II, у якім апошні абвінаваціў Р. Ружынскага, П. Руцкога і іншых у здрадзе і паабяцаў разлічыцца за старыя даўгі і новы наём, калі жаўнеры прывядуць да „цара" яго „жонку". Я. Тышкевіч зрабіў спробу скінуць уладу Р. Ружынскага. Паміж двума партыямі тушынцаў на вайсковым коле адбылася бойка. Жаўнеры здолелі своечасова спыніцца і дачакацца вяртання паслоў ад караля, аднак калі апошнія чарговы раз не прывезлі грошы, 6–8 сакавіка 1610 г. войскі пакінула і спалілі Тушынскі лагер. 12 сакавіка 1610 г. скопінцы і шведы увайшлі ў Маскву.

Роты А. Збароўскага, А. Млоцкага, М. Велямоўскага і некаторыя іншыя перайшлі адразу на службу караля. Астатнія, горш узброеныя роты, увесну 1610 г. вагаліся. Раман Ружынскі з большасццю тушынцаў скацэнтраваўся ў Іосіфа Валакаламскім манастыры, дзе памёр у выніку атрыманых ран. 11 траўня 1610 г. пад манастыр падышлі аб'яднаныя сілы шведаў і Шуйскіх. У дадзенай сітуацыі

[75] *Szwedzkie wojny 1611–1632*, Oświęcim 2015, s. 30.

былыя тушынцы пад кіраўніцтвам Паўла Руцкога вырашылі адступаць на злучэнне з каралём. Аднак яны трапілі ў засаду і былі разбіты. У палон патрапілі Г. Тупальскі, Філарэт і А. Ружынскі. Самому П. Руцкаму ўдалося вырвацца.

Узімку 1610 г. калужскай стаўцы Ілжэдзмітрыя II працягвалі падначальвацца Пскоў, Вялікія Лукі, Арзамас, Астрахань, Севершчына і прыбалтыйскія гарады. Яго войска са студзеня 1610 г. узначалілі Г. Шахоўскі і Я. Кернажыцкі. Незабаве, у Калугу падышлі роты Хруслінскага, Янікоўскага, а роты Быхаўца і Каменскага, перадалі Самазванцу Валакаламск, а самі адышлі ў Медынь і Прудкі, дзе была абвешчана месца збору для іншых наймітаў. 3 красавіка 1610 г. палкоўнік ВКЛ А. Гасеўскі захапіў Белую, запарожцы і кіяне прымусілі жыхароў Чарнігава і Севершчыны цалаваць крыж каралевічу Уладзіславу Вазе.

У гэты ж час тушынскі ваявода Ф. Пляшчэеў, сабраўшы 6000 пскавічоў і жыхароў гарадоў „літоўскай украіны", няўдала паспрабаваў адбіць у шведаў Вялікі Ноўгарад. Прыйшоўшы на Пскоўшчыну А. Лісоўскі звабіў да сябе 700 ірландскіх і англійскіх наймітаў і дапамог пскавічам адбіцца ад шведскіх нападаў з Нарвы, зрабіўшы паспяховы рэйд разам з вялікалуцкімі казакамі пад Івангарад. Аднак у рэшце рэшт шляхі А. Лісоўскага і тушынцаў канчаткова разышліся. Калі пераможцы вярталіся назад, пскавічы адмовілі ім пастоя ў горадзе. Раззлаваныя лісоўчыкі перабазаваліся ў Краснае, Завалочча і Вароніч – на паўночным памежжы ВКЛ. Расійскія казакі з палка А. Лісоўскага перайшлі на бок царскага ваяводы Г. Валуева і дапамаглі яму выразаць тушынцаў у Вялікіх Луках[76]. У 1610–1611 гг. лісоўчыкі рабілі глыбокія рэйды на Пскоўшчыну і Навагародчыну рабуючы і спыняючы канкурэнтаў. Вальны сойм 1611 г. зняў баніцыю з А. Лісоўскага і афіцыйна наняў

[76] *Памятники смутного времени…,* op. cit., с. 223; И.О. Тюменцев, *Смута в России,* op. cit., с. 472–494.

яго на службу[77]. 11 лютага 1612 г. яго „літоўскія і польскія людзі" спалілі Старую Русу[78]. Пачынаючы з 1612 г. манарх адсылаў татар ВКЛ пад яго каманду[79] і ў 1613 г. афіцыйна лічыў Завалочча далучаным да ВКЛ[80].

23 чэрвеня пяхота выбіла царскія войскі з грэбляў і забяспечала пераход асноўных сіл Рэчы паспалітай да Царова Займішча[81]. 24 чэрвеня/4 ліпеня 1610 г. прыняўшы у свае шэрагі 1500 збароўцаў войска С. Жалкеўскага пад Клушынам ушчэнт разграміла царскую армію. Большасць войска пераможцаў пад Клушынам складалі караняжы, але вельмі важную ролю ў бітве адыграў полк былых тушынцаў А. Збароўскага і Людвіга Панятоўскага з ротамі Я. Скуміна Тышкевіча і А. Гасеўскага[82]. Разлік з гэтымі ротамі, як і з інфлянцкімі і смаленскай залогай у 1613 г. быў даручаны скарбу ВКЛ. Гэта сведчыць аб тым, што ў яго складзе пераважна былі прадстаўнікі ВКЛ[83]. Войскам Жыгімонта Вазы здаліся Цвер, Бароўск, Осіпаў і шэраг іншых[84].

Тым часам прамарнаваўшы паўгады ў перамовах з Жыгімонтам Вазам і не атрымаўшы задавальнення сваіх патрабаванняў ад Рэчы Паспалітай, Я.П. Сапега, 6 чэрвеня прывеў Ілжэдзмітрыю II тысячу сваіх ваяроў, заняўшы Угру. 15 чэрвеня 1610 г. на агульным вайсковым коле былых расійскіх тушынцаў, сапежынцаў і казакоў Я.П. Сапега быў абраны гетманам усяго войска Самазванца. Грошай выплаціць нават аванс за службу Ілжэдзмітры II ня меў, але 24 чэрвеня прыбыў у вайсковы лагер на Угры. Калі звесткі аб клушынскім разгроме пацвердзіліся і былыя тушынскія баяры на

---

[77] Volumina Legum, T. III, 1860, s. 25.

[78] А.А. Селин, *Смута на Северо-Западе,* op.cit., с.157.

[79] НГАБ, КМФ – 18. Воп. – 1, спр. 293, арк. 66 аб., 67, 106, 108 аб.

[80] Ibidem, арк. 220.

[81] ЛННБУіВС., Ф.103. Воп. IV – спр. 569 арк. 8–9.

[82] T. Bohun, *Moskwa 1612,* Warszawa 2005, с. 33–35.

[83] Volumina legum t. III, 1860, с. 114.

[84] Lietuvos Mokslu Akademijos Vrublevskiu Biblioteka (LMAVB), f. 9–431, арк. 143.

чале з Філарэтам паабяцалі дапамагчы з уваходам у Маскву, войскі Самазванца рушыла ў паход. Асноўнай баявой сілай і афіцэрскага корпуса зноў былі найміты з ВКЛ: полк Я.П. Сапегі – 100 гусар, 600 пяцігорцаў, 300 казакаў; В. Будзілы – 200 гусар, 600 пяцігорцаў, 400 казакоў; С. Тышкевіча – 200 гусар, 600 пяцігорцаў, 100 казакоў; А. Хруслінскага 200 гусар, 600 пяцігорцаў, 200 казакоў, а так сама роты Стравінскага, Камянецкага, Таляфуса, два палкі запарожцаў Друшлака і Касцінецкага. Казацтва і расійскія баярскія сілы самазванца складалі большасць, але не вызначаліся якасцю. Разам набіралася каля 5000 войска[85].

На шляху да Масквы 5 ліпеня 1610 г. войскі Самазванца ўзялі і разрабавалі Бароўскі Пануфрыеўскі кляштар, перабіўшы ўсіх абаронцаў. Пасля перамогі, Я.П. Сапега 5-дзённымі манеўрамі прымусіў адысці ад Масквы войскі паўднёварасійскіх баяр і крымскіх татар, якія ішлі на дапамогу Шуйскім, а таксама пазбегнуў сутычкі з войскамі С. Жалкеўскага. 17 ліпеня 1610 г. цар Васіль Шуйскі быў злажоны з пасада. Але 23 ліпеня насуперак чаканням, масквічы адмовіліся цалаваць крыж Ілжэдзмітрыю II, а яго паслу Лазоўскаму і ваярам прапанавалі „перастаць вараваць і вяртацца ў Літву". Паміж тушынцамі і масквічамі працягнуліся баі. Папярэджваючы перамовы сапежынцаў з маскоўскім баярствам, Самазванец напісаў ліст Я.П. Сапегу з абяцанямі прызнаць сябе васалам Жыгімонта Вазы, выплаціць 200 і 100 000 злотых Рэчы Паспалітай і Уладзіславу Вазе адпаведна. Больш таго, ён паабяцаў за свой кошт заваяваць Лівонію для Рэчы Паспалітай выдаць 15 000 ваяроў для далейшай экспедыцыі Вазаў на Швецыю. Я.П. Сапега склаў на падмурку гэтых умоў кандыцыі, якія войска запрысяжыла пры стварэнні новай канфедэрацыі, у якой паабяцала не пакідаць Самазванца[86].

Яшчэ ў студзені 1607 г. пасол ад бояраў Валконскі патаемна ад

[85] И.О. Тюменцев, *Смута в России*, op. cit., с. 496–498; *Дневники Я.П. Сапеги*, op. cit., с. 204.

[86] *Дневники Я.П. Сапеги*…, op. cit., с. 210; Тюменцев И.О., *Смута в России*…, op. cit., с. 501–503.

В. Шуйскага прапанаваў царскую шапку каралевічу Уладыславу Вазе, а ўлетку 1608 г. прапанова паўтарылася[87]. 22 ліпеня 1610 г. з іншага боку ад Тушына, да Масквы падыйшоў С. Жалкеўскі. Аднак наймітам Я.П. Сапегі залежала, каб царом стаў Ілжэдзмітры. Паміж гетманамі каралеўскага і самазванскага войска пачаліся перамовы. С. Жалкеўскі абвесціў аб нежаданні выбіваць сапежынскае рыцарства з занятых ім гарадоў, пагадзіўся прызнаць васалітэт Самазванца ад караля і папрасіць для войска грошы. Пасля дамовы гетманаў караняжы маглі займаць па правізію землі на поўнач, а сапежынцы на поўдзень ад Масквы.

31 ліпеня жаўнеры маскоўскага гарнізона зрабілі ўдалую вылазку на лагер сапежынцаў. 2 жніўня 1610 г. войскі Ілжэдзмітрыя II ударылі двума калоннамі на Маскву. Галоўнай атакай – на Серпухаўскую браму кіраваў В. Будзіла. Але расійскія ваяводы ў стане С. Жалкеўскага, насуперак ранейшых дамоваў і забароны гетмана, ўдарылі ў спіну сапежынцам і дапамаглі масквічам адкінуць апошніх ад сталіцы. С. Жалкеўскі папрасіў прабачэння і яшчэ раз заверыў, што ня мае ніякіх кепскіх намераў супраць шляхецкай браці. Аднак трохбаковае супрацьстаянне працягвалася. У боі пад горадам 11 жніўня, у якім масквічы паранілі Януша Скумін Тышкевіча, каралеўскае войска не ўдзельнічала, але стаяла ў баявым шыхце[88]. 17 жніўня 1610 г. масквічы афіцыйна абвесцілі царом Уладзіслава Вазу[89].

Адначасова баяры дамовіліся з Я.П. Сапегам аб перамір'і, а назаўтра, вечарам іншаму войску – С. Жалкеўскага, дазволілі прайсці праз Маскву, каб разагнаць Тушынскі лагер. 26 жніўня 1610 г. С. Жалкеўскі вывеў сваё і маскоўскае войска ў поле перад Тушынам. Я.П. Сапега пашыхтаваўся да бою. Каб пазбегнуць крывапраліцця,

---

[87] Тюменцев И.О., *Смута в России*..., op. cit., с. 283.

[88] *Дневники Я.П. Сапеги*..., op. cit., с. 218; Тюменцев И.О., *Смута в России*..., op. cit., с. 503–504.

[89] *Dyaryusz poselstwa moskiewskiego wysłanego do Warszawy z końcem r. 1611* [w:] Hirschberg A., *Polska a Moskwa w pierwszej połowie weku XVII*, Lwów, 1901. S. 379.

вялікі каронны гетман і гетман войска Самазванца, з'ехаліся перад войскам і пачалі перамовы. Потым да іх пад'ехалі А. Гасеўскі, вялікі маршалак ВКЛ М.К. Дарагастайскі і іншыя палкоўнікі абодвух войскаў. Пагадненне паміж гетманамі было дасягнута. Бітвы не адбылося, а С. Жалкеўскі праз паслоў – літвіна Быхаўца і караняжа Пабядзінскага прапанаваў Ілжэдзмітрыю II прызнаць царскую ўладу Уладзіслава і атрымаць сабе на выбар Самбор ці Гародню. Вечарам жаўнеры азнаёмілі „царэвіча" з вынікам перамоў, але апошні адмовіўся іх разглядаць. Ноччу 27 жніўня кароннае войска пайшло на Нікольскі манастыр, дзе знаходзіўся Самазванец, які ўцек у Калугу. Я.П. Сапега прышоў з двума палкамі на выручку свайму „цару", але яго сустрэў ужо В. Валеўскі. Гетман-літвін застаўся старэйшым па статусе ў табарах Самазванца і маскоўскія баяры афіцыйна звярнуліся да яго, каб ён не перашкаджаў пераходу расіянаў на бок цара Уладзіслава і баярскага ўраду. 6 верасня 1610 г. адбылася прысяга новаму цару[90]. Восенню Ноўгарад і Арэшак таксама прысягнулі каралевічу[91].

Жадаючы выпіхнуць былых тушынцаў з-пад сталіцы, масквічы працягнулі дыверсіі супраць сапежынцаў. Іх рух атрымаў назву „шышоў". Ужо 9 верасня вылазка шышоў скончылася сапраўдным боем, у якім сапежынцы забілі каля 200 нападаўшых, а астатніх загналі назад у Маскву[92]. Назаўтра пасля боя, да сапежынцаў вярнуўся пасол пад Смаленск з адмовай караля пацвердзіць абяцанні С. Жалкеўскага. Гнеў жаўнераў удалося перанакіраваць, калі С. Жалкеўскі здолеў выціснуць з разанскіх баяр 10000 рублеў выкупа, каб вывесці сапежынцаў з-пад Масквы і накіраваць на пастой не да іх, а ў Масальск. Перадыслакаваўшыся, сапежынцы заблакавалі рух Самазванца з Калугі.

---

[90] *Дневники Я.П. Сапеги*…, op. cit., с. 226–228; И.О. Тюменцев, *Смута в России*…, op. cit., с. 507–510.

[91] А.А. Селин, *Смута на Северо-Западе в начале XVI века: очерки из жизни новгородского общества,* СПб, 2017, с.262.

[92] *Дневники Я.П. Сапеги*…, op. cit., с. 231.

Гарнізон Масквы на гэты момант складалі ў асноўным прадстаўнікі Польскага каралеўства, пераможцы з-пад Клушына і атрады маскоўскіх баяр. Жолд ім павінны быў выплочвацца з маскоўскага скарбу, які аднак быў пусты і харчавання таксама не хапала. Жыгімонт Ваза працягваў адмаўляцца браць на дзяржаву чужыя выдаткі, але калі вайсковыя канфедэраты з Інфлянтаў і вэтэраны з Масквы вярнуліся ў межы ВКЛ, пад ціскам соймікаў манарх прызнаў такую магчымасць. У выніку канфлікта, які пачаўся паміж каралём і С. Жалкеўскім, каронны гетман у канцы кастрычніка 1610 г. з'ехаў з Крамля з царскай казной і большай часткай караняжаў. Яшчэ перад ад'ездам па яго згодзе з баярамі, „старастам" Масквы і кіраўніком 5000 найманага гарнізона стаў А. Гасеўскі.

Я.П. Сапега зноў стаў самым аўтарытэтным лідарам замежнага рыцарства. Ён перабазаваўся на Севершчыну ў пачатку кастрычніка 1610 г. займаўся зборам і падвозам правізіі для залогі Масквы. Са згоды Сямібаяршчыны ім і іншым ротам з Рэчы Паспалітай былі распісаны прыстаўствы на тэрыторыі Маскоўскай дзяржавы. Бароўскі ўезд дастаўся Э. Стравінскаму, Суздаль і Кастрама – роце Я. Парыцкага[93], у якой служыў літвін Самуэль Маскевіч. У снежні 1610 г. Жыгімонт Ваза нарэшце пагадзіўся прыняць сапежынцаў на службу Рэчы Паспалітай і паабяцаў разлічыцца па запазычанасцях Самазванца[94].

На канец восені ў Калузе ў „цара Дзмітрыі" сабралося 3000 расіян, 500 татар і 1000 наймітаў. Новым гетманам у яго стаў В. Валеўскі. Я. Кернажыцкі быў накіраваны ў паслом у Астрахань. У пачатку студзеня 1611 г. татары Пятра Урусава разбілі роту сапежынцаў Чаплінскага. 10 студзеня 1611 г. падчас балю ў гонар гэтай перамогі П. Урусаў забіў Самазванца. Сапежынцы і казакі пайшлі ў наступ на раней верныя Самазванцу гарадкі Севершчыны.

---

[93] S. Uruski, *Rodzina. Herbarz szlachty polskiej,* t. XIV, Warszawa 1917, s. 267.

[94] И.О. Тюменцев, *Смута в России*..., op. cit., с 506–517.

Прыналежнасць войсковых фармаванняў да пэўнай палітычнай структуры, калі не ўваходзіць у аналіз самасвядомасці кожнага ваяра, вызначаецца паводле таго, якая дзяржава наймала жаўнера на службу, чый афіцэрскі корпус кіраваў аддзеламі, хто забяспечваў армію на полі боя, чый скарб і чыноўнікі ажыццявілі фінальны разлік з жаўнерамі за службу. Фармальна дабраахвотнікі на службе Самазванца былі наймітамі, а значыць іх ідэнтычнасць не павінна была граць ролі. Аднак, падзел на „караняжаў" і „літву" меў месца і паўплываў на ход падзей. Паводле дакументаў эпохі ў этнічным плане палкі ўдзельнікаў Смуты складала мяшанка з „літвы", „палякаў", „нізоўцаў", „масквы", „немцаў", татараў і казакоў з розных рэгіёнаў. Роты лёгкай кавалерыі – лісоўчыкаў і казакоў былі найбольш стракатымі, але „капійнікаў" – гусарыю і пяцігорцаў у большасці выпадкаў складалі прадстаўнікі шляхты Рэчы Паспалітай. Немагчыма высвятліць імёны большасці шэраговых удзельнікаў рот, але ў крыніцах ёсць узгадкі прозвішчаў ротмістраў і таварышчаў. Шляхту часта ставілі кіраваць ротамі іншых народаў і „прасталюдзінаў", як, напрыклад, адбылося з А. Лісоўскім, Я.Кернажыцкім і, мяркуючы па разліку, з А. Гасеўскім і В. Будзілам. Грамадзянства асобных ваяроў – „абывацельства" вызначалася паходжаннем бацькоў і спадчыннай маёмасцю ў пэўным павеце. Шляхецкія карпарацыі ВКЛ і Кароны ахоўвалі асобнасць сваіх структур і манаполію сваіх прадстаўнікоў на размеркаванне рэсурсаў у сваей частцы Рэчы Паспалітай. Пры гэтым абодва войскі Рэчы Паспалітай: ВКЛ і Польскага Каралеўства былі не нацыянальнымі, а прафесійным – караняжы наймаліся і служылі ў найманых ротах арміі ВКЛ, а літвіны – у каронных. Удзел у авантуры Самазванца быў прыватнай інцыятавай за якую заплацілі абедзьве дзяржаўныя структуры Рэчы Паспалітай, падзяліўшы выдаткі паміж сабой.

Падчас баявых дзеянняў у Інфлянтах, а потым у Маскве за 1600–1618 г. жаўнеры і ротмістры змянялі роты, камандзіраў і паднача-

ленне. Найбольшая мешаніна ўтварылася ў 1611 – 1613 г., калі ўдзельнікі баявых дзеянняў у Інфлянтах 1605 – 1611 г., Дзмітрыядзе 1606 – 1611 г. і дзяржаўныя войскі са Смаленска і Масквы 1609–1612 г. вярнуліся па ўзнагароду ўсяго заслужанага ў Рэч Паспалітую. Роты з ВКЛ выстаўлялі рахункі ў першую чаргу сваёй дзяржаве, размяшчаліся на яе землях, але манарх і вальны сойм быў агульны. Паколькі скарб ВКЛ быў хранічна пусты і гадамі не выплочваў ім заробку, жаўнеры ВКЛ стваралі канфедэрацыі, аб'ядноўваліся з караняжамі і з 1607 г. пачалі выбіваць грошы за сваю службу з каралеўскіх уладанняў і скарба не толькі ВКЛ, але і ў Польшчы. Каб справядліва ўлічыць заробак сваіх суграмадзян і ацаніць страты абодвух шляхецкіх карпарацый ад пастояў канфедэратаў вальны сойм 1613 г. прызначыў змешаныя каронна-літоўскія камісіі па разліку з імі[95]. Калі літвіны атрымлівалі разлік у складзе каронных рот, літоўскі скарб павінны быў падвезці грошы ці гасіць выдаткі польскаму і наадварот.

Пасля завязвання войскам „сталічнай"[96] канфедэрацыі на Крамлі пад маршалкоўствам Юзэфа Цэклінскага і ад'езду ў лютым 1612 г. з Масквы каронных рот, разам з імі ў Львоў выправіліся палкі А. Збароўскага, А. Гасеўскага, Я. Парыцкага. Аднак большасць „сапежынскіх" жаўнераў ВКЛ заняла сталовыя эканоміі ВКЛ з цэнтрам у Берасці і вяла перамовы ажно да поўнага разліку з імі 1 лістапада 1613 г.[97] з ўраднікамі ВКЛ[98]. У выніку разлік атрымалі за службу ў Інфлянтах 1605-1609 г., войску Самазванца II і ў смаленска-маскоўскіх кампаніях Жыгімонта Вазы 1609 – 1612 гг. гусарскія роты: дзве „белая" і „чорная" Я.П. Сапегі (з Кароны ім заплацілі 695 і 849/15+100 з ВКЛ 48585 і 46340/15 злотых за кожную адпаведна), Сумы і Глухоўскага (64 злотых з Кароны і 35890 злотых з ВКЛ),

[95] *Volumina legum*, T. III, St. Petersburg 1860, s. 81–82.

[96] LMAVB, f. 17–178, p. 5–6.

[97] BCzart, sign, 2245, №10.

[98] A. Filipczak-Kocur, *Skarbowość Rzeczy Pospolitej 1587–1648. Projekty – ustawy – realizacja,* Warszawa 2006, s. 289.

Тышкевічаў (55+11670/29 з Кароны і 14474/1 злотых з ВКЛ), Чарноцкага (Карона – 336, з ВКЛ – 38844 злотых), Падгарадынскага (Карона – 504/20 ВКЛ-21685/10 злотых), роту Пакірскага цалкам аплаціла ВКЛ, а Дэмбінскага – цалкам Карона. З Кароны большасць грошай заплацілі за роту Каменскага (784+55376/10 і 369/10 з ВКЛ) і большасць выдалі за роту В. Будзілы (35743/25 з Кароны і 2676/5 з ВКЛ), Кербеца (з Кароны – 18822 і 5318 злотых з ВКЛ), Сямашкі (Карона – 29266 і 1214 злотых ВКЛ) а так сама за Бадзяноўскага, Бялінскага, Левікоўскага. Прычым, паколькі шмат мужоў патрапіла ў палон ці загінула, іх заслужанае атрымалі жонкі ротмістраў: Сумы і Глухоўскага, Тышкевіча, Кербеца, Будзілы, Сямашкі. На гусарскія роты скарб ВКЛ выдаў 513825 злотых. З ВКЛ паходзілі роты пяцігорцаў: Хруслінскага, Стравінскага, Іваноўскага, Бернацкага, Стогнева, Бедрыцкага, жонкам Стэцкевіча, Скалка, Белазора. З іх толькі Семіхоўскі атрымаў узнагароджанне з Кароны. Разам за пяцігорцаў выходзіла 244605 зл. Сярод казакоў з Кароны паходзілі роты Дзербіцкага і жонкі нейкага Марціна, а з ВКЛ: Токарскага, Стагнева, Чаплінскага, Германовіча (атрымала жонка), Вайцэхоўскага. Казацкія роты ўзялі са скарбу ВКЛ агулам 158900 зл. Палку А. Лісоўскага выдалі яшчэ 15000 зл.

Выдаткі былі астранамічныя, збіраліся яны павольна і галоўны з'езд шляхты ВКЛ 9 лістапада 1613 г. прызначыў на аплату інфлянцкім і Берасцейскім канфедэратам усе свае падаткі і дабраахвотныя складкі[99]. Агулам ВКЛ выдаткавала на маскоўскую і інфлянцкую вайну 1220000 злотых, у той час, як Карона выдала 4194783 злотых. Паводле справаздачы падскарбія ВКЛ Яраша Валовіча сойму 1613 г. скарб ВКЛ, выплаціў канфедэратам 833252, 25 злотых і акрамя таго, скарбны ВКЛ Мікалай Бральніцкі прывез сапежынцам у Берасце 541000 і 1715,20 злотых[100]. Па выніку разлікаў 1612–1614 г. Берасцейскія канфедэраты атрымалі – 541716,

[99] *Akta zjazdów stanów Wielkiego Księstwa Litewskiego*, t. 2. Warszawa 2009, s. 179–183.

[100] РНБ, ф. 971, воп. 2. Аўт.63/2. арк. 39.

Сталічныя – 10741, Смаленскія – 22923, Інфлянцкія – 180535 зл. адпаведна, акрамя таго, кампенсацыю за службу ў 13525 злотых выдалі А. Гасеўскаму[101]. Апошнімі з удзельнікаў Дзмітрыяд у сакавіку 1614 г. разлічыліся роты Юрыя Збароўскага, Язэпа Корсака, Габрыэля Тупальскага і Паўла Руцкага. Яны прынялі грошы разам з інфлянцкімі канфедэратамі 1611–1612 г. у Менску[102], што сведчыць аб іх выхадзе пасля вайны ў Маскве на гарнізоную службу ў Інфлянты.

Такім чынам удзел шляхты ВКЛ – „літвы" у падзеях другой Дзмітрыяды відавочны. Шляхта, маяшчане і прафесійныя жаўнеры інфлянцкай арміі ВКЛ бралі ўдзел у выправе Ілжэдзмітрыя II ад самага яго пачатку і да канца. З'яўленне і знікненне кандыдатаў на Самазванца ў Віцебску і Сандаміры, як і фінальнае выпраўленне „шклоўскага бадзягі" з Прапойска, як і карэспандэнцыя ўраднікаў ВКЛ вакол гэтых падзей, можа сведчыць аб удзеле беларускай шляхты ў падрыхтоўцы авантуры Ілжэдзмітрыя II на прыватным узроўні. Разам з тым, наяўныя крыніцы не дазваляюць сцвярджаць напэўна аб інспірацыі руху спецслужбамі ВКЛ. У войску Самазванца найманыя роты былі адносна роўныя па колькасці. Яны захоўвалі свае камандаванне і характэрны для Рэчы Папалітай падзел на каронную і літоўскую часткі. Прыход у Тушынскі лагер брацлаўскай і кіеўскай шляхты з начале Р. Ружынскім і запарожскіх казакоў пахіснулі ўладу у бок караняжаў, але падыход войска Тышкевічаў і А. Лісоўскага ўраўняла палітычныя пазіцыі прадстаўнікоў дзьвух частак Рэчы Паспалітай. Калі ж да войска Самазванца далучыўся славуты ротмістр з інфлянцкага войска ВКЛ Я.П. Сапега і шэраг яго баявых таварышаў, адбыўся кампраміс, паводле якога Р. Ружынскі стаў гетманам на поўдзень, а Я.П. Сапега на поўнач ад Масквы. Менавіта на долю аддзелаў, якімі кіравалі грамадзяне

[101] A. Filipczak-Kocur, *Skarbowość Rzeczy Pospolitej 1587–1648. Projekty – ustawy – realizacja,* Warszawa 2006, c. 291.

[102] Г.М. Сагановіч, *ВКЛ і вайсковыя канфедэрацыі 1612–1614 гг.* „Беларускі гістарычны агляд', 2008. Т. 15, с. 116.

ВКЛ, прыйшліся асноўныя баявыя дзеянні 1608–1610 г. супраць апалчэнцаў Шуйскіх і войскаў Швецыі, аб чым сведчыць не толькі пералік дзеючых асоб, але і разлік з ротамі „сапежынцаў" і іншых праз структуры ВКЛ у 1611–1614 г.

Бібліяграфія

Архіўныя крыніцы

Archiwum państwowe na Wawelu (Archiwum Narodowe w Krakowie), „Archiwum Sanguszków Sławuckie", Sygn. 51.

Biblioteka książąt Czartoryjskich, Sign. 102, №117; Sign, 103, №250; Sign, 104, №216; Sign, 2073, №69 (295); Sign, 2245, №10.

Biblioteka Naukowa Polskiej Akademii Nauk i Polskiej Akademii Umiejętności, Sygn. 363, №23.

Lietuvos Mokslu Akademijos Vrublevskiu Biblioteka, f. 9–431, p.143; F.17–178, p.5–6

Natsyyanalny Gistarychny Arkhiu Belarusi [Нацыянальны Гістарычны Архіў Беларусі, КМФ 18, Метрыка Літоўская, спр. 85, воп. 1, арк. 429; спр. 289, воп. 1, арк. 188, 320, 338, 375; спр. 293, воп. 1, арк. 66 аб.–67. 189, 220; спр. 596. арк.1–14].

Rasiyskaya natsyyanalnaya bibliyateka u Sankt Petsiarburgu [Расійская Нацыянальная бібліятэка ў Санкт–Пецярбургу], ф. 971. воп. 2, „Аўтографы П.П. Дуброўскага", Аўт.63/2, арк.39, арк. 22.

Літаратура

Akta zjazdów stanów Wielkiego Księstwa Litewskiego, red. H. Lulewicz. T. 2: Okresy panowań królów elekcyjnych, Warszawa 2009.

Âkubaŭ V.U., *Peršyâ kanfedèracyì vojska Vâlìkaga Knâstva Lìtoŭskaga ìih uplyŭ na sìtuacyû ŭ Vâlìkìm Knâstva Lìtoŭskaga ì ih uplyŭ na sìtuacyû ŭ Vâlìkìm Knâstve Lìtoŭskìm u 1604–1608 gadah* „Vesnìk Polackaga dzâržaŭnaga unìversìtèta". Seryâ A. Gumanìtarnyânavukì. Nr. 7. 2008, s. 34–44 [Якубаў В.У., *Першыя канфедэрацыі войска Вялікага Княства Літоўскага і іх уплыў на сітуацыю ў Вялікім Княстве Літоўскім у 1604–1608 гадах* „Веснік Полацкага дзяржаўнага універсітэта". Серыя А. Гуманітарныя навукі. Nr. 7. 2008, с. 34–44].

Barkulabaŭskaâ hronìka [у:] *Belaruskìâ letapìsy ì hronìkì,* red. Arloŭ U.,Mìnsk 1997 *[Баркулабаўская хроніка* [у:] *Беларускія летапісы і хронікі*, ред. Арлоў У., Мінск 1997].

Bohun T., *Moskwa 1612,* Warszawa 2005.

Dnevniki Âna Petra Sapegi (1608–1611) [u:] *Pamâtniki Istorii Vostočnoj Evropy. Istočniki XV–XVII v.* T. IX Gralâ, I., Florâb.N., Èskin, Û.M., Tûmencev I. Moskva 2012 *[Дневники Яна Петра Сапеги (1608–1611)* [y:] Памятники Истории Восточной Европы. Источники XV–XVII в. *T. IX* Граля, И., Флоря Б.Н., Эскин, Ю.М., Тюменцев И. Москва 2012].

Dyaryus*z poselstwa moskiewskiego wysłanego do Warszawy z końcem r.1611* [w:] Hirschberg A., *Polska a Moskwa w pierwszej połowie weku XVII*, Lwów, 1901.

Dyaryusz Waclawa Dyamentowskiego (1605 – 1609) [w:] Hirschberg A., *Polska a Moskwa w pierwszej połowie weku XVII*, Lwów, 1901.

Dzemìdovìč A.V., V*âlikae Knâstva Lìtoŭskae ŭ Adnosìnahrèčy Paspalìtajz Rasìej ì Švecyâj u peršaj trècì XVII st.,* Mìnsk 2021 [Дземідовіч А.В., *Вялікае Княства Літоўскае ў адносінахРэчы Паспалітай з Расіей і Швецыяй у першай трэці XVII ст.*, Мінск 2021].

Filipczak-Kocur A., *Skarb Litewski za pierwszych dwu Wazów 1587–1648,* Wrocław 1994.

Filipczak-Kocur A., *Skarbowość Rzeczy Pospolitej 1587 – 1648.Projekty – ustawy – realizacja,* Warszawa 2006.

Historia wojny moskiewskiej przez Mikołaja Scibora z Marchocic Marchockiego, Poznań 1841.

Niesiecki K., *Herbarz polski,* t. III, Lipsk 1839.

Niesiecki K., *Herbarz polsk*i, t. IX, Lipsk 1842.

Niesiecki K., *Herbarz polsk*i, t. T. IV, Lipsk 1839.

Niesiecki K., *Herbarz polsk*i, t. VI, Lipsk 1841.

Pamâtniki smutnogo vremeni.Tušinskij vor: ličnost', okruženie, vremâ. Dokumenty i materialy [y:] *Trudy istoričeskogo fakul'teta MGU*. Seriâ 1. Nr. 10. Istoričeskie istočniki. Moskva 2001 *[Памятники смутного времени. Тушинский вор: личность, окружение, время. Документы и материалы* [w:] Труды исторического факультета МГУ. Серия 1. Nr. 10. *Исторические источники*, Москва 2001].

Przepiórka A.G., *Od Staroduba do Moskwy. Działania wojsk Dymitra II Smozwańca 1607 – 1608*, Zabrze 2007.

Saganovìč G.M., *VKL ì vajskovyâ kanfedèracyì 1612–1614 gg.,* „Belaruskì gìstaryčny aglâd". T. 15 (28–29). 2008, s.100–123 [Сагановіч Г.М., *ВКЛ і вайсковыя канфедэрацыі 1612–1614 гг.,* „Беларускі гістарычны агляд". Т. 15 (28–29). 2008, с.100–123].

Selin A.A., *Smuta na Severo-Zapade v načale XVI veka: očerki iz žizninovgorodskogo obŝestva,* SPb 2017 [Селин А.А*., Смута на Северо-Западе в начале XVI века: очерки из жизни новгородского общества*, СПб 2017].

Sobieski W., *Żółkiewski na Kremlu*, Warszawa 1920.

Szwedzkie wojny 1611–1632, t. I/2, Oświęcim 2015.

Tûmencev I.O., *Oborona Troice – Sergieva monastyrâ 1608 – 1610 gg.,* Moskva 2007 [Тюменцев И.О., *Оборона Троице – Сергиева монастыря 1608 – 1610 гг.*, Москва 2007].

Tûmencev I.O., *Smuta v Rossii v načale XVIII st.: dviženie Lžedmitriâ,* Volgograd 1999 [Тюменцев И.О., *Смута в России в начале XVIII ст.: движение Лжедмитрия*, Волгоград 1999].

Uruski S., *Rodzina. Herbarz szlachty polskiej*, t. IV, Warszawa 1909.

Uruski S., *Rodzina.Herbarz szlachty polskiej*, t. I, Warszawa 1904.

Uruski S., *Rodzina.Herbarz szlachty polskiej*, t. V, Warszawa 1908

Uruski S., *Rodzina.Herbarz szlachty polskiej*, t. II, Warszawa 1905.

Uruski S., *Rodzina.Herbarz szlachty polskiej*, t. III, Warszawa 1906.

Uruski S., *Rodzina.Herbarz szlachty polskiej*, t. XI, Warszawa 1914.

Uruski S., *Rodzina.Herbarz szlachty polskiej*, t. XIV, Warszawa 1917.

Volumina constiutionum. Рэд.S. Grodziski, t. II, vol. 1, Warszawa 2005.

Volumina legum. Рэд. J. Ohryzka. T. III, St. Petersburg 1860.

Żojdź K., *Wszyscy ludzie króla: Zygmunt III Waza i jego stronnicy w Wielkim Księstwie Litewskim w pierwszych dekadach XVII wieku*, Toruń 2019.

Participation of the GDL citizens in the army of falshe Dmitry II in 1608–1610

The main goal of the article is to find and highlight the participation of representatives of Grand Duchy of Lithuania in the movement of False Dmitriy II during the Russian Thames of Troubles. The participation of representatives of the Belarusian lands of the GDL in the mercenary army of False Dmitri II and their separate command from representatives of the Ukrainian magnatery of Polish Crown, which was in charge in the Tushino camp of the Impostor, was proven. The First and Second Dmitry was officially ignored by the governing circles of the GDL, and the king Sigismund Vasa forbade the participation of the citizens and nobles of the border lands in attacking the moskovites on both sides of the border. at first, the district border nobility joined the impostor – J. Budzilla, J. Kernazycki, M. Wilamowski and the criminals of A. Lisowsky, and only after the end of the rokash in the GDL, on the summer of 1608, captains, veterans from the Grand Duchy Inflant army: J.P. Sapega, J. Tyszkewicz, A. Mlocky, E. Strawinski and others become commanders of regiments in the service of False Dmitry II. In contrast to the Ukrainian lands of the Polish kingdom, the magnatery of the Lithuanian Commonwealth,

except for the Tyszkewicz, did not support False Dmitri. There is currently no evidence of a behaviour – determining connection J.P. Sapega with L. Sapega and Sigismund Vasa. J.P. Sapieha became the hetman of north grope of armies of False Dmitry II. He and his captains of hired forces from the GDL origin performed the most important combat tasks in 1609–1610, occupied the Russian North tried to prevent the march of M. Skopin Shuisky and the Swedes to Moscow in the fall of 1609. After the beginning of the interstate war 1609–1618, the escape of False Dmitry II and the oath of Moscow to Prince Wladislaw, the mercenaries from the GDL joined the state forces, by their own good will.

K e y w o r d s: Grand Duchy of Lithuania, False Dmitry II, mercenary troops, volunteers magnates

This article is distributed under the terms of the Creative Commons Attribution 3.0 PL
© Copyright by Uniwersytet Warszawski Katedra Studiów Interkulturowych Europy Środkowo-Wschodniej & individual articles to their Authors

doi: 10.32612/uw.2543618X.2024.pp.51-85

Przegląd Środkowo-Wschodni, 9, 2024
ISSN 2543-618X eISSN 2545-1324

Nr art. 20240902

Data przesłania: 30.11.2023
Data akceptacji: 03.01.2024

Юрый Тамковіч
незалежны даследчык
yuratamkovich@mail.ru
ORCID: 0009-0001-3878-6526

Феномен рыцарства ў Вялікім Княстве Літоўскім у XIV – XVI стагоддзях: гістарыяграфія пытання

Artykuł traktuje o problematyce badań nad rycerstwem w Wielkim Księstwie Litewskim na przestrzeni ostatnich 120 lat – od początku XX wieku do czasów współczesnych. W pierwszej kolejności dokonano przeglądu głównych dzieł z zakresu historii rycerstwa, które wyszły spod pióra badaczy zachodnioeuropejskich: M. Keen, J. Fleury, J. Hoesing, J. Bumke i innych. Następnie poddano analizie prace naukowe bezpośrednio związane ze zjawiskiem rycerstwa w Wielkim Księstwie Litewskim: przedrewolucyjnych historyków rosyjskich (M. Daszkiewicz, M. Lyubauski, F. Leontowicz) i współczesnych badaczy litewskich i białoruskich (E. Hudavichus, R. Petrauskas, K. Antonaitis, A. Nikzhentaitis, Y. Kyavpene, Y. Bohan). Autor zauważa, że temat ten został po raz pierwszy podniesiony na początku XX wieku, jednak przez długi czas, w okresie dominacji marksistowskiego podejścia do historii, problem ten był prawie niezbadany. Dopiero w latach 90. i po XX w., na tle kryzysu sowieckiej tradycji historiograficznej, w litewskiej i białoruskiej nauce historycznej rozwinął się nurt badawczy dotyczący dziejów rycerstwa w WKL. Większość tekstów naukowych ukazała się w litewskim środowisku akademickim. Nauka białoruska niewiele uwagi poświęca problematyce rycerstwa, a właściwie jedynym historykiem, który poważnie zainteresował się tym tematem, był Jurij Bokhan. Słowa kluczowe: rycerz, rycerstwo, elita, arystokracja, Średniowiecze, historiografia, WKL, wojna, kultura

Мы прызвычаіліся да стэрэатыпнага ўяўлення пра рыцарства: „ваякі на грозных канях" у цяжкіх даспехах, якія „срэбнай збруяй далёка грымяць"[1]. Як вы, напэўна, заўважылі, гэтае апісанне ўзятае з верша класіка беларускай літаратуры Максіма Багдановіча – паэтычным словам ён паспрабаваў апісаць старадаўні герб Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ) – „рыцера збройнага на кане з мечам"[2]. Аднак, што мы ведаем пра рыцарства на землях Літвы і Русі? Нягледзячы на тое, што рыцар змяшчаўся на гербе даўняй славяна-балцкай дзяржавы, а сам феномен рыцарства стаў мегапапулярным ва ўсёй Еўропе, пра дадзеную з'яву на тэрыторыі ВКЛ мы ведаем мала. У нашым артыкуле мы паспрабавалі сабраць у адным месцы той корпус навуковых наратываў, якія падводзяць да раскрыцця феномену рыцарства ў Вялікім Княстве Літоўскім.

Рыцарства ў заходнееўрапейскай гістарыяграфіі

Аднак перад тым, як звярнуцца да даследванняў, што тычацца тэрыторый ВКЛ, нам будзе карысна пазнаёміцца з асноўнымі працамі еўрапейскіх навукоўцаў па тэме рыцарства. Для таго, каб разабрацца ў гісторыі феномена рыцарства ВКЛ, трэба даведацца, як рыцарская ідэя пранікла на літоўскія і ўсходнеславянскія тэрыторыі, якімі былі яе карані, як яна ўзнікла. У кароткім аглядзе, вылучым некалькі гісторыкаў, чые работы, на наш погляд, найбольш поўна даюць адказ на пастаўленныя пытанні.

Падручнікам па вывучэнні сусвета чалавека эпохі Позняга Сярэднявечча можна назваць працу нідэрландскага гісторыка і культуролага Ёхана Хейзінгі „Восень Сярэднявечча"[3]. У сваім

[1] *Поўны збор твораў / Максім Багдановіч*, Т. 1: *Вершы, паэмы, пераклады, наследаванні, чарнавыя накіды / падрыхтоўка тэкстаў і каментарыі: Э.А. Золавай, Т. Р. Строевай, Л. У. Хрышчановіч*. Мінск: Навука і тэхніка, 1992. С. 314.

[2] *Густынская летопись* / Рос. акад. наук, Ин-т рус. лит. (Пушкин. дом). СПб.: Дмитрий Буланин, 2003. – (Полное собрание русских летописей; Т. 40). С. 125.

[3] Гл.: Й. Хейзинга, *Осень Средневековья*. Санкт-Петербург 2022.

сацыякультурным аналізе аўтар дае падрабязную характарыстыку свету ідэй вышэйшых колаў сярэднявечнага грамадства, у тым ліку рыцарства. Асаблівую ўвагу аўтар звяртае на гісторыю штодзённасці, мастацтва і культуру, а ў якасці глебы для даследвання абірае Бургундыю XIV–XV ст., якая дала яму вялікі корпус літаратурных, дакументальных, рэлігійных і мастацкіх крыніцаў. Адной з цэнтральных тэмаў кнігі ёсць рыцарства – гэтаму феномену прысвечана некалькі раздзелаў. Аўтар лічыць, што характэрнай рысай таго часу было панаванне „рыцарскай ідэі": ідэі пра асаблівае прызначэнне арыстакратыі, пра каштоўнасць цноты, вернасці і самаадданасці, пра імкненне да гераічных подзвігаў і воінскай доблесці, пра рамантычную любоў да Дамы, далёкія паходы і турніры. У кнізе даецца аналіз уплыву „рыцарскай ідэі" на вайну і палітыку, разглядаецца феномен рыцарскіх ордэнаў і цнот.

Іншая асоба, якую нельга абмінуць, Жан Флары – адзін з самых таленавітых паслядоўнікаў французскага медыявіста Жоржа Дзюбі, які вядомы як спецыяліст у пытаннях мілітаранай гісторыі сярэднявечнай Еўропы. Ягоная кніга „Ідэалогія мяча"[4] падрабязна аналізуе фармаванне ідэалогіі рыцарства. Навуковец стварае панараму эвалюцыі поглядаў на вайну і ролю ваяра ў раннесярэднявечным грамадстве. Ён звяртае ўвагу на тое, што менавіта ў дадзены перыяд быў сфармаваны кодэкс „рыцарскага гонару", які аказаў значны ўплыў на еўрапейскую культуру пазнейшых вякоў.

Другая кніга Флары „Рыцары і рыцарства ў Сярэднявеччы"(у рускім перакладзе „Паўсядзённае жыццё..")[5], з'яўляецца працягам „Ідэалогіі". Гэта апавяданне пра перадгісторыю і пачаткі рыцарства, пра гісторыю зменаў разумення тэрміна „рыцар" у сярэднявечным грамадстве. Аўтара вельмі займала пытанне адпаведнасці рыцарскага міфа сапраўднай гісторыі, у сваёй спробе

[4] Ж. Флори, *Идеология меча: Предыстория рыцарства* / Жан Флори. – СПб.: Изд. группа «Евразия», 1999.

[5] Ж. Флори, *Повседневная жизнь рыцарей в Средние века: [перевод с французского]*. Москва 2006.

дайсці да праўды Флары абвяргае распаўсюджаныя гістарычныя памылкі. Агулам аўтар падымае цэлы комплекс пытанняў: паходжанне рыцарства, сістэма васальна-феадальных адносінаў, рыцарская ідэалогія і адносіны з Царквой, літаратура, турніры, змены ў тактыцы бою, крыжовыя паходы.

Пры вывучэнні рыцарства нельга абмінуць постаць брытанскага гісторыка Морыса Кіна. Ва ўводным слове да кнігі „Рыцарства”[6] навуковец піша пра сваю дзіцячую любоў да прадмету даследвання, з якой ён яго і апісвае. У кнізе даследуюцца вытокі рыцарства, ягоныя адносіны з царквой, крыжовыя паходы, эвалюцыя турнірнай справы, міфалогія рыцарства. Кін дае сваё ўласнае вызначэнне рыцарства, акрэслівае аспекты, якія фармавалі вобраз рыцара, дае характырыстыку крыніцаў па тэме і апісвае важнейшыя з іх.

Аўтар кнігі „Паняцце рыцарства ў Сярэднявеччы”[7] Ёахім Бумке актыўна вывучаў сярэднявечную нямецкую літаратуру – менавіта яна стала крыніцазнаўчай базай даследвання. Кніга даволі поўна тлумачыць канцэпцыю рыцарства ў Сярэднія вякі. Цэнтральнымі тэмамі ў ягонымі даследванні сталі: эвалюцыя слова „рыцарства”, разгляд рыцара ў вобразе жаўнера, слугі, прадстаўніка шляхецкага стану. У першую чаргу Бумке звяртаецца да нямецкага рыцарства, аналізуючы дакументы напісаныя на раннегерманскіх дыялектах. Гісторык выступае супраць існавання цэльнай канцэпцыі рыцарства (дарэчы, як і Флары) – адзначаючы, што на працягу Сярэдніх вякоў тэрмін „рыцар” меў розныя значэнні.

Неабходна спыніцца і на даследванні брытанскага гісторыка Роберта Джонса „Гісторыя рыцарства”[8], якая ахоплівае гісторыю еўрапейскага рыцарства з XI па XVI стагоддзе. Аўтар аналізуе эканамічныя, сацыяльныя, культурныя і рэлігійныя аспекты развіцця рыцарскага стану, расказвае пра асаблівасці рыцарскага кодэкса

[6] М. Кин, *Рыцарство.* Москва 2000.
[7] J. Bumke, *The Concept of Knighthood in the Middle Ages.* New York, 1982.
[8] Р. Джонс, *История рыцарства.* Москва 2014.

гонару, ролю рыцараў у кіраванні дзяржавай. У кнізе ўсебакова апісваецца жыццё рыцарства на працягу чатырох стагоддзяў, расказваецца аб эвалюцыі іх прававога і сацыяльнага статусу, сістэмы навучання, вонкавага выгляду, а таксама рыцарскай культуры і традыцый.

Гістарыяграфія феномена рыцарства ў ВКЛ

Пераходзячы да пытання рыцарства ў Вялікім Княстве Літоўскім мы павінны прыгадаць прозвішчы некаторых гісторыкаў, якія працавалі ў канцы XIX – першай палове XX ст. Асабліва ў гэтым шэрагу вылучаецца постаць расійскага гісторыка і літаратуразнаўцы Мікалая Дашкевіча. Мікалай Паўлавіч спецыялізаваўся на вывучэнні гісторыі Паўднёвай Русі і ВКЛ, абгрунтоўваў сувязь сюжэтных ліній заходнееўрапейскага і ўсходнеславянскага фальклору, старажытнарускіх былінаў і украінскіх думаў. Арыгінальнай з'яўляецца яго прамова (пазней надрукаваная) „Рыцарства на Русі – у жыцці і паэзіі"[9]. У ёй даследчык выкарыстоўвае характэрны для яго параўнаўчы аналіз. Дашкевіч паказвае, як рыцарская культура пранікала на тэрыторыю Русі і Літвы, а таксама адзначае, што гэтыя землі таксама ўваходзілі ў арыял распаўсюду ідэалаў рыцарства. Пры дапамозе дакументальных крыніцаў, літаратурных твораў і фальклора ён даводзіць, што паноўны стан украінска-беларуска-літоўскіх земляў XII–XVII стагоддзяў: дружыннікі, шляхта, казакі мелі агульныя рысы з заходнееўрапейскім рыцарствам. Дашкевіч прыходзіць да высновы, што „рыцары" Заходняй Русі і Літвы значна адрозніваліся ад заходнееўрапейскіх, аднак яны часткова перанялі рыцарскую ідэалогію і перыядычна выкарыстоўвалі найменаванне „рыцарства". Акрамя таго аўтар вылучае два перыяды пранікнення рыцарскай ідэалогіі на землі Украіны, Беларусі

[9] Н. П. Дашкевич, *Рыцарство на Руси – в жизни и поэзии: [речь, произнесенная 27 октября 1899 г.*]. Киев 1902.

і Літвы: перыяд Старажытнай Русі (XII – першая палова XIII ст.) і эпоха ВКЛ/Рэчы Паспалітай (канец XIV–XVII ст.).

Сучаснік Дашкевіча прафесар Маскоўскага ўніверсітэту Мацвей Любаўскі ў сваёй працы „Нарыс гісторыі Літоўска-Рускай дзяржавы да Люблінскай вуніі ўключна”[10] прыходзіць да высновы, што ў ВКЛ сфармавалася цалкам адпаведная еўрапейскай сістэма феадальных адносінаў са сваёй уласнай „шляхтай-рыцарствам”. Пра распаўсюд тэрміна „рыцарства” і ягоных „звычаяў” на Літоўскую Русь з Польшчы піша ў “Літоўска-Рускім сейме”[11]. Гісторык сцвярджае, што рыцарства ў ВКЛ было „не пустым гукам”, а рэальнай з’явай з усімі рысамі, якія былі ўласцівы заходнееўрапейскай шляхце.

Прафесар Варшаўскага ўніверсітэта Фёдар Леантовіч у сваёй працы „Баяры і служылыя людзі ў Літоўска-Рускай дзяржаве”[12] кажа пра „старых літоўска-рускіх „рыцараў”, ці „milites”, якія не былі тым самым, што і шляхта. Леантовіч лічыў, што рыцарства было асаблівай часткай шляхецкага стана, якая выконвала вайсковую службу і сваімі каранямі ўзыходзіла да старажытнарускіх дружыннікаў. У артыкуле „Праваздольнасць літоўска-рускай шляхты”[13] ён зноў агучвае гэтую ідэю, гаворачы пра тое, што літоўска-рускае рыцарства з’яўляецца ў дакументах XV–XVI ст. у якасці ваенна-служылай часткі шляхты, якая адрознівалася ад буйных феадалаў і служылай шляхты, знаходзячыся ў сацыльна-прававым плане паміж імі.

На жаль, гэтыя першыя крокі расійскіх навукоўцаў да даследвання праблемы рыцарства ў ВКЛ, былі спыненыя з Рэвалюцыяй

[10] М.К. Любавский, *Очерк истории Литовско-Русского государства до Люблинской унии включительно: с приложением текста хартий, выданных Великому княжеству Литовскому и его областям*. Москва 1915.

[11] М.К. Любавский, *Литовско-русский сейм: опыт по истории учреждения в связи с внутренним строем и внешней жизнью государства*. Москва 1900.

[12] Ф.И. Леонтович, *Бояре и служилые люди в Литовско-Русском государстве* [w:] *Журнал министерства юстиции*. №15. 1907.

[13] Ф.И. Леонтович, *Правоспособность литовско-русской шляхты* [w:] *Журнал министерства народного просвещения*. Новая серия. Ч. 15. 1908.

і доўгі час да пытання не вярталіся. У савецкі час, пры панаванні класавага падыходу, не было вялікай патрэбы ў вывучэнні феномена рыцарства. Да таго ж гісторыкам „хапала" разгляда арыстакратычнага мілітарнага стану ў выглядзе шляхты, дваранства. Больш глыбокае вывучэнне праблемы рыцарства як часткі мілітарнай культуры ВКЛ пачалося адносна нядаўна. Пачынальнікамі былі літоўскія даследчыкі, якія шукалі і шукаюць у гісторыі старой Літвы праявы з'яваў, характэрных для цывілізацыі сярэднявечнага Захаду. Для сучаснай літоўскай дзяржавы, якая ўваходзіць у склад аб'яднанай Еўропы, вельмі важна рэпрэзентаваць сябе ў ідэалагічным, а значыць і гістарычным плане як частку заходнееўрапейскага света. Рыцарская культура – гэта адзін са слупоў еўрапейскай цывілізацыі і свядомасці. Больш за тое папулярнасць рыцарскага міфа распаўсюдзілася і на тыя тэрыторыі, дзе гістарычна рыцарства не існавала – якія падпалі пад уплыў заходнееўрапейскай цывілізацыі ў Новы час. Таму для гісторыкаў Літвы тэма рыцарства з'яўляецца адным з "масткоў", які звязвае іх дзяржаву, якая ўвайшла ў "сям'ю еўрапейскіх народаў" даволі позна, з цэнтральнымі краінамі Старога Свету. У пошуках свайго ўласнага рыцарства, літоўская гістарыяграфія зрабіла вялікі крок у распрацоўцы праблемы

Пры гэтым, на дадзены момант кола даследчыкаў, якія звярталіся да акрэсленай тэмы адносна невялікае, а іх напрацоўкі пакуль абмежаваны навуковымі артыкуламі. Сярод піянераў у вывучэнні феномена рыцарства ВКЛ былі літоўскія гісторыкі Эдвардас Гудавічус і Станісловас Лазутка, якія яшчэ ў 1981 г. апублікавалі невялікі артыкул „Рыцары"[14]. У ім аўтары даюць вызначэнне тэрміна „рыцар", кажуць пра ягоную неадзначнасць. На думку аўтараў рыцарствам можна назваць і ўвесь шляхецкі стан разам, і асобны пласт дробнага шляхецтва ў вузкім сэнсе. Рыцарства як з'ява „раскладаецца" на аснову – сацыяльна-маёмасныя адносіны і ідэалагічную

[14] E. Gudavičius, S. Lazutka, *Riteriai* [w:] *Lietuvos istorijos metraštis*. *1980 metai*. – Vilnius 1981. P. 105–109.

надбудову ў выглядзе рыцарскай культуры з яе атрыбутамі. Пасля агульнага апісання тэрміна аўтары пераходзяць да яго ўжывання ў ВКЛ. Яны робяць выснову, што рыцарства ў ВКЛ існавала, мела адпаведную заходнееўрапейскай сацыяльна-эканамічную базу, але „ідэалагічная надбудова" ў поўнай меры ў Літве не сфармавалася. Пазней Гудавічус звяртаўся да пытання „рыцарства". У артыкуле „Асаблівасці арганізацыі літоўскага прызыўнога войска"[15] і сваёй „Гісторыі Літвы"[16] навуковец паўтарае папярэднія высновы. Ён піша, што ў ВКЛ аформілася цалкам еўрапейская сістэма феадальных адносінаў са сваім рыцарствам, якое часцей звалася шляхтай ці баярамі (тэрмін „рыцарства" быў не самым папулярным ў паноўнага стану). Пры тым, даследчык сцвярджае, што калі ў сацыяльнымі і мілітарным плане вялікалітоўскае „рыцарства" адпавядала заходнееўрапейскаму, то ў культурным узроўні розніца была вялікая: у Княстве не быў шырока распаўсюджаны кодэкс рыцарскага гонару, культ Дамы і іншыя элементы рыцарскай, куртуазнай культуры. Адзначым, што ў сваіх працах аўтар звяртае шмат увагі на зямельныя адносіны, механізмы фармавання паспалітага рушання. Тэксты Гудавічуса напісаныя ў марксісцкай традыцыі, хоць пасля атрымання Літвой незалежнасці з іх і знікла адпаведная ідэалагічная тэрміналогія. Іншым бачацца наратыў маладзейшых літоўскіх гісторыкаў, якія працягваюць вывучэнне тэмы, паднятай Гудавічусам і Лазуткай, але ў адрозненні ад іх звяртаюць больш увагі на культурныя асаблівасці феномена рыцарства ВКЛ.

У 1990–2000-ыя гг., у сувязі з атрыманнем літоўскай гістарычнай навукай метадалагічнай і ідэалагічнай незалежнасці ад савецкай гістарычнай парадыгмы, да праблемы звярнуліся зноў. Даволі поўна апісаны феномен рыцарства ВКЛ Рымвідасам Пятраўскасам у артыкуле „Рыцарства ў Вялікім Княстве Літоўскім з канца XIV

[15] E. Gudavičius, *Lietuvių pašauktinės kariuomenės organizacijos bruožai* [w:] *Karo archyvas*. T. 13. Vilnius 1992. P. 43–118.

[16] Э. Гудавичюс, *История Литвы.* Т. I: *с древнейших времен до 1569 года* / науч. Ред. Е. Л. Назарова; пер. Г. И. Ефремова. Москва 2005.

па пачатак XVI стагоддзя”[17]. Аўтар падзяліў свой артыкул на тры часткі: Рыцарства ў эпоху Позняга Сярэднявечча; Рыцарства пры двары вялікага князя літоўскага; Тэрмін Miles strenuus у ВКЛ у XVI стагоддзе. Таксама ёсць прылажэнне у якім даследчык дае пералік пасаваных у рыцары шляхцічаў ВКЛ (1400–1501). Пятраўскас сабраў і прааналізаваў вялікую колькасць матэрыялаў аб раннім этапе развіцця рыцарскай культуры ў ВКЛ. Навуковец даследуе значэнне тэрміну „рыцар” у вялікалітоўскіх дакументах таго часу, каб зразумець на колькі пашыранай была гэтая з’ява сярод шляхты. Асаблівая ўвага звяртаецца на вялікакняскія двары Вітаўта і Аляксандра Ягелончыка – панаванне гэтых манархаў разглядаецца як эпоха ўздыма рыцарскай культуры ў ВКЛ у XIV – XVI ст. Навуковец падрабязна апісвае факты праяваў рыцарскай культуры ў ВКЛ: пасаванне рыцараў, турніры, падарожжы „па рыцарскую навуку” ў іншыя краіны, прысутнасць рыцараў-іншаземцаў пры двары вялікага князя. Урэшце ён адзначае, што рыцарскія каштоўнасці былі вядомыя ў ВКЛ, але не сталі распаўсюджанай з’явай, бо рыцарская культура ў асноўным была засяроджана пры двары вялікага князя і абмяжоўвалася вузкім колам шляхты.

Артыкул Кастыціса Антанаіціса „Феномен рыцарства ў Літве у XIV–XVI ст.”[18] прысвечаны таму, калі і як з’явіліся літоўскія рыцары. У ім таксама ідзе гаворка аб паходжанні спецыфічнага характару і ўзвышэнні сацыяльнай групы рыцараў у сярэднявечнай Еўропе і Літве. Аўтар сцвярджае, што культура літоўскіх феадалаў мела больш агульнага з заходнееўрапейскай рыцарскай культурай, чым лічылася раней. Антанаіціс піша, што тэхнічны ўзровень узбраення літоўцаў у XV ст. набліжаецца да заходніх суседзяў (прыводзяцца археалагчныя і пісьмовыя звесткі), а менталітэт літоўскай

---

[17] R. Petrauskas, *Knighthood in the Grand Duchy of Lithuania from the late fourteenth to the early sixteenth centuries* [w:] *Lithuanian Historical studies II*, 2006. P. 39–66.

[18] K. Antanaitis, *Riterijos apraiškos Lietuvoje 14–16 amžiais* [w:] *Darbai ir Dienos Nom 5(14).* Kaunas, 1997. P. 125–142.

феадальнай эліты быў падобны на еўрапейскі – гэта прывяло да таго, што ідэі рыцарства маглі быць лёгка прыняты ў ВКЛ. Аднак заходнееўрапейскі культурны ўплыў не быў поўным. Літоўцы не прымалі турніры, культ Дамы, рыцарскую літаратуру і многія традыцыі паводзін рыцараў. У перыяд гаспадарання Вітаўта Вялікага знаць знаходзілася пад моцным уплывам цэнтральнай княскай адміністрацыі і менавіта адтуль ішоў распаўсюд заходняй рыцарскай культуры ў ВКЛ. Паступова, да канца XVI ст., слова „рыцар" стала сінонімам тэрміна „шляхціц".

Яшчэ адзін літоўскі аўтар, які звяртаўся да нашай тэмы ў 1990–ыя гг. – Альвідас Нікжантайціс у сваім артыкуле „Асаблівасці літоўскага войска ў XIII–XV ст. (арганізацыя, тактыка, звычаі)" адзначае, што сутыкненне літоўцаў з заходнееўрапейскімі рыцарамі прывяло да арыентацыі літоўскіх элітаў на вобраз рыцара, а таксама паўплывала на распаўсюджванне элементаў рыцарскай культуры ў ВКЛ[19].

Нельга абыйсці ўвагай артыкул Юратэ Кяўпене „Вобраз рыцара Вялікага Княства Літоўскага ў тэкстах, напісаных Мацеем Стрыйкоўскім"[20]. Даследчыца спрабуе даць адказ на пытанне – ці існаваў у Вялікім Княстве Літоўскім класічны сярэднявечны інстытут рыцарства альбо на гэтых тэрыторыях прысутнічалі толькі яго атрыбуты? У артыкуле даецца шырокі агляд даследаванняў паяпрэднікаў, якія ў той ці іншай ступені займаліся пытаннем феномена рыцарства ў ВКЛ: К. Антанайціс, Х. Л. Буш, Э. Гудавічус, Н. Якавенка, Ф. Леантовіч, М. Любаўскі і А. Нікжэнтайціс. Каб адказаць на пытанне спадарыня Кяўпене выкарыстоўвае літаратурныя тэксты, напісаныя М. Стрыйкоўскім – адштурхваючыся ад іх, яна спрабуе зразумець якім быў вобраз рыцара ў ВКЛ XVI ст. Самога

[19] A. Nikžentaitis, *XIII–XV a. lietuvių kariuomenės bruožai (organizacija, taktika, papročiai)* [w:] *Karo archyvas.* T. 13. 1992. p. 3–33.

[20] J. Kiaupiene, *Kunigaikštystės riterio vaizdinys Motiejaus Stryjkovskio tekstuose', Kultūrų sankirtos. Skiriama doc. dr. Ingės Lukšaitės 60-mečiui*, cd. Z. Kiaupa et al. Vilnius 2000, p. 117–141.

Мацея Стрыйкоўскага аўтарка называе рыцарам Вялікага Княства Літоўскага XVI ст., які пісаў для такіх жа рыцараў. Яна прыходзіць да высновы, што паняцце рыцар у творах Стрыйкоўскага часцей за ўсё ўжываецца ў значэнне „герой". Для М.Стрыйкоўскага рыцар – гэта адважны салдат, воін, імі ён называе воінаў-герояў розных часоў і краін. Акрамя гэтага М. Стрыйкоўскі паслядоўна выкарыстоўвае слова „рыцары" ў дачыненні да шляхты рускіх земляў ВКЛ, падкрэсліваючы, што рускае дваранства ВКЛ мела больш старажытную традыцыю рыцарства, чым літоўскае. Таксама Кяўпене заўважае, што, чым больш гістарычнае апавяданне Стрыйкоўскага набліжаецца да XVI ст., тым часцей рыцарства атаясамліваецца з усёй шляхтай ВКЛ.

Падобныя тэзісы Юратэ Кяўпеня паўтарае і ў раздзеле „Сярэднявечныя рыцары ці *gentry* Вялікага Княства Літоўскага ранняга Новага часу?" сваёй кнігі „Мы, Літва". Шляхта Вялікага Княства Літоўскага. Грамадскае і прыватнае жыццё"[21]. Спадарыня Кяўпеня прааналізавала дакументы, творы эпохі ВКЛ, у якіх ужываўся тэрмін „рыцар", „рыцарства" у адносінах да шляхты гэтай дзяржавы. Асаблівая ўвага была звернутая на працы слыннага гісторыка Мацея Стрыйкоўскага, які гэты тэмін ужываў даволі часта. Аўтар складае вобраз той часткі грамадства ВКЛ якая звалася „рыцарствам", а напрыканцы раздзела на аснове ранейпрыведзенага матэрыялу спрабуе знайсці агульныя рысы паміж вялікалітоўскім „рыцарствам" і англійскімі gentry. Аднак канчатковага адказу – ці адпавядае „рыцарства" ВКЛ брытанскім gentry аўтар не дае.

Нягледзячы на тое, што яшчэ з 1990-ых гадоў у беларускай мастацкай, навукова-папулярнай, а часам і навуковай літаратуры пачаў ужывацца тэрмін „рыцарства", айчынная гістарыяграфія не можа пахваліцца комплексным вывучэннем праблемы. Пры ўжыванні дадзенага тэрміна беларускія аўтары карыстаюцца тымі жа

[21] J. Kiaupiene, *„Mes, Lietuva" Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės bajorija XVI a. (viešasis ir privatus gyvenimas)"*. Vilnius 2003.

матывамі, што і іх літоўскія калегі: неабходна паказаць беларусам, што яны таксама з'яўляюцца спадчыннікамі таямнічага, яскравага света рыцарства, што Беларусь таксама ёсць краінай еўрапейскай культуры. Аднак тэзіс пра існаванне рыцарства ў ВКЛ так і не знайшоў грунтоўнага пацверджання ў навуковых працах беларускіх гісторыкаў.

У кантэксце даследвання рыцарскай культуры беларускімі навукоўцамі, можна прыгадаць артыкул „Рыцары"[22] аўтарства вядомага гісторыка Анатоля Пятровіча Грыцкевіча, змешчаны ў першым томе „Энцыклапедыі ВКЛ", аднак ён даволі павярхоўны і не мае вялікага аб'ёма, што звязана з фарматам „Энцыклапедыі". Большую частку артыкула, напісанага ў ключы савецкай гістарыяграфіі, займае тлумачэнне тэрміну рыцарства ў кантэксце Заходняй Еўропы. Напрыканцы, у адным абзацы, навуковец коратка ўзгадвае асноўныя дакументы эпохі ВКЛ, у якіх фігуруе гэты тэрмін. Аўтар кажа пра асаблівасці ў разуменні феномена рыцарства на тэрыторыі ВКЛ – ён сцвярджае, што рыцарствам тут называлі коннікаў-феадалаў, а сам тэрмін „рыцар" адпавядаў „шляхцічу" і "баярыну".

Аднак беларуская навука можа пахваліцца грунтоўнымі працамі, якія разглядаюць розныя аспекты шляхецкай культуры ў ВКЛ – некаторыя з іх будуць надзвычай карысны для вывучэння феномена рыцарства. Адной з самых вядомых у гэтым шэрагу з'яўляецца праца Юрыя Бохана „Турнірныя традыцыі ў Вялікім княстве Літоўскім у XIV–XVI стагоддзях"[23]. У кнізе разглядаецца далучанасць феадальнай эліты Вялікага княства Літоўскага да еўрапейскіх турнірных традыцый у часы Позняга Сярэднявечча. Звяртаецца ўвага на пачатак распаўсюджання ў ВКЛ турнірнай практыкі, віды турнірных практыкаванняў і спецыфічны турнірны рыштунак.

---

[22] *Рыцары* [w:] *Вялікае княства Літоўскае: Энцыклапедыя. У 2 т.* Т. 1: *Абаленскі – Кадэнцыя* / Рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск 2005.

[23] Бохан Ю.М. *Турнірныя традыцыі ў Вялікім княстве Літоўскім у XIV–XVI стагоддзях.* Мінск 2008.

Яшчэ адна праца аўтара „Узбраенне насельніцтва беларускіх зямель у XIV – XVI стагоддзях”[24] прысвечана эвалюцыі зброі на тэрыторыі Беларусі ў эпоху ВКЛ. У ёй разглядаюцца розныя катэгорыі наступальнага і засцерагальнага ўзбраення, мясцовыя традыцыі, а таксама заходнія і ўсходнія ўплывы на развіццё вайсковай справы. У кантэксце рыцарскай культуры яна карысна тым, што добра паказвае працэс „вэстэрнізацыі” ўзбраення ў ВКЛ, асаблівую цікавасць выклікае інфармацыя пра пласцінавыя даспехі, якія выкарыстоўваліся феадальнай элітай дзяржавы (прыгадаем багацейшы збор Радзівілаў у Нясвіжы) і былі характэрныя для еўрапейскага рыцарства таго часу.

Неабходна ўзгадаць і кнігу, напісаную Юрыем Мікалаевічам разам з Анастасіяй Скеп’ян, „Побыт феадалаў Вялікага Княства Літоўскага ў XV – сярэдзіне XVII стагоддзя”[25], якая адлюстроўвае важнейшыя аспекты матэрыяльнай культуры феадалаў – жыллё, харчаванне, адзенне, вялікая ўвага надаецца баўленню вольнага часу – паляванню, рыцарскім турнірам, гульням і забавам. Праца комплексна паказвае „знешнія” атрыбуты жыццядзейнасці феадалаў ВКЛ і тым самым дазваляе правесці параўнанне з еўрапейскай рыцарскай культурай, паказаць падабенства і адрозненне гэтых двух сацыяльных груп.

Хацелася б адзначыць, што Юры Бохан браў актыўны ўдзел у беларускім рэканструктарскім русе, дапамагаў вядомаму клубу „Княжы Гуф” у стварэнні рыцарскіх даспехаў. Дарэчы, гэты клуб займаўся не толькі папулярызацыяй вайсковай гісторыі ВКЛ і гістарычнай рэканструкцыяй, але і падрыхтоўкай гістарычных праектаў – так у 2008 г. у Нацыянальным гістрычным музеі удзельнікамі клуба была арганізавана выстава „Рыцары Вялікага княства”. Агулам рэканструктарскі рух на Беларусі – важная старонка ў гісторыі

[24] Бохан Ю.М. *Узбраенне насельніцтва беларускіх зямель у XIV–XVI стагоддзях.* Мінск: Беларусь, 2012.

[25] Бохан Ю.М. Скеп’ян А.А. *Побыт феадалаў Вялікага Княства Літоўскага ў XV – сярэдзіне XVII стагоддзя.* Мінск 2011.

папулярызацыі рыцарскай культуры на Беларусі, аднак гэта тэма асобнага даследавання.

Трэба сказаць, што рыцарскія ідэалы былі важнай часткай сармацкай культуры шляхты Рэчы Паспалітай. Феномен рыцара-воіна, рыцара-абаронцы Айчыны і Веры эпохі сарматызму быў апісаны ў працах: „Сармацкая культура беларускай шляхты ў XVI–XVIII стагоддзях”[26] беларускай даследчыцы Лады Клімуць і “Міфы і вобразы сарматызма. Вытокі нацыянальнай ідэалогіі Рэчы Паспалітай”[27] расійскага навукоўца Марыі Лескінен. Аўтаркі даюць падрабязны аналіз асноўных рысаў сармацкага міфа, ідэала і вылучаюць у якасці адной з галоўных роляў шляхціча-сармата – роль воіна-рыцара. Лада Яраславаўна прыходзіць да высновы, што шляхта ВКЛ XVI–XVII ст. успрыняла заходнееўрапейскую рыцарскую этыку, перапрацаваўшы яе на свой манер, дадаўшы сармацкі каларыт, а Марыя Войтаўна сцвярджае, што пералік рысаў, які быў уласцівы для „польскага рыцара” цалкам адпавядае тым, што былі характэрныя для заходнееўрапейскага рыцара.

Асобна прыгадаем працу Наталлі Якавенка „Украінская шляхта з канца XIV да сярэдзіны XVII стагоддзя. Валынь і Цэнтральная Украіна” у якой яна разглядае гісторыю прывіляванага стану на тэрыторыі Украіны у складзе ВКЛ і Польшчы[28]. Першы раздзел кнігі пачынаецца з даследвання пераходу „баяр-рыцараў” (так у Якавенка) да баяр-шляхты, гаворка ідзе пра перабудову старажытнарускай структуры баярства ў часы Вялікага Княства Літоўскага. Нягледзячы на тое, што кніга павярхоўна закранае тэму рыцарства, яна карысна аналізам развіцця шляхецкага (рыцарскага) стану ў кантэксце феадальнага грамадства. Гэта дае добры грунт не

[26] Клімуць Л.Я. *Сармацкая культура беларускай шляхты ў XVI–XVIII стагоддзях*. Мінск 2013.

[27] Лескинен М. В. *Мифы и образы сарматизма. Истоки национальной идеологии Речи Посполитой*, Москва 2002.

[28] Н. М. Яковенко, *Українська шляхта з кінця XIV до середини XVII ст. Волинь і Центральна Україна*. Київ 1993.

толькі для роздумаў пра лёсы рыцарства ў ВКЛ, але і для параўнанняў з тымі ж працэсамі ў Заходняй Еўропе.

Спецыяльная літаратура

Трэба памятаць, што феномен рыцарства ўключае ў сябе не толькі матэрыяльную культуру, але і духоўную, важным элементам якой ёсць літаратура. Вядомым знаўцам гэтай часткі рыцарскай культуры з'яўляецца беларускі даследчык Аляксандр (Алесь) Бразгуноў, які напісаў манаграфію „Перакладны рыцарскі і гістарычны раман Беларусі XV – XVI стст."[29]. У кнізе даследуюцца пытанні гісторыі і эвалюцыі папулярных жанраў беларускай перакладной літаратуры Позняга Сярэднявечча – рыцарскага і гістарычнага рамана, разглядаюцца ў параўнанні з еўрапейскімі крыніцамі такія помнікі перакладнога пісьменства, як „Трышчан", „Бава", „Александыя", „Троя", „Атыла". Алесь Уладзіміравіч звяртае ўвагу на „адрозны ад заходнееўрапейскага рыцарства погляд на сваю ролю ў жыцці" шляхты ВКЛ. Ён адзначае, што вялікалітоўская шляхта не мела той ідэйна-эстэтычнай, асновы, на якой грунтавалася культура заходнееўрапейскага рыцарства, то бок для яе тэрмін „рыцарства" не ўтвараў адзіны ментальны комплекс, харэктэрны для заходнееўрапейскага рыцарства. На аснове вывучэння тэкстаў перакладных рыцарскіх раманаў даследчык разважае пра адрозненні і падабенства ў разуменні панятка „рыцарства" ў вялікалітоўскіх і заходнееўрапейскіх феадалаў.

Яшчэ адзін вядомы беларускі даследчык літаратуры ВКЛ Сяргей Кавалёў з'яўляецца аўтарам цэлага шэрагу даследванняў[30]

---

[29] А.У. Бразгуноў, *Перакладны рыцарскі і гістарычны раман Беларусі XV–XVI стст.: еўрапейскі кантэкст, трансфармацыя і эвалюцыя жанру*: Аўтарэф. дыс. на атрыманне вучон. ступ. канд. філал. навук: 10.01.01.Мінск, 2002.

[30] С.В. Кавалёў, *Героіка-эпічная паэзія Беларусі і Літвы канца XVI ст.*. Мінск: Універсітэцкае, 1993. Кавалёў С.В. *Літаратура Вялікага Княства Літоўскага XVI – пачатку XVII ст.: феномен культурнага памежжа*. Мінск 2011. С.В. Ка-

у якіх разглядаюцца творы, прысвечаныя вайсковым канфліктам і вядомым дзеячам мілітарнай гісторыі XV–XVII стагоддзяў. Гэтыя творы, створаныя ў розных жанрах шматмоўнага пісьменства ВКЛ (эпіграматычная, эпічная паэзія, мемуары) раскрываюць вайсковыя ідэалы шляхты ВКЛ, даюць уяўленне пра тое, чым быў тэрмін „рыцарства" для аўтараў гэтых твораў і шырэй для ўсяго шляхецтва.

З гэтага жа пункта гледжання для нас былі карыснымі такія навуковыя працы беларускіх даследчыкаў, як „Беларуская лацінамоўная паэзія: ранні рэнесанс", „Беларуская лацінамоўная паэзія: позні рэнесанс і ранняе Барока"[31] аўтарства Жанны Некрашэвіч-Каротка, „Кніжна-эпіграматычная паэзія Вялікага Княства Літоўскага XVI ст. у кантэксце антычнай традыцыі"[32] Ганны Карповіч, „Старажытная паэзія Беларусі XVI – першая палова XVII ст."[33] Івана Саверчанкі, а таксама артыкул Уладзіміра Кананoвіча „Пахвала князя Канстанціна Астрожскага" як крыніца для вывучэння ідэнтычнасці праваслаўнай эліты ВКЛ пачатку XVI стагоддзя"[34].

валёў, *Шматмоўная паэзія Вялікага Княства Літоўскага эпохі Рэнесансу*. Мінск 2010.

[31] Ж.В. Некрашэвіч-Кароткая, *Беларуская лацінамоўная паэзія: ранні Рэнесанс*. Мінск 2009. Ж.В. Некрашэвіч-Кароткая, *Беларуская лацінамоўная паэма: позні Рэнесанс і ранняе Барока*. Мінск 2011.

[32] Г. А. Карповіч, *Кніжна-эпіграматычная паэзія Вялікага Княства Літоўскага XVI ст. у кантэксце антычнай традыцыі.* Інстытут Славянскай Філалогіі Універсітэта Марыі Кюры-Складоўскай у Любліне, Польскі Інстытут у Мінску. Мінск 2012.

[33] І. В. Саверчанка, *Старажытная паэзія Беларусі XVI – першая палова XVII ст*. / Рэд.А.І.Мальдзіс; АН Беларусі.Ін-т літ.імя Я.Купалы.Фонд фундам.даслед. Рэсп.Беларусь. Мінск 1992.

[34] У. Кананoвіч, *„Пахвала князя Канстанціна Астрожскага як крыніца для вывучэння ідэнтычнасці праваслаўнай эліты ВКЛ пачатку XVI стагоддзя"* [w:] *Arche Пачатак; № 12 (133). Бітва пад Оршай: месца памяці і канфлікт інтэрпрэтацый*. Мінск 2014. С. 736–752.

Мастацтва

Пры вывучэнні рыцарскай культуры ў ВКЛ неабходна спыніцца на тэме вобраза рыцара ў мастацтве. Тут мы можам прыгадаць кнігу Л.Я. Клімуць „Сармацкая культура беларускай шляхты ў XVI – XVIII стагоддзях", дзе даецца апісанне мастацтва эпохі сарматызма, важнай часткай якой быў мілітарны, рыцарскі кампанент.

Унікальным артэфактам эпохі, якую мы абралі для даследвання, з'яўляецца карціна „Бітва пад Оршай". Гэта выбітны твор бітальнага мастацтва, аб'ект для вывучэння зброі і адзення таго часу, адзін з важнейшых сімвалаў сённяшняга канструявання гераічнай мінуўшчыны народаў былога ВКЛ. Для нашай тэмы твор важны тым, што мала-дзе з такой дакладнасцю выяўлены сюжэт з гісторыі Княства, у якім цэнтральнае месца займаюць ваяры, якіх можна назваць рыцарамі. Нягледзячы на тое, што большасць выяўленых на карціне рыцараў мела польскае паходжанне (літоўская кавалерыя ў той час мела больш лёгкі характар), карціна і сёння іграе важную ролю ва ўкараненні думкі пра наяўнасць рыцарства ў старажытнай Літоўскай дзяржаве сярод патрыятычных колаў нацый былога ВКЛ. Карціне прысвечана некалькі значных артыкулаў[35], але мы звернем ўвагу на працу даследчыка з Ужгарада Уладзіміра Гуцула „Карціна

---

[35] M. Janicki, *Obraz Bitwa pod Orszą – geneza, datowanie, wzory graficzne a obraz bitwy „na Kropiwnej" i inne przedstawienia batalistyczne w wileńskim pałacu Radziwiłłów* [w:] *Bitwa pod Orszą,* red. M. Nagielski. Warszawa 2015.

[3.] Жыгульскі, *„Бітва пад Оршай" – аналіз структуры карціны* [w:] *Arche Пачатак;* № 12 (133). *Бітва пад Оршай: месца памяці і канфлікт інтэрпрэтацый*. Мінск 2014. С. 354–401.

[A.] Болдыраў, *Карціна „Бітва пад Оршай" і даследванне яе прыдатнасці для вывучэння гісторыі ўзбраення. Да пытання аб гістарыяграфіі легендарнага палатна* [w:] *Arche Пачатак;* № 12 (133). *Бітва пад Оршай: месца памяці і канфлікт інтэрпрэтацый*. Мінск 2014. С. 441–456.

[B.] Гуцул, *„Конно і збройно". Образи представників руських воєнних еліт на памятці станкового живопису першої третини XVI ст. „Битва під Оршею": спроба ідентифікації.* [w:] *Sredniowiecze Polskie i Powszechne.* T. 6(10). Katowice 2014. С. 334–349.

„Бітва пад Оршай" – прыдворная прапаганда ці рыцарскі эпас?"[36], у якой аўтар кажа пра неабходнасць разгляду карціны праз прызму рыцарскай культуры, пра погляд на яе як на артэфакт сымбалічнай камунікацыі. Даследчык прыходзіць да высновы, што карціна ёсць прыкладам адлюстравання рыцарскай традыцыі элітаў Польшчы і ВКЛ.

Прыгадаем яшчэ адзін артыкул аўтара „Іканаграфія харызмы: вобраз князя Канстанціна Астрожскага (1460–1530) у дакументальнай баталістыцы першай траціны XVI ст."[37], дзе ён вывучае выявы знакамітага палкаводца – у першую чаргу даследчык звяртае ўвагу на карціну „Бітва пад Оршай". Гуцул лічыць, што князь паказаны на карціне не толькі як палкаводзец, але і як рыцар, што свядома рызыкуе ўласным жыццём у баі.

Важным аспектам рыцарскай культуры з'яўляецца геральдыка – навука пра гербы. Вядучым беларускім даследчыкам геральдыкі ВКЛ Аляксеем Іванавічам Шаландай была напісана праца „Таямнічы свет беларускіх гербаў. Шляхецкая геральдыка Вялікага княства Літоўскага"[38], у якой раскрываецца сутнасць і шляхі развіцця гербаў шляхты ВКЛ. У сутнасці гэтая кніга – выклад гісторыі шляхецкай сымболікі, навуковае даследаванне геральдыкі і сфрагістыкі ВКЛ канца XIV–XVIII ст.

Паколькі тэрмін „рыцарства" уключае ў сябе вялікі дыяпазон мілітарных, культурных, побытавых аспектаў, неабходна адзначыць, што існуе вялікая колькасць даследванняў, прысвечаных тэмам, каторыя апасродкава тычыцца прадмета нашага агляда:

---

[36] У. Гуцул, *Карціна „Бітва пад Оршай" – прыдворная прапаганда ці рыцарскі эпас?* [w:] *Arche Пачатак;* № 12 (133). *Бітва пад Оршай: месца памяці і канфлікт інтэрпрэтацый*. Мінск: Гайсак 2014. С. 401–441.

[37] В. Гуцул, *Іконографія харизми: образ князя Костянтина Острозького (1460–1530) в документальній баталістиці першої третини XVI ст.* [w:] *Острозька давнина.* Вип. 3. Острiг, 2014. – С. 7–20.

[38] А.І. Шаланда, *Таямнічы свет беларускіх гербаў: шляхецкая геральдыка Вялікага княства Літоўскага*. Мінск: А. М. Янушкевіч, 2014.

мастацтва[39] [40] [41] [42] [43], прававое развіццё дзяржавы[44] [45], родавыя легенды [46], архітэктура феадальных замкаў [47] [48], пахавальная культура шляхты [49] [50] і іншае.

[39] А.А. Ярошевич, *От ренессанса к барокко: мемориальная и алтарная пластика Беларуси XVII–XVIII веков* . Минск 2019.

[40] А. К. Лявонава, *Старажытнабеларуская скульптура*. Мінск 1991.

[41] М. Матушакайте, *Литовская надгробная скульптура эпохи Ренессанса и раннего барокко* [w:] Искусство Прибалтики. Таллинн, 1981.

[42] Л. И. Тананаева, *Сарматский портрет: из истории польского портрета эпохи барокко*. Москва 1979.

[43] А. Ю. Хадыка, Ю. В. Хадыка *Непаўторныя рысы: з гісторыі беларускага партрэта*. Мінск 1992.

[44] С. Лазутка С., И. Валиконите, Э. Гудавичюс, *Первый Литовский Статут (1529 г.).* Вильнюс 2004.

[45] Я.А. Юхо, *Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: Вучэбн. дапам.* Мінск 2000.

[46] R. Petrauskas, *Socialiniai ir istoriografiniai lietuvių kilmės iš romenų teorijos aspektai* [w:] *Literatūros istorija ir jos kurėjai.* Lietuvių literatūros ir tautosakos institutas; red. S. Narbutas. Vilnius 2004. P. 270–285.

[47] М. Волкаў, *Мірскі замак у XVI–XVIII стст.: гісторыя будаўніцтва і эвалюцыя функцыянальнага прызначэння* [w:] Беларускі гістарычны часопіс. 2016. № 9. С. 29–45.

[48] Н. А. Волков, *Уподобляясь монархам: символика магнатских резиденций в Великом княжестве Литовском в конце XV – середине XVII в.* [w:] *Вызов времени: становление централизованных государств на Востоке и Западе Европы в конце XV–XVII вв*. Калуга 2019. С. 94–101.

[49] Д.В. Лісейчыкаў, *„Ходилъ до церкви и тамъ надгробокъ писаныи виделъ…» Кірылічныя надмагіллі XVI – XVII стст. на землях Вялікага Княства Літоўскага.* [w:] *Epitaphium: пахавальная культура народаў Вялікага Княства Літоўскага: зборнік артыкулаў*. Мінск 2022. С.69–102.

[50] Н.В. Стахно, *Пахавальная цырымонія эпохі барока як частка рэпрэзентацыі шляхты Вялікага Княства Літоўскага // Epitaphium: пахавальная культура народаў Вялікага Княства Літоўскага: зборнік артыкулаў.* Мінск 2022. С.121–131.

Старажытнарускія дружыннікі. Рыцарства Ордэна і Польшчы.

На наш погляд пры вывучэнні рыцарства ў ВКЛ нельга забывацца на старажытнарускіх дружыннікаў, бо гэты прывіліяваны пласт сярэднявечнага грамадства пры стварэнні Літоўскай дзяржавы нікуды не знік, а з часам уліўся ў шляхецкі стан. Для нас уяўляе цікавасць пытанне – а наколькі блізкімі была ідэалогія, культура, сацыяльнае становішча старажытнарускай дружыны і еўрапейскага рыцарства? Адным з першых яго падымае Мікалай Дашкевіч у сваёй працы „Рыцарства на Русі". Аўтар звяртае ўвагу на тое, што розныя народы і культуры мелі такі пласт, які ў заходнееўрапейскай культуры называецца рыцарствам – на Русі яму адпавядаюць дружыннікі. Аналізуючы дакументальныя крыніцы і паэтычную спадчыну Русі, Дашкевіч прыходзіць да высновы, што ў рускіх эліт былі падобныя да рыцарскіх погляды на воінскі гонар і славу. Таксама ён звяртае ўвагу на тое, што ў старажытнарускую эпоху ішоў працэс пранікнення заходнееўрапейскай, у тым ліку рыцарскай, культуры на Русь. З аднаго боку яна пранікла з поўначы – з Ноўгарада Вялікага праз стасункі з паўночнаеўрапейскімі краінамі, з іншага – з Польшчы, Вугоршчыны, Чэхіі. Эліты Русі былі знаёмыя з рыцарскай паэзіяй, турнірамі, феноменам крыжовых паходаў, але пры тым, як піша Дашкевіч, заходнееўрапейскае рыцарства і старажытнаруская дружына ўсё ж не былі адным і тым жа.

Падрабязна вывучаецца ідэалогія дружыны ў кнізе сучаснага расійскага гісторыка Аляксандра Мусіна „Milites Christi Старажытнай Русі. Вайсковая культура рускага Сярэднявечча ў кантэксце рэлігійнага менталітэту"[51]. Мэта працы – рэканструкцыя суадносін вайсковага і рэлігійнага кампанентаў у рускай культуры X–XVI ст. Навуковая праца, сабрала вядомыя на сённяшні дзень навуковыя звесткі, якія тычацца дадзенай праблемы. Кніга раскрывае гіста-

[51] А.Е. Мусин, *Milites Christi Древней Руси: воинская культура русского Средневековья в контексте религиозного менталитета*. Санкт-Петербург 2005.

рычны менталітэт старажытнарускага грамадства, апісвае ідэалогію „дружыны Гасподняй", дэманструе эвалюцыю адносін старажытнарускага чалавека да зброі і вайсковай службы. Гэтая праца дазваляе правесці паралелі паміж ідэалогіяй заходнееўрапейскага рыцарства і старажытнарускай дружыны, вылучыць падобныя рысы ў вайсковай культуры, хоць аўтар і кажа, што дружыннікаў можна назваць рыцарамі з вялікай доляй умоўнасці.

Яшчэ адна важная праца, якую неабходна прыгадаць гэта артыкул беларускага гісторыка Піліпа Падбярозкіна „Ці можа „схізматык" быць рыцарам? Статус рускага воіна ў лівонскіх хроніках XIII ст."[52] У артыкуле разглядаецца пытанне аб прымяненні канцэпта рыцарства ў адносінах да рускіх воінаў у кантэксце руска-лівонскіх адносін XIII ст. Аўтар звяртаецца да тэкстаў „Хронікі Лівоніі" Генрыха Латвійскага і "Лівонскай Старэйшай рыфмаванай хронікі", а таксама з дапамогай параўнальнага аналізу сюжэтаў еўрапейскага рыцарскага эпасу робіць спробу вызначыць статус рускіх воінаў, з пункту гледжання Рыжскай царквы і братоў ордэна. Аналізуючы сюжэты рыцарскага эпасу, лівонскіх хронік і рускага летапісання ўдалося выявіць куртуазныя практыкі і літаратурныя матывы ў лівонскіх і рускіх крыніцах XIII ст.: дараванне турнірных коняў, захаванне прынцыпаў fair play, інстытут закладніцтва, васальныя звычаі, рыцарскі візіт прэстыжу. Даследчык прыходзіць да высновы, што еўрапейскі канцэпт рыцарства можа прымяняцца ў дачыненні да рускіх воінаў у кантэксце руска-лівонскіх стасункаў у XIII ст.

Пытанне турнірных практык на Русі падымае П. Васін у артыкуле „Ігрушкі рускіх князёў"[53]. Аўтар сцвярджае, што на Русі мелі распаўсюд воінскія турнірныя ігры, якія называліся „іграмі" альбо „ігрушкамі". Васін падкрэслівае, што „ігры" істотна адрозніваліся

---

[52] Ф.Д. Подберезкин, *Может ли «схизматик» быть рыцарем? Статус русского воина в ливонских хрониках XIII в.* [w:] *Александр Невский: личность, эпоха, историческая память. К 800-летию со дня рождения. Материалы международной научной конференции (25-27 мая 2021 г., Москва, Россия)*. С. 259–268.

[53] П. Васин, *Игрушки русских князей* [w:] Родина. 2003, № 11. С.106–110.

ад заходнееўрапейскіх турніраў – для Русі не быў характэрны інстытут герольдаў, не было спецыяльнага зводу правілаў, турнірнай зброі і т.д. Аўтар лічыць, што з'яўленне воінскіх забаваў на Русі было абумоўлена заходнім уплывам. Больш за тое былі прэцэдэнты, калі прадстаўнікі рускіх эліт удзельнічалі ў падобных „іграх" змагаючыся супраць польскіх і ўгорскіх рыцараў. Такім чынам турнірныя практыкі не былі чымсьці невядомым для Старажытнай Русі.

У артыкуле расійскага гісторыка Уладзіслава Назарава „Этас служылага баярства на Русі XIII – XV ст. (да пытання аб паралелях з еўрапейскім рыцарствам)"[54], аўтар спрабуе вылучыць шэраг прыкметаў заходнееўрапейскага рыцара, а пасля тлумачыць на колькі рускі баярын ім адпавядаў. Нягледзячы на наяўнасць частковага падабенства ў сацыяльнай трансфармацыі рускага служылага баярства і еўрапейскага рыцарства, Назараў прыходзіць да высновы, што праз асаблівасці сацыяльна-эканамічнага развіцця Русі (у першую чаргу аўтар звяртае ўвагу на Паўночна-Усходнюю Русь) рыцарства ў гэтым рэгіёне не сфармавалася.

У артыкуле „Таранны бой у сярэднявечнай Русі" Уладзімір Гуцул вылучае такую важную рысу заходнееўрапейскага рыцарства, як выкарыстанне тараннага боя. Аўтар лічыць, што таранны бой быў не толькі важным баявым тактычным сродкам феадальнай вайны, але і сур'ёзным культурным фактарам. Гуцул паспрабаваў разгледзіць праблему бытавання тараннага бою на тэрыторыі сярэднявечнай Русі ў кантэксце цывілізацыі сярэднявечнага Захаду. Вывучэнне тэкставых, візуальных і рэчавых крыніц дазволіла аўтару прыйсці да высновы, што тэхніка тараннага бою ў сярэднявечнай Русі адпавядала заходнееўрапейскім практыкам.[55]

---

[54] В. Д. Назаров, *Этос служилого боярства на Руси XIII–XV вв. (к вопросу о параллелях с европейским рыцарством)* [w:] *Долгое Средневековье. Сборник в честь профессора А. А. Сванидзе*. М., 2011. С. 178–189.

[55] В. Гуцул, *Таранный бой в Седневековой Руси* [w:] *Colloquia Russica. Series I,* vol. 5. *Rus' and Central Europe from the 11th to the 14th Century.* Krakow – Bratislava *2015*. С. 199–215.

Падобные погляды сустракаюцца і ў іншай ягонай рабоце – „Рыцары Данілы Раманавіча. Рыцарская зброя сярод персанажаў Галіцка-Валынскага летапіса”[56]. Аўтар прыходзіць да высноў, што тэкст летапісу дае прамыя падставы гаварыць аб наяўнасці сярод згаданых у ім персанажаў „рыцарскага мілітарнага трэнду”. Выражаецца гэты трэнд у практыцы выкарыстання зброі: мячоў, коп’яў, суліц, якая адпавядала заходнееўрапейскаму рыцарскаму мілітарнаму мастацтву. Агулам неабходна адзначыць, што рысай Уладзіміра Гуцула як даследчыка вайсковай гісторыі Русі ёсць вялікая ўвага да тэхнічнага, мілітарнага (зброя і практыка боя) складніка прадмета даследвання.

Іншы ўкраінскі медыявіст – Леонці Вайтовіч у артыкуле „Праблемы гістарычнай тэрміналогіі сярэднявечнай Русі: дружынная дзяржава, феадалізм, княства, воласць, лен, кармленне, вотчына” падымае праблему ўжывання агульнаеўрапейскіх тэрмінаў у адносінах да гісторыі Старажытнай Русі[57]. У прыватнасці мы сустракаем думку пра адпаведнасць старажытнарускіх тэрмінаў „детескі”, „отроки”, „гриді” заходнееўрапейскім пажам, пахалкам, рыцарам. Да таго ж аўтар арыентуе чытача на вялікі корпус крыніц да тэмы гонару і прысягі ў дружынным асяроддзі.

Суседства з Нямецкім Ордэнам і Польскім Каралеўствам адыгравала вялікае значэнне ў знаёмстве эліт ВКЛ з рыцарскай культурай. Вывучаючы феномен рыцарства ў Княстве неабходна валодаць ведамі па гісторыі польскага і балтыйскага рыцарства. Паспрабуем коратка расказаць пра некаторыя працы, што даюць ўяўленне аб сутнасці рыцараў-”суседзяў” Літвы. Праца нямецкага гісторыка Хартмута Бокмана „Нямецкі ордэн: дванаццаць главаў з яго гісто-

---

[56] В. Гуцул, *Рицарі Данила Романовича. Рицарська зброя серед персонажів галицько-волинсько літопису* [w:] *Спеціальні історичні дістципліни*. Нац. акад. наук України, Ін-т історії України. Вип. 16. 2009. С. 78–91.

[57] Л. Войтович, *Проблеми історичної термінології середньовічної Русі: дружинна держава, феодалізм, князівство, волость, лен, кормління, вотчина.* [w:] *Colloquia russica.* Series II, Vol. 4. *Середньовічна Русь: Проблеми термінології.* Івано-Франківськ–Краків 2018. С. 9–21.

рыі”[58], якая абапіраецца на вялікую колькасць сярэднявечных крыніц, прысвечана гісторыі Нямецкага ордэна ад яго заснавання на Святой зямлі ў канцы XII стагоддзя да навейшага часу. Асобныя главы кнігі расказваюць пра няпростыя адносіны Ордэна з Літоўскай, а пасля і Літоўска-Польскай дзяржавай. Другая праца якую хацелася б прыгадаць – „Лівонія і Русь у XIII ст.”[59] эстонскага даследчыка Анці Селарта. Манаграфія з’яўляецца даследаваннем адносін крыжакоў з Руссю. У ёй разглядаюцца галоўныя праблемы гэтага перыяду ў адносінах нямкціх рыцараў і рускіх княстваў на фоне шырокага кантэкста гісторыі крыжовых паходаў, гісторыі Усходняй і Паўночнай Еўропы ў цэлым. Для нас важна, што вялікую частку даследвання займаюць адносіны рыцараў з Паўночна-заходняй Руссю і Літвой.

Артыкул нямецкага гісторыка Вернера Паравічыні „Літовец: ад праціўніка-язычніка да шляхетнага вяльможы”[60] расказвае пра тое, як змяняўся вобраз літоўца ў вачах крыжаносцаў на працягу XIV–XV ст. Змены ў стаўленні да элітаў ВКЛ, як лічыць Паравічыні, суправаджалася паступовай вестэрнізацыяй літоўскай шляхты, працэсам далучэння яе да еўрапейскай культуры.

Зноў узгадаем імя Рымвідаса Пятраўскаса, які шчыльна займаўся тэматыкай стасункаў крыжакоў з ВКЛ. У сваіх артыкулах[61] [62] [63]

---

[58] Х. Бокман, *Немецкий орден: двенадцать глав из его истории*. Москва 2004..

[59] Selart A. *Livland und dir Rus’ im 13. Jahrhundert* . Köln; Weimar; Wien 2007.

[60] W. Paravicini, *Litauer: vom heidnischen Gegner zum adligen Standesgenossen* [w:] *Tannenberg – Grunwald – Žalgiris 1410: Krieg und Frieden im späten Mittelalter Herausgegeben von Werner Paravicini, Rimvydas Petrauskas und Grischa Vercamer*. Harrassowitz Verlag. Wiesbaden 2012.

[61] R. Petrauskas, *Litauen und der Deutsche Orden: Vom Feind zum Verbündeten* [w:] *Tannenberg – Grunwald – Žalgiris 1410: Krieg und Frieden im späten Mittelalter Herausgegeben von Werner Paravicini, Rimvydas Petrauskas und Grischa Vercamer*. Wiesbaden 2012.

[62] R. Petrauskas, *Der Frieden im Zeitalter des Krieges: Formen friedlicher Kommunikation zwischen dem Deutschen Orden und dem Großfürstentum Litauen zu Beginn des 15. Jahrhunderts* [w:] *Annaberger Annalen über Litauen und deutsch-litauische Beziehungen. 2004, Nr. 12.* P. 28–42.

[63] Р. Пятраўскас, *Фармаванне інстытуцыйнага двара вялікага князя ў Літве (XIV – пачатак XV ст.)* [w:] *Arche № 9 (84). 2009. Літва і Беларусь: тысяча год разам*. Мінск 2009. С. 39–71.

ён падымаў не толькі праблемы міжнародных адносінаў, але і пытанне культурнага, інстытуцыянальнага ўплыву Ордэна на Літву.

Звяртаючыся да гісторыі польскага рыцарства ўзгадаем працу Дарыюша Піваварчыка „Рыцарскі звычай у познесярэднявечнай Польшчы (XIV–XV ст.)"[64], якая акрамя гісторыі падрабязна расказвае пра розныя формы рыцарскай культуры, такія як рыцарскія касцюмы, турніры, паляванне, правілы паводзін, ідзе параўнанне з заходнееўрапейскім рыцарствам.

Некалькі словаў хацелася б сказаць пра зборнік навуковых артыкулаў „Рыцарскі этас у культуры. Традыцыі і працяг". Шматаўтарская манаграфія прадстаўляе міждысцыплінарны падыход да рыцарскага этасу, які склаўся ў Сярэднявеччы, традыцыя якога культывавалася ў розных сферах жыцця ад першых стагоддзяў да нашых дзён як у Еўропе, так і ў іншых краінах. Аўтары шэрагу навуковых артыкулаў, сабраных у манаграфіі, з'яўляюцца даследчыкамі розных галін: гісторыкамі, літаратуразнаўцамі, культуролагамі. Сярод іх вылучым артыкулы Агнешкі Тэтэрыч-Пузё „Воін, абаронца веры і прыгнечаных? Рыцарскія ўзоры ў святле сярэднявечных апавяданняў"[65] і Агнешкі Клавіноўскай „Грамадства страху? Паводзіны, неадпаведныя рыцарскаму этасу ў найстарэйшых польскіх хроніках"[66], якія на аснове гістарычных крыніцаў апісваюць ідэал польскага рыцара і ягоную адпаведнасць/неадпаведнасць уяўнаму вобразу.

---

[64] D. Piwowarczyk, *„Obyczaj rycerski w Polsce późnośredniowiecznej (XIV–XV wiek)".* Warszawa 2006.

[65] A. Teterycz-Puzio, *Wojownik, obrońca wiary i uciśnionych? Wzorce rycerskie w świetle średniowiecznych przekazów narracyjnych* [w:] *Ethos rycerski w kulturze. Tradycje i kontynuacje. T.1. W kręgy średniowiecza* – Uniwersytet Śląski 2017. S.151–184.

[66] A. Klawinowska, *Społeczeństwo trwogi? Zachowania niezgodne z ethosem rycerskim w najstarszych kronikach polskich* [w:] *Ethos rycerski w kulturze. Tradycje i kontynuacje.* T. 1. *W kręgy średniowiecza.* Uniwersytet Śląski 2017. S.184–203.

Высновы

Можна сказаць, што на дадзены момант створаны пэўны корпус навуковых тэкстаў, прысвечаных феномену рыцарства ў Вялікім Княстве Літоўскім. Упершыню гэтая праблема падымаецца ў працах дарэвалюцыйных расійскіх гісторыкаў на пачатку XX ст., у асаблівасці неабходна адзначыць даследванне Мікалая Дашкевіча „Рыцарства на Русі". У канцы XX – пачатку XXI ст. рэй у даследванні рыцарства бяруць літоўскія гісторыкі, якімі быў створаны шэраг навуковых артыкулаў. Сярод беларускіх гісторыкаў гэтая тэма не карыстаецца вялікай папулярнасцю і адзіным даследчыкам, які звярнуўся (першае дзесяцігоддзе XXI ст.) да такога аспекта рыцарскай культуры як турнір, быў Юрый Бохан.

На пачатак трэцяга дзесяцігоддзя XXI ст. навуковай супольнасцю створаны пласт навуковых даследванняў, прысвечаных як рыцарству наогул, так і рыцарству рэгіёна Цэнтральна-Усходняй Еўропы. Неабходна адзначыць, што вывучэнне феномена рыцарства ў рэгіёне актывізавалася пасля распаду СССР, з атрыманнем свабоды ў выбары тэмаў і метадалогіі даследванняў. Акрамя наратыву, прысвечанаму непасрэдна тэме рыцарства ў апошнія дзесяцігоддзі была створана вялікая колькасць навуковых работаў, якія падымаюць розныя аспекты рыцарскай культуры: побыт, зброя, замкавае будаўніцтва, пахавальная культура, мастацтва.

Пры параўнанні заходнееўрапейскай і рэгіянальнай гістарыяграфію адзначым, што заходнееўрапейскай гістарычная навука даволі глыбака вывучыла феномен рыцарства ва ўсіх ягоных праўленнях і акрамя спецыяльных даследванняў, быў створаны корпус аб'ёмных агульных прац. Гістарычная навука краінаў былога ВКЛ, на жаль, такім узроўнем вывучэння праблемы пахваліцца не можа праз шэраг фактараў: доўгае панаванне ідэалогіі ў навуцы і разгляд дадзенай тэмы як перыферыйнай. На сённяшні дзень рэгіянальная гістарыяграфія абмежавана даволі невялікай колькасцю артыкулаў па тэме рыцарства, аднак цікавасць да праблемы ёсць і гэта дае надзею на працяг працы даследчыкаў у дадзеным кірунку.

Бібліяграфія

Antanaitis K. *Riterijos apraiškos Lietuvoje 14–16 amžiais* [w:] *Darbai ir Dienos Nom 5(14).* Kaunas, 1997. p. 125–142.

Bohan Yu.M. Skep'yan A.A. *Pobyt feadalau Vyalikaga Knyastva Litouskaga u XV – syaredzine XVII stagoddzya.* Minsk: Belarus, 2011.[Бохан Ю.М. Скеп'ян А.А. *Побыт феадалаў Вялікага Княства Літоўскага ў XV – сярэдзіне XVII стагоддзя*. Мінск: Беларусь, 2011].

Bohan Yu.M. *Turnirnyya tradycyi u Vyalikim knyastve Litouskim u XIV–XVI stagoddzyah.* Minsk: I. P. Logvinau, 2008. [Бохан Ю.М. *Турнірныя традыцыі ў Вялікім княстве Літоўскім у XIV–XVI стагоддзях*. Мінск: І. П. Логвінаў, 2008].

Bohan Yu.M. *Uzbraenne naselnictva belaruskih zyamel u XIV– XVI stagoddzyah.* Minsk: Belarus, 2012.[Бохан Ю.М. *Узбраенне насельніцтва беларускіх зямель у XIV– XVI стагоддзях*. Мінск: Беларусь, 2012].

Bokman H. *Nemeckij orden: dvenadcat glav iz ego istorii*. Moskva: Ladomir, 2004. [Бокман Х. *Немецкий орден: двенадцать глав из его истории.* Москва: Ладомир, 2004].

Boldyrau A. *Karcina „Bitva pad Orshaj" i dasledvanne yae prydatnasci dlya vyvuchennya gistoryi uzbraennya. Da pytannya ab gistaryyagrafii legendarnaga palatna* [w:] *Arche Pachatak;* № 12 (133). *Bitva pad Orshaj: mesca pamyaci i kanflikt interpretacyj*. Minsk: Gajsak, 2014. C. 441–456. [Болдыраў А. *Карціна „Бітва пад Оршай" і даследванне яе прыдатнасці для вывучэння гісторыі ўзбраення. Да пытання аб гістарыяграфіі легендарнага палатна* [w:] *Arche Пачатак;* № 12 (133). *Бітва пад Оршай: месца памяці і канфлікт інтэрпрэтацый.* Мінск: Гайсак, 2014. С. 441–456].

Brazgunou A.U. *Perakladny rycarski i gistarychny raman Belarusi XV–XVI stst.: eurapejski kantekst, transfarmacyya i evalyucyya zhanru: Autaref. dys. na atrymanne vuchon. stup. kand. filal. navuk*: 10.01.01.Minsk, 2002.[Бразгуноў А.У. *Перакладны рыцарскі і гістарычны раман Беларусі XV–XVI стст.: еўрапейскі кантэкст, трансфармацыя і эвалюцыя жанру: Аўтарэф. дыс. на атрыманне вучон. ступ. канд. філал. навук*: 10.01.01.Мінск, 2002].

Bumke J. *The Concept of Knighthood in the Middle Ages*. New York, 1982.

Dashkevich N. P. *Rycarstvo na Rusi – v zhizni i poezii: [rech, proiznesennaya 27 oktyabrya 1899 g.].* Kiev, 1902. [Дашкевич Н. П. *Рыцарство на Руси– в жизни и поэзии: [речь, произнесенная 27 октября 1899 г.*]. Киев, 1902].

Dzhons R. *Istoriya rycarstva*. Moskva: Eksmo, 2014. [Джонс Р. *История рыцарства*. Москва: Эксмо, 2014].

Flori Zh. *Ideologiya mecha: Predystoriya rycarstva.* SPb.: Izd. gruppa «Evraziya», 1999. [Флори Ж. Идеология меча: Предыстория рыцарства. СПб.: Изд. группа «Евразия», 1999].

Flori Zh. *Povsednevnaya zhizn rycarej v Srednie veka: [perevod s francuzskogo]*. Moskva: Molodaya gvardiya, 2006.[Флори Ж. *Повседневная жизнь рыцарей в Средние века: [перевод с французского*]. Москва: Молодая гвардия, 2006].

Gucul U. *Karcina „Bitva pad Orshaj" – prydvornaya prapaganda ci rycarski epas?* [w:] Arche Pachatak; № 12 (133). *Bitva pad Orshaj: mesca pamyaci i kanflikt interpretacyj*. Minsk: Gajsak, 2014. C. 401–441. [*Гуцул У. Карціна „Бітва пад Оршай" – прыдворная прапаганда ці рыцарскі эпас?* [w:] *Arche Пачатак;* № 12 (133). *Бітва пад Оршай: месца памяці і канфлікт інтэрпрэтацый.* Мінск: Гайсак, 2014. С. 401–441].

Gucul V. *„Konno i zbrojno". Obrazy predstavnykiv ruskyh voyennyh elit na pamyatci stankovogo zhyvopysu pershoyi tretyny XVI st. „Bitva pid Orsheyu": sproba identyfikaciyi*. [w:] S*redniowiecze Polskie i Powszechne. T.6(10)*. Katowice: Wydawnictwo Uniwersytetu Slaskiego, 2014. C. 334–349. [Гуцул В. *„Конно і збройно". Образи представників руських воєнних еліт на памятці станкового живопису першої третини XVI ст. „Битва під Оршею": спроба ідентифікації.* [w:] *Sredniowiecze Polskie i Powszechne. T.6(10).* Katowice: Wydawnictwo Uniwersytetu Slaskiego, 2014. C. 334–349].

Gucul V. *Ikonografiya harizmi: obraz knyazya Kostyantyna Ostrozkogo (1460–1530) v dokumentalnij batalistyci pershoyi tretyny XVI st*. [w:] *Ostrozka davnyna.* Vip. 3. Ostrig, 2014. – S. 7–20. [Гуцул В. *Іконографія харизми: образ князя Костянтина Острозького (1460–1530) в документальній баталістиці першої третини XVI ст*. [w:] *Острозька давнина. Вип. 3.* Острiг, 2014. – С. 7–20].

Gucul V. *Rytsari* Danyla Romanovycha. Rytsarska zbroia sered personazhiv halytsko-volynsko litopysu [w:] *Spetsialni istorychni disttsypliny. Nats. akad. nauk Ukrainy, In-t istorii Ukrainy.* Vyp. 16. 2009. S. 78–91. [Гуцул В. *Рицарі Данила Романовича. Рицарська зброя серед персонажів галицько-волинсько літопису* [w:] *Спеціальні історичні дістципліни. Нац. акад. наук України, Ін-т історії України. Вип. 16.* 2009. С. 78–91].

Gucul V. *Tarannyj boj v Sednevekovoj Rusi* [w:] *Colloquia Russica.* Series I, vol. 5. *Rus' and Central Europe from the 11th to the 14th Century.* Krakow – Bratislava, 2015. C. 199–215. [Гуцул В. *Таранный бой в Седневековой Руси* [w:] *Colloquia Russica.* Series I, vol. 5. *Rus' and Central Europe from the 11th to the 14th Century*. Krakow – Bratislava, 2015. C. 199–215].

Gudavichyus E. *Istoriya Litvy.* T. I: *s drevnejshih vremen do 1569 goda* / nauch. Red. E. L. Nazarova; per. G. I. Efremova. M.: fond im. I. D. Sytina. – Baltrus,

2005. [Гудавичюс Э. *История Литвы.* Т. I: *с древнейших времен до 1569 года* / науч. Ред. Е. Л. Назарова; пер. Г. И. Ефремова. М.: фонд им. И. Д. Сытина. – Baltrus, 2005].

Gudavičius E. *Lietuvių pašauktinės kariuomenės organizacijos bruožai* [w:] *Karo archyvas.* T. 13. Vilnius, 1992. p. 43–118.

Gudavičius E., Lazutka S. *Riteriai* [w:] *Lietuvos istorijos metraštis. 1980 metai*. – Vilnius, 1981. p. 105–109.

Gustynskaya letopis / Ros. akad. nauk, In-t rus. lit. (Pushkin. dom). SPb.: Dmitrij Bulanin, 2003. (*Polnoe sobranie russkih letopisej;* T. 40). S. 125. [*Густынская летопись* / Рос. акад. наук, Ин-т рус. лит. (Пушкин. дом). СПб.: Дмитрий Буланин, 2003. (*Полное собрание русских летописей;* Т. 40). С. 125].

Hadyka A. Yu., Hadyka Yu. V. *Nepautornyya rysy: z gistoryi belaruskaga partreta*. Minsk: Navuka i tehnika, 1992. [Хадыка А. Ю., Хадыка Ю. В. *Непаўторныя рысы: з гісторыі беларускага партрэта*. Мінск: Навука і тэхніка, 1992].

Hejzinga J. *Osen Srednevekovya*. Sankt-Peterburg: Azbuka, 2022. [Хейзинга Й. *Осень Средневековья.* Санкт-Петербург: Азбука, 2022].

Janicki M. *Obraz Bitwa pod Orszą – geneza, datowanie, wzory graficzne a obraz bitwy „na Kropiwnej" i inne przedstawienia batalistyczne w wileńskim pałacu Radziwiłłów* [w:] *Bitwa pod Orszą,* red. M. Nagielski. Warszawa, 2015.

Kananovich U. *„Pahvala knyazya Kanstancina Astrozhskaga yak krynica dlya vyvuchennya identychnasci pravaslaunaj elity VKL pachatku XVI stagoddzya*" [w:] *Arche Pachatak;* № 12 (133)*. Bitva pad Orshaj: mesca pamyaci i kanflikt interpretacyj.* Minsk: Gajsak, 2014. С. 736–752. [Кананович У. *„Пахвала князя Канстанціна Астрожскага як крыніца для вывучэння ідэнтычнасці праваслаўнай эліты ВКЛ пачатку XVI стагоддзя"* [w:] *Arche Пачатак;* № 12 (133). *Бітва пад Оршай: месца памяці і канфлікт інтэрпрэтацый*. Мінск: Гайсак*,* 2014. С. 736–752].

Karpovich G. A. *Knizhna-epigramatychnaya paeziya Vyalikaga Knyastva Litouskaga XVI st. u kanteksce antychnaj tradycyi.* Instytut Slavyanskaj Filalogii Universiteta Maryi Kyury-Skladoŷskaj u Lyubline, Polski Instytut u Minsku. Minsk: Knigazbor, 2012. [Карповіч Г. А. *Кніжна-эпіграматычная паэзія Вялікага Княства Літоўскага XVI ст. у кантэксце антычнай традыцыі.* Інстытут Славянскай Філалогіі Універсітэта Марыі Кюры-Складоўскай у Любліне, Польскі Інстытут у Мінску. Мінск: Кнігазбор, 2012].

Kavalyou S.V. *Geroika-epichnaya paeziya Belarusi i Litvy kanca XVI st*. Minsk: Universiteckae, 1993. [Кавалёў С.В. *Героіка-эпічная паэзія Беларусі і Літвы канца XVI ст.* Мінск: Універсітэцкае, 1993].

Kavalyou S.V. *Litaratura Vyalikaga Knyastva Litouskaga XVI – pachatku XVII st.: fenomen kulturnaga pamezhzha.* Minsk: Knigazbor, 2011. [Кавалёў С.В. *Літаратура Вялікага Княства Літоўскага XVI – пачатку XVII ст.: феномен культурнага памежжа*. Мінск: Кнігазбор, 2011].

Kavalyou S.V. Shmatmounaya paeziya Vyalikaga Knyastva Litouskaga epohi Renesansu. Minsk: Knigazbor, 2010. [Кавалёў С.В. *Шматмоўная паэзія Вялікага Княства Літоўскага эпохі Рэнесансу.* Мінск: Кнігазбор, 2010].

Kiaupiene J. *„Mes, Lietuva" Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės bajorija XVI a. (viešasis ir privatus gyvenimas)".* – Vilnius: Kronta, 2003.

Kiaupiene J. *Kunigaikštystės riterio vaizdinys Motiejaus Stryjkovskio tekstuose', Kultūrų sankirtos. Skiriama doc. dr. Ingės Lukšaitės 60-mcčiui,* cd. Z. Kiaupa et al. Vilnius, 2000 , p. 117–141.

Kin M. *Rycarstvo.* Moskva: Nauch. mir, 2000. [Кин М. *Рыцарство.* Москва: Науч. мир, 2000].

Klawinowska A. *Społeczeństwo trwogi? Zachowania niezgodne z ethosem rycerskim w najstarszych kronikach polskich* [w:] *Ethos rycerski w kulturze. Tradycje i kontynuacje.* T. 1. *W kręgy średniowiecza.* Uniwersytet Śląski, 2017. S.184–203.

Klimuc L.Ya. *Sarmackaya kultura belaruskaj shlyahty ў XVI–XVIII stagoddzyah.* Minsk: Belarus, 2013. [Клімуць Л.Я. *Сармацкая культура беларускай шляхты ў XVI–XVIII стагоддзях.* Мінск: Беларусь, 2013].

Lazutka S., Valikonite I., Gudavichyus E. *Pervyj Litovskij Statut (1529 g.).* Vilnyus: Izdatelstvo Margi Rashtaj, 2004. [Лазутка С., Валиконите И., Гудавичюс Э. *Первый Литовский Статут (1529 г.).* Вильнюс: Издательство Марги Раштай, 2004].

Leontovich F.I. *Boyare i sluzhilye lyudi v Litovsko-Russkom gosudarstve* [w:] *Zhurnal ministerstva yusticii.* № 15. 1907. [Леонтович Ф.И. *Бояре и служилые люди в Литовско-Русском государстве* [w:] *Журнал министерства юстиции*. *№15.* 1907].

Leontovich F.I. *Pravosposobnost litovsko-russkoj shlyahty* [w:] *Zhurnal ministerstva narodnogo prosvesheniya. Novaya seriya.* Ch. 15. 1908. [Леонтович Ф.И. *Правоспособность литовско-русской шляхты* [w:] *Журнал министерства народного просвещения. Новая серия.* Ч. 15. 1908].

Leskinen M. V. *Mify i obrazy sarmatizma. Istoki nacionalnoj ideologii Rechi Pospolitoj.* Moskva: Institut slavyanovedeniya RAN, 2002. *[Лескинен М. В. Мифы* и образы сарматизма. Истоки национальной идеологии Речи Посполитой. Москва: Институт славяноведения РАН, 2002].

Lisejchykau D.V. „*Hodil do cerkvi i tam nadgrobok pisanyi videl…" Kirylichnyya nadmagilli XVI – XVII stst. na zemlyah Vyalikaga Knyastva Litouskaga*. [w:]

Epitaphium: pahavalnaya kultura narodau Vyalikaga Knyastva Litouskaga: zbornik artykulau. Minsk: NGAB, 2022. С.69–102. [Лісейчыкаў Д.В. *„Ходилъ до церкви и тамъ надгробокъ писаныи виделъ…" Кірылічныя надмагіллі XVI – XVII стст. на землях Вялікага Княства Літоўскага*. [w:] *Epitaphium: пахавальная культура народаў Вялікага Княства Літоўскага: зборнік артыкулаў*. Мінск: НГАБ, 2022. С.69–102].

Lyavonava A. K. *Starazhytnabelaruskaya skulptura.* Minsk: Navuka i tehnika, 1991. [Лявонава А. К. *Старажытнабеларуская скульптура.* Мінск: Навука і тэхніка, 1991].

Lyubavskij M.K. *Litovsko-russkij sejm: opyt po istorii uchrezhdeniya v svyazi s vnutrennim stroem i vneshnej zhiznyu gosudarstva.* Moskva, 1900. [Любавский М.К. *Литовско-русский сейм: опыт по истории учреждения в связи с внутренним строем и внешней жизнью государства.* Москва, 1900].

Lyubavskij M.K. *Ocherk istorii Litovsko-Russkogo gosudarstva do Lyublinskoj unii vklyuchitelno: s prilozheniem teksta hartij, vydannyh Velikomu knyazhestvu Litovskomu i ego oblastyam.* Moskva: Moskovskaya hudozhestvennaya pechatnya, 1915. [Любавский М.К. *Очерк истории Литовско-Русского государства до Люблинской унии включительно: с приложением текста хартий, выданных Великому княжеству Литовскому и его областям.* Москва: Московская художественная печатня, 1915].

Matushakajte, M. *Litovskaya nadgrobnaya skulptura epohi Renessansa i rannego barokko* [w:] *Iskusstvo Pribaltiki.* Tallinn, 1981. [Матушакайте, М. *Литовская надгробная скульптура эпохи Ренессанса и раннего барокко* [w:] *Искусство Прибалтики*. Таллинн, 1981].

Musin, A. E. *Milites Christi Drevnej Rusi: voinskaya kultura russkogo Srednevekovya v kontekste religioznogo mentaliteta* . Sankt-Peterburg: Peterburgskoe vostokovedenie, 2005. [Мусин, А. Е. *Milites Christi Древней Руси: воинская культура русского Средневековья в контексте религиозного менталитета* . Санкт-Петербург: Петербургское востоковедение, 2005].

Nazarov V. D. *Etos sluzhilogo boyarstva na Rusi XIII–XV vv. (k voprosu o parallelyah s evropejskim rycarstvom)* [w:] *Dolgoe Srednevekove. Sbornik v chest professora A. A. Svanidze*. Moskva, 2011. S. 178–189. [Назаров В. Д. *Этос служилого боярства на Руси XIII–XV вв. (к вопросу о параллелях с европейским рыцарством)* [w:] *Долгое Средневековье. Сборник в честь профессора А. А. Сванидзе*. Москва, 2011. С. 178–189].

Nekrashevich-Karotkaya Zh.V. *Belaruskaya lacinamounaya paema: pozni Renesans i rannyae Baroka.* Minsk: Belaruski dzyarzhauny universitet, 2011. [Некрашэвіч-Кароткая Ж.В. *Беларуская лацінамоўная паэма: позні*

Рэнесанс і ранняе Барока. Мінск: Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, 2011].

Nekrashevich-Karotkaya Zh.V. *Belaruskaya lacinamounaya paeziya: ranni Renesans.* Minsk: Belaruski dzyarzhauny universitet, 2009. [Некрашэвіч-Кароткая Ж.В. *Беларуская лацінамоўная паэзія: ранні Рэнесанс*. Мінск: Беларускі дзяржаўны універсітэт, 2009].

Nikžentaitis *A. XIII–XV a. lietuvių kariuomenės bruožai (organizacija, taktika, papročiai)* [w:] *Karo archyvas.* T. 13. 1992. p. 3–33.

Paravicini W. *Litauer: vom heidnischen Gegner zum adligen Standesgenossen* // *Tannenberg – Grunwald – Žalgiris 1410: Krieg und Frieden im späten Mittelalter Herausgegeben* von Werner Paravicini, Rimvydas Petrauskas und Grischa Vercamer. Harrassowitz Verlag. Wiesbaden, 2012.

Petrauskas R. *Der Frieden im Zeitalter des Krieges: Formen friedlicher Kommunikation zwischen dem Deutschen Orden und dem Großfürstentum Litauen zu Beginn des 15. Jahrhunderts* [w:] *Annaberger Annalen über Litauen und deutsch-litauische Beziehungen*. 2004, Nr. 12. p. 28–42.

Petrauskas R. *Knighthood in the Grand Duchy of Lithuania from the late fourteenth to the early sixteenth centuries* [w:] *Lithuanian Historical studies II*, 2006. p. 39–66.

Petrauskas R. *Litauen und der Deutsche Orden: Vom Feind zum Verbündeten* [w:] *Tannenberg – Grunwald – Žalgiris 1410: Krieg und Frieden im späten Mittelalter Herausgegeben* von Werner Paravicini, Rimvydas Petrauskas und Grischa Vercamer. Harrassowitz Verlag. Wiesbaden, 2012.

Petrauskas, R. *Socialiniai ir istoriografiniai lietuvių kilmės iš romenų teorijos aspektai* [w:] *Literatūros istorija ir jos kurėjai.* Lietuvių literatūros ir tautosakos institutas; red. S. Narbutas. Vilnius, 2004. P. 270–285.

Piwowarczyk D. *„Obyczaj rycerski w Polsce późnośredniowiecznej* (XIV–XV wiek)".Warszawa: Wydawnictwo DiG, 2006.

Podberezkin F.D. *Mozhet li „shizmatik" byt rycarem? Status russkogo voina v livonskih hronikah XIII v.* [w:] *Aleksandr Nevskij: lichnost, epoha, istoricheskaya pamyat. K 800-letiyu so dnya rozhdeniya. Materialy mezhdunarodnoj nauchnoj konferencii (25–27 maya 2021 g., Moskva, Rossiya).* S.259–268. [Подберезкин Ф.Д. *Может ли „схизматик" быть рыцарем? Статус русского воина в ливонских хрониках XIII в.* [w:] *Александр Невский: личность, эпоха, историческая память. К 800-летию со дня рождения. Материалы международной научной конференции (25–27 мая 2021 г., Москва, Россия).* С.259–268].

Pouny zbor tvorau / Maksim Bagdanovich. T. 1: *Vershy, paemy, peraklady, nasledavanni, charnavyya nakidy / padryhtouka tekstau i kamentaryi: E. A. Zolavaj, T. R. Stroevaj, L. U. Hryshchanovich*. Minsk: Navuka i tehnika, 1992.

S. 314. [*Поўны збор твораў / Максім Багдановіч. Т. 1: Вершы, паэмы, пераклады, наследаванні, чарнавыя накіды / падрыхтоўка тэкстаў і каментарыі: Э. А. Золавай, Т. Р. Строевай, Л. У. Хрышчановіч.* Мінск: Навука і тэхніка, 1992. С. 314].

Pyatrauskas R. *Farmavanne instytucyjnaga dvara vyalikaga knyazya u Litve (XIV – pachatak XV st.)* [w:] *Arche № 9 (84). 2009. Litva i Belarus: tysyacha god razam*. Minsk, 2009. S. 39–71. [Пятраўскас Р. *Фармаванне інстытуцыйнага двара вялікага князя ў Літве (XIV – пачатак XV ст.)* [w:] Arche № 9 (84). 2009. *Літва і Беларусь: тысяча год разам*. Мінск, 2009. С. 39–71].

Rycary [w:] *Vyalikae knyastva Litouskae: Encyklapedyya.* U 2 t. T. 1: *Abalenski – Kadencyya* / Redkal.: G.P. Pashkou (gal. red.) [i insh.]. – Minsk.: BelEn, 2005. [*Рыцары* [w:] *Вялікае княства Літоўскае: Энцыклапедыя. У 2 т.* Т. 1: *Абаленскі – Кадэнцыя* / Рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск.: БелЭн, 2005].

Saverchanka I. V. *Starazhytnaya paeziya Belarusi XVI – pershaya palova XVII st.* / Red. A.I. Maldzis; AN Belarusi. In-t lit.imya Ya.Kupaly. Fond fundam. dasled.Resp.Belarus. Minsk: Navuka i tehnika, 1992. [Саверчанка І. В. *Старажытная паэзія Беларусі XVI – першая палова XVII ст*. / Рэд. А.І.Мальдзіс; АН Беларусі. Ін-т літ.імя Я.Купалы. Фонд фундам.даслед. Рэсп.Беларусь. Мінск: Навука і тэхніка, 1992].

Selart A. *Livland und dir Rus' im 13. Jahrhundert* . Köln; Weimar; Wien, 2007.

Shalanda A.I. T*ayamnichy svet belaruskih gerbau: shlyaheckaya geraldyka Vyalikaga knyastva Litouskaga.* Minsk: A. M. Yanushkevich, 2014. [Шаланда А.І. *Таямнічы свет беларускіх гербаў: шляхецкая геральдыка Вялікага княства Літоўскага*. Мінск: А. М. Янушкевіч, 2014].

Stahno N.V. *Pahavalnaya cyrymoniya epohi baroka yak chastka reprezentacyi shlyahty Vyalikaga Knyastva Litouskaga* [w:] *Epitaphium: pahavalnaya kultura narodau Vyalikaga Knyastva Litouskaga: zbornik artykulau*. Minsk: NGAB, 2022. С.121–131. [Стахно Н. В. *Пахавальная цырымонія эпохі барока як частка рэпрэзентацыі шляхты Вялікага Княства Літоўскага* [w:] *Epitaphium: пахавальная культура народаў Вялікага Княства Літоўскага: зборнік артыкулаў.* Мінск: НГАБ, 2022. С.121–131].

Tananaeva L.I. *Sarmatskij portret: iz istorii polskogo portreta epohi barokko*. Moskva: Nauka, 1979. [Тананаева Л. И. *Сарматский портрет: из истории польского портрета эпохи барокко.* Москва: Наука, 1979].

Teterycz-Puzio A. *Wojownik, obrońca wiary i uciśnionych? Wzorce rycerskie w świetle średniowiecznych przekazów narracyjnych* [w:] *Ethos rycerski w kulturze. Tradycje i kontynuacje.* T. 1. *W kręgy średniowiecza.* Uniwersytet Śląski, 2017. S. 151–184.

Vasin P. *Igrushki russkih knyazej* [w:] *Rodina.* 2003, № 11. S.106–110.[Васин П. *Игрушки русских князей* [w:] *Родина.* 2003, № 11. С.106–110].

Vojtovich L. *Problemi istorichnoyi terminologiyi serednovichnoyi Rusi: druzhinna derzhava, feodalizm, knyazivstvo, volost, len, kormlinnya, votchina*. [w:] *Colloquia russica.* Series II, Vol. 4. *Serednovichna Rus: Problemi terminologiyi.* Ivano-Frankivsk–Krakiv, 2018. S. 9–21. [Войтович Л. *Проблеми історичної термінології середньовічної Русі: дружинна держава, феодалізм, князівство, волость, лен, кормління, вотчина.* [w:] *Colloquia russica.* Series II, Vol. 4. *Середньовічна Русь: Проблеми термінології.* Івано-Франківськ–Краків, 2018. С. 9–21].

Volkau M. *Mirski zamak u XVI–XVIII stst.: gistoryya budaunictva i evalyucyya funkcyyanalnaga pryznachennya* [w:] *Belaruski gistarychny chasopis.* 2016. № 9. S. 29–45. [Волкаў М. *Мірскі замак у XVI–XVIII стст.: гісторыя будаўніцтва і эвалюцыя функцыянальнага прызначэння* [w:] *Беларускі гістарычны часопіс.* 2016. № 9. С. 29–45].

Volkov N. A. *Upodobliyayas monarham: simvolika magnatskih rezidencij v Velikom knyazhestve Litovskom v konce XV – seredine XVII v.* [w:] *Vyzov vremeni: stanovlenie centralizovannyh gosudarstv na Vostoke i Zapade Evropy v konce XV–XVII vv.* Kaluga, 2019. S. 94–101. [Волков Н. А. *Уподобляясь монархам: символика магнатских резиденций в Великом княжестве Литовском в конце XV – середине XVII в.* [w:] *Вызов времени: становление централизованных государств на Востоке и Западе Европы в конце XV–XVII вв.* Калуга, 2019. С. 94–101].

Yakovenko N. M. *Ukrainska shliakhta z kintsia XIV do seredyny XVII st. Volyn i Tsentralna Ukraina*. Kyiv, 1993. [Яковенко Н. М. *Українська шляхта з кінця XIV до середини XVII ст. Волинь і Центральна Україна.* Київ, 1993].

Yaroshevich A.A. *Ot renessansa k barokko: memorialnaya i altarnaya plastika Belarusi XVII–XVIII vekov.* Minsk: Belarus, 2019. [Ярошевич А.А. *От ренессанса к барокко: мемориальная и алтарная пластика Беларуси XVII–XVIII веков* . Минск: Беларусь, 2019].

Yuho, Ya.A. *Gistoryya dzyarzhavy i prava Belarusi: Vuchebn. dapam*. Minsk: RIVSh BDU, 2000. [Юхо, Я.А. *Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: Вучэбн. дапам*. Мінск: РІВШ БДУ, 2000].

Zhygulski Z. *„Bitva pad Orshaj" – analiz struktury karciny* [w:] *Arche Pachatak;* № 12 (133). *Bitva pad Orshaj: mesca pamyaci i kanflikt interpretacyj.* Minsk: Gajsak, 2014. C. 354–401. [Жыгульскі З. *„Бітва пад Оршай" – аналіз структуры карціны* [w:] *Arche Пачатак;* № 12 (133). *Бітва пад Оршай: месца памяці і канфлікт інтэрпрэтацый.* Мінск: Гайсак, 2014. С. 354–401].

The phenomenon of knighthood in the Grand Duchy of Lithuania in the XIV–XVI centuries: historiography of the issue

The article studies the problem of the phenomenon of knighthood in the Great Duchy of Lithuania during the last 120 years from the beginning of the 20th century until today. In the beginning, the main works dedicated to the history of knighthood are examined: ones by M.Kin, G. Flori, J. Huizinga, E. Bumke and others. Further the scientific works, which particularly dedicated to the phenomenon of knighthood in the Great Duchy of Lithuania, are studied: from the first articles, references in the academic works of pre-revolutionary Russian historians (M. Dashkewytsch, M. Lyubavsky, F. Leontovich) until contemporary studies by Lithuanian and Belarusian authors (E. Gudavičius, R. Petrauskas, K. Antanaitis, A. Nikzhentaitis, J. Kiaupiene, Y. Bohan). The author emphasises that this topic was being discussed in the first time at the beginning of the 20th century, however, during the long time, during the existence of Marxism approach towards history, the problem barely developed. In this regard only in 1990s – 2000s, the problem of the phenomenon of knighthood was being developed in Lithuanian and Belarusian history, against the background of the crisis of the Soviet historiographical tradition. The main part of scientific texts appeared in works created by Lithuanian scientists. In its turn, Belarusian science pays little attention to the study of the problem of knighthood and basically the only historian who was really interested in this topic, was Yury Bohan.
K e y w o r d s: knight, knighthood, elite, aristocracy, Middle Ages, historiography, Grand Duchy of Lithuania, war, culture

This article is distributed under the terms of the Creative Commons Attribution 3.0 PL
© Copyright by Uniwersytet Warszawski Katedra Studiów Interkulturowych Europy Środkowo-Wschodniej & individual articles to their Authors

doi: 10.32612/uw.2543618X.2024.pp.87-102

Przegląd Środkowo-Wschodni, 9, 2024
ISSN 2543-618X eISSN 2545-1324

Nr art. 20240903

Data przesłania: 14.01.2024
Data akceptacji: 28.02.2024

Мікола Хаўстовіч
Uniwersytet Warszawski
m.khaustovich@uw.edu.pl
ORCID: 0000-0002-3007-0603

Рукапісы беларускай *Энеіды*

Rękopisy białoruskie *Eneidy*

Badania nad *Eneidą* białoruską rozpoczęły się na początku XX wieku, kiedy językoznawca Joachim Karski opublikował artykuł „Eneida białoruska na opak" i w załączniku do niej umieścił wydanie zbiorcze dzieła. Do swojej pracy autor wykorzystał trzy rękopisy. Najpierw rękopis Mysłowskiego dla Vosipa Badziańskiego (lata 30. XIX w.); potem rękopis W. Badziańskiego dla Pawła Szafarika (1837); następnie rękopis Barysa Zaleskiego dla W. Badziańskiego (1851). W latach dwudziestych XX wieku wszystkie te rękopisy zaginęły. Z tego powodu badając *Eneidę na opak,* można było posługiwać się jedynie publikacją J. Karskiego. W 2018 r. Wiaczesław Martysiuk odkrył w katalogach Rosyjskiego Państwowego Archiwum Akt Dawnych dokumenty W. Badziańskiego, wśród których znajdowały się dawne rękopisy białoruskiej *Eneidy.* W niniejszym artykule dokonano analizy nowo odkrytych rękopisów *Eneidy.* Zwraca się uwagę na odrębność rękopisu Mysłowskiego sporządzonej w języku białoruskim alfabetem łacińskim (obecność literatury „ŭ", oddającej dźwięk [ў]). Naszym zdaniem brak „cokannia" w rękopisach *Eneidy,* które pochodzą z domu Rawińskiego, może wskazywać na to, że owe dzieło białoruskie nie wyszło spod pióra Wincentego Rawińskiego.

Słowa kluczowe: Dawne rękopisy białoruskiej *Eneidy*, cechy graficzne, niereprezentowane „cokanie", atrybucja

Рымскі паэт Публій Вергілій Марон (70 да н. э. – 19 да н. э.) на замову Гая Юлія Цэзара Актавіяна Аўгуста (63 да н. э. – 14) дзеля станаўлення нацыянальнай свядомасці і нацыянальнага гонару народа і абароны дынастычных інтарэсаў імператара цягам дзесяці гадоў напісаў на падставе паданняў, што выводзіліся непасрэдна з *Іліяды* Гамера, патрыятычны эпас *Энеіда* (*Aeneis*), прысвечаны гісторыі легендарнага траянскага героя Энея, які пасля разбурэння Троі перасяліўся з рэшткамі свайго народа ў Італію.

Перайманні-наследаванні *Энеідзе* з'явіліся ўжо ў I ст. н. э. Твор у хрысціянскую эпоху стаўся своеасаблівым падручнікам лацінскай мовы. У XV ст. *Энеіду* пачалі актыўна перакладаць (спачатку прозаю, пасля вершам) на еўрапейскія мовы – французскую (1500), іспанскую, шатландскую (1513), нямецкую (1515, 1610), італьянскую (1581), галандскую (1646) і інш.

Першы друкаваны расійскі пераклад *Энеіды* Васіля Санкоўскага (1741–?) з'явіўся ў 1769 г. (I песня), поўны (Васіля Пятрова, 1736–1799) у 1780-я гг.

У XVII ст. з'явіліся першыя травестацыі славутай паэмы Вергілія. Пачынальнікам лічыцца Джавані Батыста Лалі (1772–1637), які ў 1634 г. выдаў *L'Eneide travestita del Signor Gio*. Але сапраўдную славу жанру травестацыі ў духу бурлеска і іроікамічнай паэмы прынёс сваім *Вергіліем пераліцаваным бурлескным вершам* (*Le Virgile travesti en vers burlesques*, 1648) Поль Скарон (1610–1660).

Для ўсходнеславянскіх травестацый *Энеіды* найважнейшае значэнне мела праца аўстрыйскага паэта Алаіса Блюмауэра (1755–1798) *Virgil's Aeneis, travestirt* (1784–1788). Бо менавіта яе ў першую чаргу выкарыстоўвалі і расійскі, і ўкраінскі, і беларускі паэты. Тут мы не будзем закранаць пытання першынства славянскай травестацыі, адзначым толькі, што шэраг украінскіх даследнікаў выказваюць аргументаваныя сумненні, што *Виргиліева Энейда, вывороченная наизнанку* (1791) Мікалая Осіпава (1751–1799) з'явілася раней іншых. Таксама лічым патрэбны сказаць, што Міхайло Маркоўскі (1869–1947) у 1926 г. выказаў думку, што Іван Катлярэўскі на па-

чатковым этапе свае травестацыі Вергілія карыстаўся беларускім тэкстам:

> ранній текст білоруської *Енеїди* міг ходити по Чернігівщині, міг бути відомий і Парпурі, що був родом з Чернігівщини (Конотіпського повіту), міг навіть попасти до рук і самого Котляревського, що в пізнішій редакції і міг вставити це білоруське „смякай", бо в найстарішому списку *Енеїди* Котляревського (1794) тут стоїть „размишляй" (в виданню К 1809 р. „и помишляй", у Ж було раніше „и помишляй" або „размишляй" – важко напевне розібрати), тільки-ж витерто і потім, написано, як і в Парпури, „смякай" (в рук. 1839 р. и помишляй)[1].

Мы маем яшчэ пару аргументаў, якія сведчаць, што беларуская травестацыя была напісаная не ў 1820-я гг., а значна раней, але, пакідаючы гэтае пытанне дзеля адмысловага даследавання, найперш паразважаем пра нашыя пошукі рукапісаў беларускай *Энеіды*.

Даследаванне беларускай *Энеіды* пачалося ўласна на пачатку XX ст., калі вядомы расійскі (беларускага паходжання) мовазнаўца Яўхім Карскі (1861–1931) апублікаваў у XVIII томе *Сборника Харьковскаго Историко-Филологическаго Общества, изданнаго въ честь профессора Н.Ф. Сумцова* (1908) невялікі артыкул *Бѣлорусская Энеида на изнанку съ приложеніемъ текста сохранившихся отрывковъ*[2].

Дзеля свае працы ён карыстаўся трыма рукапісамі (Я. Карскі назваў іх «древнѣйшими списками»). Па-першае, рукапісам Мыслоўскага для Восіпа Бадзянскага (1830-я гг.); па-другое, рукапісам В. Бадзянскага для Паўла Шафарыка (1837); па-трэцяе, рукапісам Барыса Залескага для В. Бадзянскага (1851). Навуковец паводле

---

[1] М. Марковський, *Енеїда Івана Петровича Котляревського,* „Записки історично-філологічного відділу" 1926, кн. IX, с. 89.

[2] Гл.: Е. Карскій, *Бѣлорусская ЭНЕИДА НА ИЗНАНКУ: Съ приложенемъ текста сохранившихся отрывковъ, [в:] Сборникъ Харьковскаго Историко-Филологическаго Общества, изданнаго въ честь профессора Н.Ф. Сумцова,* т. XVIII, Харьковъ 1908.

ўласнага расчытання апублікаваў апошні з іх, часткова адаптуючы яго («въ основномъ текстѣ приходится принять однообразную орфографію»[3], а таксама падаючы ў спасылках асноўныя варыянты паводле двух іншых.

Рукапіс Мыслоўскага для В. Бадзянскага і рукапіс Б. Залескага для В. Бадзянскага захоўваліся ў той час у паперах В. Бадзянскага ў бібліятэцы Московскаго Общества Исторіи и Древностей российскихъ, а рукапіс В. Бадзянскага для Паўла Шафарыка – у Пражскім музеі ў архіве знанага чэшскага навукоўца.

У 1920-я гг. усе гэтыя рукапісы былі згубленыя. Фактычна беларускае савецкае літаратуразнаўства мусіла карыстацца адной публікацыяй Я. Карскага. Зрэшты, пытаннямі тэксталогі *Энеіды* ніхто з навукоўцаў не займаўся. Даследаваўся ідэйна-мастацкі змест твора, а найбольш – ягоная атрыбуцыя. На тэму ўстанаўлення аўтарства і часу напісання *Энеіды навыварат* мы маем некалькі манаграфій, раздзелаў манаграфіях і вялікую колькасць артыкулаў. Перад беларускім савецкім літаратуразнаўствам ставілася задача пацвярджэння гіпотэзаў Я. Карскага, і яно паспяхова выконвала яе: „афіцыйна" прынятым лічылася, што беларуская *Энеіда* ўзнікла пасля французска-расійскай вайны 1812 г., (як асноўнае пацвярджэнне – радок „Дамовки стали убиратца, // Якъ адъ Кургузова Липарт", які рэдактары XX ст. звычайна падавалі „Як ад Кутузава Банапарт"), а напісаў паэму палкоўнік расійскага войска Вікенці Равінскі (1786–1855).

Трэба сказаць, што беларускія гісторыкі літаратуры доўгі час марна імкнуліся знайсці рукапісы *Энеіды навыварат*. Адзінае, што ўдалося высветліць Ізмаілу Басу і Г. Кісялёву, дык гэта тое, што бібліятэка Московскаго Общества Исторіи и Древностей россійскихъ, дзе пасля смерці В. Бадзянскага захоўваліся (у 1877–1879 гг.) паперы навукоўца, была апісаная Ягорам Сакаловым

[3] Е. Карскій, *Бѣлорусская ЭНЕИДА НА ИЗНАНКУ*…, op. cit., s. 18.

у адмысловым выданні[4], дзе ў раздзеле *Труды Бодянскаго по собиранію матеріаловъ по языкознанію и по собиранію памятниковъ народнаго творчества* пазначаныя 22 пазіцыі з пераважна беларускімі матэрыяламі[5]. Сярод іх – два рукапісы *Энеіды навыварат*. Менавіта імі карыстаўся Я. Карскі, калі рыхтаваў сваю публікацыю пра беларускую *Энеіду*.

Пасля ліквідацыі ў 1929 г. Общества Исторіи и Древностей россійскихъ ягоная бібліятэка была падзеленая і перададзена ў розныя ўстановы. У пасляваенны час рукапісы бібліятэкі трапілі ў Расійскі дзяржаўны архіў старасвецкіх актаў (тады: Цэнтральны дзяржаўны архіў старасвецкіх актаў) і сталіся 188 фондам. У 1980 г. быў зроблены вопіс гэтага фонду, а г. зн. ужо тады можна было выявіць «древнѣйшіе списки» беларускай *Энеіды*. Але чакаць давялося амаль сорак гадоў. У 2018 г. В. Мартысюк,

> гартаючы чацвёрты том даведніка *Российский государственный архив древних актов. Путеводитель* <…> натрапіў на гэткую пазіцыю: *Бодянский О.М., профессор Московского университета: Материалы по языкознанию, записи белорусского фольклора XIX в.* [*Российский государственный архив древних актов*… 1999, 119]. Зварот да вопісаў РДАДА дазволіў удакладніць інфармацыю: *Записи белорусского фольклора и материалы по языкознанию профессора Московского университета О.М. Бодянского. <Разрозненные тетради. См. Соколов, бумаги О.М. Бодянского, NoNo 144–165.> Российский государственный архив древних актов (РГАДА), Москва. – Ф. 188. Рукописное собрание Центрального государственного архива древних актов (коллекция). – Оп. 1. – Д. 1394. <с. ф.>*. Неўзабаве ўдалося атрымаць і фотакопіі архіўных матэрыялаў, зробленыя з мікрафільмаў[6].

---

[4] Гл.: Е. Соколовъ, *Библіотека Императорскаго Общества Исторіи и Древностей Россійскихъ, вып. второй: Описаніе рукописей и бумагъ, поступившихъ съ 1846 по 1902 г.*, Москва 1905.

[5] Ibidem, s. 627–629.

[6] М. Марковський, *Енеїда Івана Петровича Котляревського*, „Записки історично-філологічного відділу" 1926, кн. IX, с. 89.

Усяго ў справе 114 аркушаў. Дэталёвае апісанне ўсіх дакументаў справы 1394 апублікаваў В. Мартысюк[7]. Яно крыху адрозніваецца ад апісання Я. Сакалова. Ніжэй падаём пазіцыі, якія датычаць толькі *Энеіды*:

1. Отривокъ изъ 1ой пѣсни *Энеиды вывороченной наизнанку на бѣлорусскій языкъ, Гнамъ Мысловскимъ* (лл. 43–44 об.);

2. *Энеида. Съ Малороссійскаго на Смоленскій крестьянскій языкъ переложенная Викентіемъ Ровинскимъ (помѣщикомъ Духовщинскаго уѣзда)* (лл. 101–107 об.).

Гэта і ёсць «древнѣйшіе списки» беларускай Энеіды.

Першы з іх, г. зв. рукапіс Мыслоўскага–Бадзянскага датуецца сярэдзінай 1830-х гг., але не пазней 1837 г., бо дакладна вядома, што ўжо ў снежні г. г. В. Бадзянскі часткова (80 радкоў са 103) транслітараваў яго з лацінкі на гражданку і падараваў П. Шафарыку. А вось адказаць на пытанне: калі В. Бадзянскі атрымаў рукапіс Мыслоўскага? –даволі складана. Высветлена ў апошні час, што Мыслоўскіх, вераемна звязаных з маскоўскім і пецярбургскім „асяродкамі" зацікаўлення беларускаю *Энеідаю*, было двое: родныя браты Іван і Каятан, г. зн., праўдападобна, што старэйшы Іван (1815–1834) падчас вучобы ў Маскоўскім універсітэце перадаў рукапіс В. Бадзянскаму. Аднак справа не такая і простая: І. Мыслоўскі быў студэнтам адно два месяцы: ён нечакана захварэў і памёр ва ўніверсітэцкім шпіталі ў лістападзе 1834 г.

А вось В. Бадзянскі пачаў цікавіцца беларускаю *Энеідаю* хіба толькі ў красавіку 1836 г., калі атрымаў просьбу П. Шафарыка даць звесткі пра ўкраінскую і беларускую мовы і літаратуры. А гэта азначае, што В. Бадзянскі гэтыя звесткі атрымаў непасрэдна ў Віцебску, калі даць веры словам з ягонага ліста ў Прагу:

положил себе правилом: не произносить своего суда о том, чего сам не имел случая видеть, слышать, проверить на туземье: ведь стра-

[7] Ibidem, s. 256–258.

ны-то эти не за горами? Авось, рано-поздно, приведет Бог побывать там, прислушаться, наглядеться, сверить, переверить вычитанное и перенятое от других и, тогда уже, подвесть конечный итог…[8].

Такім чынам, першы вядомы рукапіс *Энеіды* занатаваны рукою Каятана Мыслоўскага. Звернем увагу: рукапіс Мыслоўскага – двухмоўны: тытул запісаны па-руску, тэкст паэмы – лацінкаю па-беларуску, спасылка-тлумачэнне на палях («Бахциха содержательница пивного погреба въ Бѣшенковичахъ Витебской Губерніи») – зноў па-руску; напрыканцы маецца таксама пазнака («и проч.»), якая сігналізуе, што перапісвальнік ведае (ці мае), але з нейкіх прычынаў не занатоўвае працяг паэмы. Цяжка меркаваць паводле фотакопіі рукапісу, ці тытул і тэкст паэмы запісаныя рукою аднаго чалавека? Адзінае, што можна сказаць: тытул беларускага твора (*Отривокъ изъ 1ой пѣсни Энеиды вывороченной на изнанку на Бѣлорусскій языкъ, Гномъ Мысловскимъ*), відаць, „запазычаны", ці лепш сказаць: створаны на ўзор тытулу расійскай *Енеиды* Мікалая Восіпава (1751–1799). Перапісвальнік быў знаёмы хіба не з першым (*Виргиліева Энейда, на изнанку*, 1791), а другім ці трэцім выданнем (*Виргиліева Энейда, вывороченная на изнанку*. Н. О., 1800; 1801). Цікава і тое, што перапісвальнік не выкарыстоўвае тытулы выданняў украінскае паэмы: першае называлася *Малороссійская Енеида въ трехъ частяхъ: Енеида на малороссійскій языкъ перелицованная И. Котляревскимъ* (1798). Падобны тытул мела і другое, зноў „пірацкае", выданне: *Енеида на малороссійскій языкъ перелицованная И. Котляревскимъ* (1808). І толькі трэцяе выданне будзе мець аўтарскі тытул: *Виргиліева Енеида на малороссійскій языкъ переложенная И. Котляревскимъ* (1809).

Перапісвальнік, пэўна, добра валодаў польскай мовай, графіку якое здолеў дастасаваць да беларускай мовы. Апрача таго, ён, скажам так, адчуваў фанетыку беларускай мовы. Прынамсі, гук [ў]

[8] Цыт. па: Г. Кісялёў, *Жылі-былі класікі: Хто напісаў паэмы* Энеіда нававарат *і* Тарас на Парнасе, Мінск 2005, с. 35.

быў для яго адметным, бо нават прыдумаў дзеля яго адмысловыя графемы ***ŭ*** і ***ů***[9]. Характэрна, што ён не меў узораў запісу беларускай мовы, бо іх было зусім мала. Так, Марыя Чарноўская (к. XVIII – п. п. XIX ст.) ў артыкуле *Zabytki mitologii słowianskiey w zwyczajach wieyskiego ludu na Białej Rusi dochowywane* па-рознаму адлюстроўвала на пісьме гэты гук: выкарыстоўвае літары ***ł*** і ***u***: „Kab moy lon by**ł** tak wieliki jak hetaja berasina", „Hdzie Kupała naczawała? // <…> Szto **u** Iwana **u**żywała"[10]. Іншым шляхам ішоў Лукаш Галамбёўскі (1773–1849), які ведаў публікацыю М. Чарноўскае: у яго беларускі гук [ў] перадаецца літараю ***w***: „światy Pokro**w**! Pokro**w**! // Pokry**w** ziamlu i wadu"[11], „Kab da**w** Boh dażdać"[12], „Pra**w**da! **w**czora na torhu ja bywa**w**"[13], „Da nia da**w** mnie Boh, nia sudzi**w** mnie Boh"[14]. А вось Міхал Баброўскі (?) (1784–1848) выкарыстоўвае дзве літары ***u*** і ***w***: „Chto ż nas Satwary**u**?"[15], „Czy ż my byli b u piekle"[16], „I **w**sio wieru ja dla Ciabie"[17], „Sława **w** Troycy Jedynomu"[18].

Сваім мовазнаўчым досведам перапісвальнік рукапісу Мыслоўскага выгодна адрозніваецца ад усіх іншых – вядомых і невядомых – аматараў беларускае пісьменнасці, дзякуючы якім да нас дайшла *Энеіда*. Праўда, мы дапускаем, што ён карыстаўся нейкім іншым рукапісам, дзе гук [ў] перадаваўся графемаю ***ŭ*** (***ů***)?

Другі рукапіс беларускай *Энеіды* паходзіць з 1851 г.: Б. Залескі

---

[9] Магчыма, усё ж літара ***ů*** „атрымалася" ў перапісвальніка як варыянт ***ŭ***. Альбо так было ў пратографе і перапісвальнік дакладна скапіраваў свайго папярэдніка.

[10] M. Czarnowska, *Zabytki mitologii sławianskiey w zwyczajach wieyskiego ludu na Białej Rusi dochowywane*, „Dziennik Wileński" 1817, t. 6, s. 398.

[11] Ł. Gołębiowski, *Lud polski jego zwyczaje, zabobony*, t. 1, Lwów 1884, t. I, s. 65.

[12] *Ibidem*, s. 66.

[13] *Ibidem*, s. 71.

[14] *Ibidem*, s. 80.

[15] Anonim, *Krótkie zebranie nauki chrzesciańskiey dla wieśniakow mówiących językiem polsko-ruskim wyznania rzymsko-katolickiego*, Wilno 1835, s. 52.

[16] *Ibidem*, s. 53.

[17] *Ibidem*, s. 56.

[18] *Ibidem*, s. 57.

(1827–1889) пасля заканчэння навучання ў Маскоўскім універсітэце ахвяраваў прафесару В. Бадзянскаму спіс *Энеіды навыварат*[19]. Відаць, Б. Залескі, скончыўшы ў 1847 г. са срэбраным медалём Смаленскую гімназію, вучыўся на аддзяленні славеснасці, бо ведаў пра цікавасць В. Бадзянскага да беларускай *Энеіды*[20]. Магчыма, нават, што прафесар знаёміў сваіх студэнтаў з тым фрагментам паэмы, якім ён меў, нейкі час лічачы аўтарам твора Мыслоўскага[21]. Б. Залескі з дзяцінства быў знаёмы з сынам В. Равінскага Канстанцінам, але пра *Энеіду навыварат* у доме Равінскіх ён даведаўся хіба толькі на пачатку 1850-х гг.

Узнікае пытанне: чаму Равінскія толькі на пачатку 1850-х гг. актыўна пачалі пашыраць твор, які быў напісаны блізу дваццаці пяці – трыццаці гадоў таму?[22] Адказу мы не ведаем, але гіпатэтычна можам прапанаваць наступнае: даўні рукапіс *Энеіды* (магчыма, і рукапісы іншых твораў) бацькі толькі цяпер трапіў на вочы прадстаўнікам маладзейшага пакалення Равінскіх. Яны (прынамсі, Уладзімір) прыкладаюць пэўныя намаганні, каб зацікавіць навуковую грамадскасць і, пэўна, апублікаваць літаратурную спадчыну Вікенція Паўлавіча. Ці ўзгаднялі маладыя Равінскія свой „праект”

[19] Здарылася гэта да 11 жніўня 1851 г. Цікава, што ў дзённіку В. Бадзянскага гэтая падзея аніяк не адлюстраваная [гл.: И. Павловскій, *Осипъ Максимовичъ Бодянскій въ его дневникъ 1849–1852 гг*. «Русская старина» 1889, т. LXIV, с. 123–141.

[20] Г. Кісялёў, *Жылі-былі класікі…,* op. cit., с. 178–179.

[21] Цікава, Уладзір Назімаў (1803–1874), апякун Маскоўскай навучальнай акругі, падчас наведвання Універсітэта патрабаваў, каб лекцыі чыталі на ўсіх славянскіх «наречияхъ», на што В. Бадзянскі яму адказаў: «но наречий 10–12!» [гл.: И. Павловскій, *Осипъ Максимовичъ Бодянскій въ его дневникъ 1849–1852 гг*. «Русская старина» 1888, т. LX, с. 414.

[22] Г. Кісялёў сцвярджае, што В. Равінскі мог напісаць паэму „ў 1816–1826 гг., калі ён жыў у адстаўцы на радзіме, або ў 1827–1828 гг., калі быў зволены з пасады інспектара піцейных збораў Арэнбургскай губерні і стажыраваўся ў Смаленскай удзельнай канторы” (Г. Кісялёў, *Ад Чачота да Багушэвіча: Праблемы крыніцазнаўства і атрыбуцыі беларускай літаратуры XIX ст*., Мінск 1993, с. 353).

з бацькам? Магчыма. Але калі, напрыклад, яны жылі ў розных мясцовасцях (Уладзімір у Смаленску, а Вікенці Паўлавіч у адным са сваіх фальваркаў – за 60–80 вёрст адзін ад аднаго), дык ці не дастаткова для сына, каб атрыбутаваць тэкст на карысць бацькі, было таго, што *Энеіда* занатаваная рукою бацькі і знаходзіцца сярод іншых ягоных папераў?

“Рукапіс Залескага” як і пазнейшы „рукапіс Сразнеўскага”, а таксама фрагменты паэмы ў артыкуле П. Шастакова і публікацыя ў газеце «Смоленскій вѣстникъ» (1890) паўсталі, бясспрэчна, на падставе аднаго рукапісу, хоць усе яны маюць адрозныя тытулы:

1851 – *Енеида съ Малороссійскаго на Смоленскій крестьянскій языкъ переложенная Викентіемъ Ровинскимъ (помѣщикомъ Духовщинскаго уѣзда)*.

1853 – *Енеида, на Смоленское крестьянское нарѣчіе переложенная В.П. Р-скимъ*.

[1850-я] – *Энеида съ малоруского на Смоленский крестьянский язык переложенная В.П. Ров…*

1890 – *Енеида на Бѣлорусскомъ нарѣчіі* (з пазначэннем, што ў рукапісе твор мае тытул *Энеида, съ малороссійскаго на Смоленскій крестьянскій языкъ переложенная*)[23].

З трох копій („рукапіс Залескага”, „рукапіс Сразнеўскага” і публікацыя ў газеце «Смоленскій вѣстникъ») найбольш цікаваю нам падаецца першая, выкананая філолагам-славістам і смалянінам Б. Залескім. Перапісаў ён „манускрыпт” Равінскіх, на нашую думку, паводле ўзору запісаў беларускамоўных тэкстаў В. Бадзянскага. І што цікавае: запіс Б. Залескага нагадвае транслітарацыю, якую выканаў В. Бадзянскі для П. Шафарыка. Мы нават схільны думаць, што „манускрыпт” Равінскіх быў лацінкаю. Пакінутыя В. Равінскім лацінскія крыптанімы пад рускамоўнымі тэкстамі

[23] У тэксце ўступнай нататкі (аўтарства Канстанціна Равінскага) ідзе гаворка пра «смоленское бѣлорусское нарѣчіе».

дазваляюць меркаваць, што літаратар мог ведаць польскую мову[24] (нейкі час служыў на Украіне і Заходняй Беларусі) і мог карыстацца дзеля запісвання ці перапісвання беларускамоўных твораў польскаю графікаю.

Якія аргументы мы можам падаць у карысць таго, што „рукапіс Залескага" – гэта транслітарацыя „манускрыпту" Равінскіх?

Па-першае, Б. Залескі не змог расчытаць шэраг даволі простых, але „цёмных" для яго мясцінаў „манускрыпту". Напрыклад, у 48 радку слова „*няцысцикъ*". Відаць сыну праваслаўнага святара польская лацінка давалася цяжка, асабліва калі ў слове фіксавалася невядомае Б. Залескаму „цоканне". У 76 радку ён не змог прачытаць слова „Tam", відаць, па той прычыне, што ў польскай графіцы літара „T" пісалася па-рознаму. 222 радок перададзены ім даволі „прыблізна": „Чистоль вы ошутча визицё".

Па-другое, як і В. Бадзянскі, Б. Залескі падобным чынам перадаваў беларускі гук [ў]: *живъ, бывъ, вдався, набивъ, всхадився* і інш. Калі ж гук [у] утвараў склад, неабходны для рытму, дык ён перадаваўся літараю ***у***: *ни вошто украсивъ, на уцёкъ, въ кацёлъ упекло* і інш. Прыназоўнік ***ў*** звычайна Б. Залескі запісваў як ***въ***: *въ табаку, въ адзинъ, словно въ войта силязни, папряникъ въ хусточку влажила* і інш. Але двойчы ў ягоным спісе (апошнія радкі паэмы) з'явілася літара… ***ў***: *Шматками мяса ў миски клала, Зиканья ў волюшку было*. Мы тлумачым гэта тым, што стомлены перапісвальнік механічна транслітараваў ***й*** у новую для грамадзянкі літару ***ў***. Тым самым стаўшы вынаходнікам новай літары ў грамадзянцы.

Па-трэцяе, як і В. Бадзянскі, Б. Залескі няправільна трансліта-

[24] Равінскія, пасля захопу Смаленшчыны Масковіяй у XVII ст., перайшлі на расійскую службу і, відаць, памянялі веравызнанне, але як і амаль уся смаленская шляхта доўгі час захоўвалі шэраг адметных рысаў, „звязаных з гісторыяй гэтага краю і працяглым знаходжаннем ў складзе беларуска-літоўскай і польскай дзяржавы" (Г. Кісялёў, *Жылі-былі класікі…,* op. cit., с. 198). Вераемна, польская мова ў сям'і Равінскіх таксама была той каштоўнасцю, якая перадавалася з пакалення ў пакаленне.

раваў літару ***l***: *лада* (замест – ляда), *кашёлъ*, *Эола*. Але: *дульку, любивъ*.

Па-чацвёртае, Б. Залескі меў праблему з перадачаю гуку [іо]. Асабліва гэта датычыла займенніка ***ён*** (па-польску – ***on***), які лацінкаю мог быць запісаны як ***jon***. З ***jo*** маглі быць таксама словы *panjowu* і *kaljoй*. Думаецца, менавіта дзеля перадачы гэтага гуку перапісвальнік выкарыстаў фанетычны запіс: літары ***io*** ён палучыў „дашкам" (kareta) ^ (у нас –.͡.): *і о͡нъ* (шмат разоў), *пані о͡ву*, *калі о͡въ*. Характэрна, што ў іншых выпадках гук [іо] Б. Залескі перадае літараю ***ё***: *маё, мёдомъ, нёба, свадёбную, паскрёбся, крадицё, плащёмъ, дзяцёмъ, адёжу* і інш.

Па-пятае, лацінкаю „зыходніка" мы можам патлумачыць выкарыстанне Б. Залескім графемы ўкраінскай азбукі ***Є*** (некалькі разоў). Магчыма, таксама, што яна ўзнікла пад уплывам практыкі запісу ўкраінскіх тэкстаў пад час заняткаў ва ўніверсітэце.

Па-шостае, звяртае на сябе ўвагу слова *вѣдьмуй* у 196 радку. Гэта памылка, ці сапсаваны беларускі варыянт польскага слова *wiedźmą*?

Увогуле, нельга сказаць, што „рукапіс Залескага" выкананы гэтак жа старанна, як і "рукапіс Бадзянскага". Так, перапісвальнік імкнуўся захоўваць асаблівасці беларускае мовы (аканне, дзеканне, цеканне, цвёрды ***р***, прыстаўныя ***г*** і ***в***), але ўдавалася яму гэта зрабіць не заўсёды.

Агульнай загадкаю для „смаленскай рэдакцыі" *Энеіды навыварат* з'яўляецца адсутнасць у спісах „цокання", адметнай асаблівасці беларускай мовы гэтага рэгіёна. Пра тое, што дадзеная асаблівасць была характэрная для родных мясцінаў В. Равінскага нават у другой палове XIX ст., паведамляе і ўнук літаратара, Канстанцін Равінскі:

> Белорусский язык у крестьян названных трех уездов стал окончательно вытесняться великорусским, на котором говорили образованные классы и который господствовал в школе, в суду, а администрации. Но в наиболее глухих местах, особенно в Порецком

уезде, еще долгое время крестьяне и особенно крестьянки «цоколи» и нередко в разговоре употребляли белорусские слова и окончания слов выговаривали как белорусы[25].

Дык В. Равінскі, творачы паэму на мове сялянаў свае ваколіцы, павінен быў перадаць гэтае „цоканне". Прыкладна так, як зрабіў у сваіх *Гецыкахъ* Пётр Кушын:

Андруха Пархи́ровицъ! кали́ мо́й Ва́ська вы́расциць, а вы́ бу́дици учи́-цилямъ у Вице́пскамъ учи́лишцу, навцыци яго́ такъ гавари́ць, я́къ вы́ гаво́рици… и я́ даки́ кай што́ шу́плю, да ницо́хъ ни дакуми́въ, што́ вы́ гавари́ли… бо́ у ва́сь ву́мъ за ро́зумъ заишо́въ атъ Хвилазо́хвіи; а не́, я вы́пишу Ре́хтару, што́ Ва́ська калѣка, яго склю́цуць, ниха́й валѣ́й бу́дить дзякъ, цымъ разу́мный и дакува́нный дура́къ, мы́ Хвилазохвіи ня вцы́лись; а ге́та вѣ́къ мадзѣ́имъ и хлѣ́пъ идзи́мъ[26].

Чаму ж гэтая рыса не адлюстроўваецца ў *Энеідзе навыварат*? Чаму на амаль 60-разовае выкарыстанне ў „рукапісе Залескага" словаў з літараю ***ч*** маецца адзін толькі *кацатыгъ* з "цоканнем"?

Так, мы памятаем, што „рукапіс Залескага" – гэта не аўтограф. Больш за тое, узнік гэты рукапіс, як і публікацыя К. Равінскага ў «Смоленскомъ вѣстникѣ», на падставе не аўтографа, а „не вельмі спраўнага спісу"[27]. У такім разе прыхільнікі аўтарства В. Равінскага павінны прызнаць, што паэт аўтограф страціў (аддаў цікаўным суседзям-чытачам, выслаў у рэдакцыю літаратурнага часопіса і інш.), але ўзамен атрымаў (магчыма, праз шмат гадоў) іншую моўную рэдакцыю твора (без „цокання"!), даволі сапсаваную і перайначаную. І, вядома, не мог ужо ўзнавіць арыгінал, адно захоўваў яе як памятку.

Такім чынам, гіпатэтычна можна меркаваць, што напісаная («переложенная») В. Равінскім у 1816–1826 гг. *Энеіда навыварат*

---

[25] [Цыт. па: Г. Кісялёў, *Жылі-былі класікі…,* op. cit., с. 264..

[26] П. Кушинъ, *Гецыки,* «Москвитянинъ: Учено-литературный журналъ» 1843, № 8, с. 403.

[27] Г. Кісялёў, *Жылі-былі класікі…,* op. cit., с. 189.

неўзабаве трапіла на Віцебшчыну і Магілёўшчыну, набыла новыя моўныя шаты (без „цокання"), а пасля, занатаваная на сваёй „другой радзіме" нейкім аматарам, вярнулася пад страху Равінскіх, адкуль зноў павандравала, але ўжо ў свет навукі (архіўных сховішчаў) і мясцовых краязнаўчых публікацый. Апошні раз гэты спіс быў выкарыстаны К. Равінскім, унукам паэта, у 1890 г.

Аднак гіпатэтычна мы можам прапанаваць і іншы варыянт паходжання рукапісу, які доўгі час быў уласнасцю Равінскіх. Аўтар беларускай паэмы быў ураджэнец Магілёўшчыны ці Віцебшчыны, але ў сталым веку жыў і працаваў на Смаленшчыне, дзе з пад ягонага пяра выйшла, па ўзору І. Катлярэўскага, «переложенная» *Энеіда навыварат*. Адсюль у паэме шэраг смаленскіх геаграфічных рэалій, а таксама асобныя дыялектызмы, зрэшты, нешматлікія. Праз вуснае (а можа, часткова і пісьмовае) пашырэнне ў арэоле гаворак з "цоканнем" (Веліжскі павет) твор набыў асобныя рысы гэтага дыялекту і трапіў, дзякуючы К. Мыслоўскаму, у друк. В. Равінскаму ўдалося атрымаць спіс паэмы ў часе першага доўгага побыту ў родных мясцінах у 1816–1826 гг. Вядома, быў гэта не аўтарскі арыгінал, але перапісвальнік, хоць і занатоўваў *Энеіду навыварат* па памяці, але меў ўяўленне пра яе строфіку і па магчымасці стараўся ўзнавіць яе.

І на яшчэ адну адметнасць „спісу Залескага" варта звярнуць увагу. Завяршаецца ён папярэджаннем пра магчымы працяг твора. Згадаў пра гэта Я. Карскі: «Въ концѣ приписка: „продолженіе впередь"»[28]. Знаны славіст, аднак, пакінуў без увагі яшчэ адну, узятую ў круглыя дужкі, фразу канцавое «приписки»: «А можетъ быть и нѣтъ!». Вераемна, улічваючы гуллівы характар „паслання чытачу", належаць гэтыя канцавыя пазнакі калі не аўтару, дык перапісвальніку-папярэдніку Б. Залескага.

[28] Е. Карскій, *Бѣлорусская Энеида на изнанку*…, op. cit., s. 6.

Bibliografia

Anonim, *Krótkie zebranie nauki chrzesciańskiey dla wieśniakow mówiących językiem polsko-ruskim wyznania rzymsko-katolickiego*, Wilno 1835.

Czarnowska M., *Zabytki mitologii sławianskiey w zwyczajach wieyskiego ludu na Białej Rusi dochowywane*, „Dziennik Wileński" 1817, t. 6, s. 396–408.

Gołębiowski Ł., *Lud polski jego zwyczaje, zabobony*, t. 1, Lwów 1884.

Karskìj E., *Bělorusskaâ Èneida na iznanku: S" priloženem" teksta sohranivšihsâ otryvkov"*, [v:] Sbornik" Har'kovskago Istoriko-Filologičeskago Obŝestva, izdannago v" čest' professora N.F. Sumcova, t. XVIII, Har'kov" 1908 [Карскій Е., *Бѣлорусская Энеида на изнанку: Съ приложенемъ текста сохранившихся отрывковъ*, [в:] *Сборникъ Харьковскаго Историко-Филологическаго Общества, изданнаго въ честь профессора Н.Ф. Сумцова*, т. XVIII, Харьковъ 1908].

Kìsâlëŭ G., *Ad Čačota da Bagušèviča: Prablemy krynìcaznaŭstva ì atrybucyì belaruskaj lìtaratury XIX st*., Mìnsk 1993 [Кісялёў Г., *Ад Чачота да Багушэвіча: Праблемы крыніцазнаўства і атрыбуцыі беларускай літаратуры XIX ст*., Мінск 1993].

Kìsâlëŭ G., *Žylì-bylì klasìkì: Hto napìsaй paèmy* Èneìda navavarat *ì* Taras na Parnase, Mìnsk 2005 [Кісялёў Г., *Жылі-былі класікі: Хто напісаў паэмы* Энеіда нававарат *і* Тарас на Парнасе, Мінск 2005].

Kušin" P., *Gécyki*, «Moskvitânin": Učeno-literaturnyj žurnal"» 1843, № 8, s. 383–412 [Кушинъ П., *Гéцыки*, «Москвитянинъ: Учено-литературный журналъ» 1843, № 8, с. 383–412].

Markovs'kij M., *Eneïda Ìvana Petroviča Kotlârevs'kogo*, „Zapiski ìstoričnofìlologìčnogo vìddìlu" 1926, kn. IX, s. 78–155 [Марковський М., *Енеїда Івана Петровича Котляревського*, „Записки історично-філологічного відділу" 1926, кн. IX, с. 78–155].

Martysûk V., *Belaruskìâ matèryâly ŭ maskoŭskaj častcy arhìva Vosìpa Badzânskaga*, „Belaruskì fal'klor: matèryâly ì dasledavannì: zb. navuk. pr." 2023, vyp. 10, s. 252–270 [Мартысюк В., *Беларускія матэрыялы ў маскоўскай частцы архіва Восіпа Бадзянскага*, „Беларускі фальклор: матэрыялы і даследаванні: зб. навук. пр." 2023, вып. 10, с. 252–270].

Pavlovskìj I., *Osip" Maksimovič" Bodânskìj v" ego dnevnikě 1849–1852 gg*., «Russkaâ starina» 1888, t. LX, s. 395–416 [Павловскій И., *Осипъ Максимовичъ Бодянскій въ его дневникѣ 1849–1852 гг*., «Русская старина» 1888, т. LX, с. 395–416].

Pavlovskìj I., *Osip" Maksimovič" Bodânskìj v" ego dnevnikě 1849–1852 gg*., «Russkaâ starina» 1888, t. LXIV, s. 123–141 [Павловскій И., *Осипъ*

Максимовичъ Бодянскій въ его дневникѣ 1849–1852 гг. «Русская старина» 1889, т. LXIV, с. 123–141].

Sokolov″ E., *Biblìoteka Imperatorskago Obŝestva Istorìi i Drevnostej Rossìjskih″*, vyp. vtoroj: *Opisanìe rukopisej i bumag″, postupivših″ s″ 1846 po 1902 g*., Moskva 1905 [Соколовъ Е., *Библіотека Императорскаго Общества Исторіи и Древностей Россійскихъ*, вып. второй: *Описаніе рукописей и бумагъ, поступившихъ съ 1846 по 1902 г*., Москва 1905].

Manuscripts of the Belarusian Aeneid

The study of the Belarusian *Aeneid* began at the beginning of the 20th century, when the linguist Yaŭhim Karsky published the article Belarusian Aeneid on the wrong side… and included the consolidated edition of the text in an appendix. He used three manuscripts for his work. First, Mysloŭsky's manuscript for Vosip Badziansky (1830s); secondly, by V. Badziansky's manuscript for Pavel Shafarik (1837); thirdly, a manuscript by Barys Zalesky for V. Badziansky (1851). In the 1920s all these manuscripts were lost. For this reason, for researching the *Aeneid inside out,* was possible to use only the publication of J. Karsky. In 2018, Vyacheslaŭ Martysyuk discovered in the catalogs of the Russian State Archive of Ancient Documents the papers of V. Badziansky, among which were „the oldest editions" of the Belarusian *Aeneid*. The article analyses recently discovered copy of the *Aeneid* poem. Attention is drawn to the distinctiveness of „Mysloŭsky's copy" performed in Belarusian Latin (the presence of the letter *ŭ*, which denoted the sound [ŭ]). In our opinion, the absence of a „cokania" (pronunciation of the sound [ў] instead of [č]) in the manuscript of the *Aeneid*, which comes from the house of Ravinsky, may indicate that the Belarusian work does not belong to the pen of Vikenty Ravinsky.

K e y w o r d s: „The oldest editions" of the Belarusian *Aeneid*, features of graphics, unrepresented „cokanie", attribution

This article is distributed under the terms of the Creative Commons Attribution 3.0 PL
© Copyright by Uniwersytet Warszawski Katedra Studiów Interkulturowych Europy Środkowo-Wschodniej & individual articles to their Authors

doi: 10.32612/uw.2543618X.2024.pp.103-123

Przegląd Środkowo-Wschodni, 9, 2024
ISSN 2543-618X eISSN 2545-1324

Nr art. 20240904

Data przesłania: 28.03.2024
Data akceptacji: 04.05.2024

Dangiras Mačiulis
Instytut Historii Litwy
dangirasmaciulis@yahoo.com
ORCID: 0000-0001-6496-1538

„Obcy" w kulturze narodowej: kwestia orientacji kulturowej na Litwie w okresie międzywojennym XX wieku

Po I wojnie światowej Litwini utworzyli państwo narodowe, które miało zapewnić dominację litewskiej wspólnoty etnicznej w kulturze kraju. W ówczesnym dyskursie nacjonalizmu litewskiego dominowało przekonanie, że jedynie przedstawiciele narodu tytularnego – etniczni Litwini – mogą tworzyć litewską kulturę narodową. Jednocześnie jednak zdawano sobie sprawę, że dorobek kulturalny innych krajów będzie musiał zostać wykorzystany do tworzenia własnej kultury narodowej. W ten sposób doszło do dyskusji nad nacjonalizmem litewskim, w trakcie której zastanawiano się nad tym, co jest „swoje", a co „obce" w kulturze litewskiej; na jakich krajach można się wzorować, tworząc własny dorobek kulturalny; jakich wzorców należy unikać. Pojawiło się pytanie o orientację kulturową kraju. W dyskursie na temat nacjonalizmu litewskiego najbardziej obawia się negatywnych wpływów kulturowych dużych państw ościennych (Rosji, Polski i Niemiec). Intelektualiści litewscy postanowili wykorzystać dorobek kulturalny krajów reprezentujących kulturę zachodnią, podczas gdy kulturę Wschodu, utożsamianą z Rosją, odrzucono jako nieodpowiedni przykład dla Litwinów. Dominująca na Litwie tożsamość katolicka sprawiła, że elity kraju ze względu na swoją orientację kulturową wybrały jako wzór do naśladowania kraje reprezentujące katolicką kulturę zachodnią, przede wszystkim Francję.

Słowa kluczowe: nacjonalizm litewski, orientacja kulturowa, wpływy kulturowe, litewska kultura narodowa, Republika Litewska (1918–1940)

Po I wojnie światowej Litwini utworzyli własne państwo narodowe. Zrealizowany projekt państwowości stworzył warunki do rozwoju kultury narodowej, co nastąpiło poprzez powołanie instytucji o charakterze kulturalnym (takich jak teatr, muzeum, biblioteka itp.), zapewnienie warunków rozwoju profesjonalnej twórczości artystycznej i ekspresji kulturalnej mas. Projekt kultury narodowej miał na celu zagwarantowanie dominacji litewskiej społeczności etnicznej w dziedzinie kultury. Litewsko-francuski semiotyk i teoretyk literatury Algirdas Julius Greimas, odpowiadając na pytanie, co przyniosło niepodległe państwo litewskie w okresie międzywojennym XX w., stwierdził, że najważniejszym osiągnięciem było to, że naród zdał egzamin dojrzałości – dla Litwina stało się oczywiste, że nie jest Polakiem ani Rosjaninem, ale Litwinem[1]. Jego zdaniem po zamachu stanu w grudniu 1926 r., kiedy władzę przejął prezydent Antanas Smetona, na Litwie miała miejsce tak zwana litewska rewolucja – lituanizacja kraju[2]. Dążono do dominacji nie tylko poprzez promowanie kultury litewskiej, ale także przez usunięcie z niej tego, co uważano za „obce". Proces ten zainspirował długotrwałą debatę publiczną o tym, co jest „swoje", a co „obce" w kulturze litewskiej, jaka orientacja kulturowa jest potrzebna Litwie i jakie „obce" wpływy mogą stanowić zagrożenie dla narodu litewskiego. Celem artykułu jest przegląd kwestii „obcych" w litewskim dyskursie nacjonalistycznym w okresie międzywojennym XX w. oraz udzielenie odpowiedzi na następujące pytania: jakie wpływy uznawano w przypadku kultury litewskiej za „obce", a jakie tolerowano, jak „obcy" wpływali na wybór oferowanej Litwie orientacji kulturowej.

Przed odbudowaniem państwowości w prasie litewskiego ruchu narodowego nie pojawiały się rozważania teoretyczne o problemach kultury narodowej. Ograniczano się do obrony prawa do tworzenia kultury narodowej w języku ojczystym. Wyzwolenie spod obcych wpływów rozumiano zatem jako wywalczone i obronione uprawnienie do two-

[1] A.J. Greimas, *Iš arti ir iš toli*, Vilnius 1991, s. 321.
[2] Ibidem, s. 258.

rzenia w języku litewskim. Filozof Stasys Šalkauskis był pierwszym, który konceptualnie podszedł do problemu litewskiej kultury narodowej. W wydanej w 1919 r. w Genewie po francusku książce *Ties dviejų pasaulių riba. Sintetinis esė apie lietuvių tautinės civilizacijos problemą* (Na granicy dwóch światów. Syntetyczny esej o problemie litewskiej cywilizacji narodowej) przedstawił oryginalną koncepcję, która obejmowała problem orientacji kultury litewskiej oraz obcych wpływów.

W eseju Šalkauskis zaprezentował ideę kultury litewskiej jako syntezę kultur Wschodu i Zachodu. Twierdził, że w przypadku Litwy jest ona zdeterminowana przez jej położenie geopolityczne, na skrzyżowaniu dwóch światów – Wschodu i Zachodu. Przypominając historię, pisał:

> Litwini, może nie tyle geograficznie, ile kulturowo, byli pośrednikami między Słowianami wschodnimi i zachodnimi, z Rosjanami na czele tych pierwszych i Polakami na czele tych drugich. Litwa najpierw nawiązała stosunki z Rosją, a następnie z Polską, ale nigdy całkowicie się nie odwróciła ani od jednej, ani od drugiej. Jej pozycja i rola pośrednika odgrywana przez naród litewski sprawiły, że Litwa stała się polem bitwy między Rosjanami a Polakami o dominację w świecie słowiańskim. Na Litwę z obu stron oddziaływał szeroki wachlarz wpływów intelektualnych i politycznych. Rosja przejęła kulturę chrześcijańską ze Wschodu, a Polska z Zachodu. Na Litwie ścierały się te dwie rywalizujące ze sobą mentalności[3].

Šalkauskis był przekonany, że Litwini, aby zapewnić sobie istnienie i dobrobyt, „muszą zachować równowagę między Wschodem i Zachodem w swojej polityce i cywilizacji", ponieważ doświadczenie historyczne pokazuje, że naród sprostał wyzwaniom związanym z sytuacją geopolityczną w takim stopniu, w jakim ta równowaga była utrzymywana. Argumentował, że „naród litewski może żyć pełnią życia tylko wtedy, gdy uda mu się połączyć elementy kultury rosyjskiej i polskiej w jedną litewską kulturę narodową i ustanowić zewnętrzną równowagę, przynajmniej lokalnie lub częściowo, między światem germańskim

[3] S. Šalkauskis, *Raštai*, Vilnius 1995, t. 4, s. 36.

i słowiańskim". Nie miał wątpliwości, że Litwa może odgrywać rolę „solidnego państwa pośredniego" między dwoma światami, a zadaniem narodu litewskiego jest synteza dwóch cywilizacji, Wschodu i Zachodu[4].

Borecki, P. *Uwagi o statusie prawnym wyznawców judaizmu na ziemiach polskich,* Czasopismo Prawno-Historyczne Tom LXII – 2010 – Zeszyt 2, 2010.

Kozłowski, H. *Restytucja mienia gmin wyznaniowych i organizacji żydowskich,* Warszawa 2014.

United States Holocaust Memorial Museum, Washington, DC, *JEWISH POP-*

ULATION OF EUROPE IN 1933: POPULATION DATA BY COUNTRY, https://encyclopedia.ushmm.org/content/en/article/jewish-population-of-europe-in-1933-population-data-by-country, [access: 30.05.2024].

Walencik, D. *Revindication of religious organizations' properties in Poland: Thirty years' experience of building a democratic state ruled by law,* Studia z prawa wyznaniowego 2022, Vol. 25.

Żbikowski, A. *Gmina Wyznaniowa*, https://sztetl.org.pl/pl/slownik/gmina-wyznaniowa, [access: 30.05.2024].

https://turystyka.wp.pl/tysiace-chasydow-w-niewielkim-miescie-w-polsce-piel-grzymki-z-roznych-stron- swiata-7000903328385568a, [access: 29.05.2024].

Order of the Supreme Court of October 13, 1960, ref. III CO 27/60.

Judgment of the Supreme Court of November 30, 1971, ref. II CR 525/71.

This article is distributed under the terms of the Creative Commons Attribution 3.0 PL
© Copyright by Uniwersytet Warszawski Katedra Studiów Interkulturowych Europy Środkowo-Wschodniej & individual articles to their Authors

doi: 10.32612/uw.2543618X.2024.pp.159-183

Przegląd Środkowo-Wschodni, 9, 2024
ISSN 2543-618X eISSN 2545-1324

Nr art. 20240908

Data przesłania: 23.04.2024
Data akceptacji: 04.05.2024

Сцяпан Захаркевіч
Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт
stsiapan.zakharkevich@ehu.lt
ORCID: 0000-0002-8520-2730

Пошукі і прэзентацыі агульных ідэнтыфікацый беларусаў напрыканцы XX – першай чвэрці XXI ст.: прыклад „бульбашоў"

Poszukiwania i prezentacje ogólnych identyfikacji Białorusinów końca XX – pierwszej ćwierci XXI wieku na przykładzie „bulbaszy"

Artykuł poświęcony jest zrozumieniu zjawiska tożsamości współczesnych Białorusinów poprzez kategorię „bulbaszy". Identyfikacja ta jest ściśle związana z ważnym pokarmem dla białoruskiej kultury – ziemniakami. W związku z kryzysem ideologicznym społeczeństwa białoruskiego po rozpadzie ZSRR etnofolizm o pejoratywnym znaczeniu „bulbaszy" zyskał zastosowanie przez samych Białorusinów i stał się środkiem i formą identyfikacji części społeczeństwa. Stało się to możliwe dzięki splotowi trzech głównych czynników związanych z uprawą ziemniaków i kategoryzacją siebie poprzez fenomen ziemniaków – apolityczności w warunkach silnej presji politycznej, zdolności do wystarczającej niezależności od władzy w sytuacji kryzysu gospodarczego. Ponadto uprawa ziemniaków wymaga znacznego wysiłku społecznego, zaś władze manipulują tą okolicznością. Pojęcie ziemniaka przestało być określeniem odnoszącym się wyłącznie do żywności i nabrało nowego znaczenia w wymiarze symboliki społecznej, z którego aktywnie korzystają zarówno politycy, jak i zwykli ludzie.

Słowa kluczowe: tożsamość Białorusinów, kategoryzacja zewnętrzna Białorusinów, „bulbasze" jako przykład identyfikacji Białorusinów, współczesna kultura Białorusi, współczesna Białoruś

Пытанне ідэнтычнасці, ідэнтыфікацыі, этнічнай ці нацыянальнай свядомасці беларусаў з набыццём дзяржаўнай незалежнасці ў 1991 г. атрымала незвычайную актуальнасць і да сённяшняга часу не страціла яе ў палітычнай сферы, а таксама ў навуковай думцы. З 2020 г. назіраецца новая хваля ўздыму цікавасці да гэтай праблемы. Значная колькасць палітыкаў, экспертаў і навукоўцаў з розных галін гуманістыкі і сацыяльных дысцыплін (гісторыкі, сацыёлагі, палітолагі, філосафы, этнолагі, антраполагі, псіхолагі і інш.) пастаянна выкарыстоўваюць гэтыя дэфініцыі і вызначэнні. Можна пагадзіцца са знакамітым выразам Філіпа Глісана, што „ў размове аб этнічнасці цяжка абысціся без слова *ідэнтычнасць*".[1] Ужо з упэўненасцю можна зрабіць некалькі высноў аб гэтых візіях і падыходах у адносінах да беларусаў.

Па-першае, ідэнтыфікацыя і самаідэнтыфікацыя беларусаў пачынаючы з пачатку XX ст. заўсёды моцна палітызавалася. Палітыкі імкнуліся яе інструменталізаваць, надзяляючы асобнай палітычнай вартасцю ці нават эсэнцыялізуючы, разглядаючы як асобны феномен, што можа існаваць нават па-за беларусамі як людзьмі. У гэтым працэсе заўважная фактычная аб'ектывацыя беларусаў. Ідэнтычнасць беларусаў „патрабуе пільнай увагі", яе „патрэбна ствараць", „фармаваць", „развіваць", што сведчыць аб адмове людзям у суб'ектнасці і праве ўласна вызначаць візіі сябе, свайго месца ў беларускім грамадстве і свеце, ці аб сумневу ў праве беларусаў рабіць гэта самастойна. Паказальным з'яўляецца інтэрв'ю беларускага палітыка Аляксандра Мілінкевіча, які сказаў ад 23 лістапада 2023 г.: «Калі мы не здабудзем ідэнтычнасць, мы прайграем Беларусь»[2]. Падаецца, што часцей за ўсё гаворка ідзе не пра адсутнасць у беларусаў ідэнтычнасці/ідэнтыфікацыі, а аб адсутнасці ў іх „патрэбнай" ці „правільнай" ідэнтычнасці на

[1] P. Gleason, *Identifying Identity: A Semantic History*, The Journal of American History. Vol. 69. № 4. 1983. c. 910.

[2] А. Милинкевич, *Без идентичности мы потеряем Беларусь* https://www.youtube.com/watch?v=ndch2i-JhZE [Доступ: 11.03.2024].

думку экспертаў. Нярэдка эксперты і палітыкі падазрона глядзяць на беларусаў, як на дзяцей, якія яшчэ не разабраліся ў „дарослых пытаннях" і таму ім трэба патлумачыць іх, падказаць і навучыць. Асобна можна адзначыць існаванне думак і пазіцый аб тым, што ёсць „правільныя" ідэнтыфікацыі, звязаныя з падтрымкай пэўнага набору паняццяў, каштоўнасцей і ідэй (агульная і старадаўняя беларуская гісторыя; беларуская мова; элементы традыцыйнай беларускай вясковай культуры; еўрапейскасць і г.д.) і „неправільная" свядомасць (накіраванасць на Расію, добрыя пачуцці да савецкага перыяду, апалітычнасць)[3]. Такое спрашчэнне аналітычных высноў аб шматгранных, а таксама метадалагічна і інструментальна вельмі складана даследуемых праблемах ідэнтыфікацый, безумоўна, стварае скажоную карціну культурнай і сацыяльнай рэчаіснасці сучаснага беларускага грамадства. Па-сутнасці, гэта праявы дзіўнай трансфармацыі „палітыкі ідэнтычнасці", свядомага канструявання калектыўнай ідэнтычнасці, накіраванае на паляпшэнне патрэбных характарыстык[4]. Гэты падыход разглядае беларусаў як дыскрымінуемую групу, якой навязваецца думка аб наяўнасці ў іх „неправільнай" ідэнтычнасці. Севярын Квяткоўскі ў сваёй кнізе з гучнай назвай „Як стаць беларусам" ва ўводзінах адразу катэгарычна заяўляе: „Вам ужо не трэба рабіцца беларусам? Паколькі вы ўжо не Нехта, а Хтосьці? Тады гэтая кніга *можа дапамагчы* некаму з вашых родных, сяброў ці знаёмых"[5].

Па-другое, назіраецца моцная тэндэнцыя гістарызацыі феномена ідэнтычнасці ці ідэнтыфікацый беларусаў. Перадусім гаворка ідзе аб пошуках сучасных уяўленняў беларусаў аб сабе і ўласным месцы ў свеце, грамадстве і г.д. праз далёкія гістарычныя падзеі (напрыклад першай паловы XX ст., XIX ст., а бывае, што нават

[3] З. Лукашук, М. Гаруноў, *Беларуская нацыянальная ідэя*. Варшава 2022; З. Лукашук, М. Гаруноў, *Беларуская нацыянальная ідэя на маршы*. Варшава 2022.

[4] Ф. Фукуяма, *Идентичность: Стремление к признанию и политика неприятия*. Москва, 2019, с. 33 – 34.

[5] С. Квяткоўскі, *Як стаць беларусам. Сто гісторый*. Мінск 2014, с. 11.

і XVIII ст.). Тут можна прывесці цытату з ужо класічнай працы польскага сацыёлага Рышарда Радзіка „Вакол ідэнтычнасці беларусаў": „Каб зразумець беларускую сучаснасць, трэба звярнуцца да мінуўшчыны"[6]. Дарэчы, назва іншай працы гэтага аўтара таксама гаворыць сама за сябе – „Вытокі сучаснай беларускасці"[7]. Беларускі сацыёлаг Філіп Біканаў, які даследуе сучаснае беларускае грамадства (фактычна пасля 2020 г.), прапанаваў сваё разуменне нацыянальнай ідэнтычнасці: „Нацыянальная самасвядомасць — феномен масавай свядомасці, што выяўляецца ў пачуцці прыналежнасці да пэўнай нацыі і адчуванні адасобленасці гэтай нацыі ад іншай дзякуючы адзінству мовы, гістарычнага шляху, культурных і антрапалагічных асаблівасцяў, якія сфармаваліся ў выніку гісторыка-культурных працэсаў на пэўнай тэрыторыі"[8]. Гэтае вызначэнне таксама абапіраецца на заўважны гістарычны фактар. Аднак кожная нацыя праходзіць канкрэтны гістарычны шлях і мае пэўныя гісторыка-культурныя працэсы, таму пошук гістарычных канатацый гэта хутчэй размова аб гістарычнай памяці. Узнікненне БНР і БССР, расійская імперская палітыка і нават падзелы Рэчы Паспалітай нярэдка разглядаюцца палітычнымі экспертамі як прамыя механічныя прычыны таго, што адбываецца зараз[9]. Нават палітычным сімвалам, створаным стагоддзя таму, прыпісваецца сакральны сэнс: „Бел-чырвона-белы: код нацыі"[10]. Безумоўна, было б неабачлівым непагаджацца з відавочнымі тэндэнцыямі глабальнага гістарычнага працэсу. Аднак пры абмеркаваннях ці аналізе сучас-

[6] Р. Радзік, *Вакол ідэнтычнасці беларусаў*. Мінск 2017, с. 172.

[7] Р.Радзік, *Вытокі сучаснай беларускасці.* Мінск 2012.

[8] Ф. Біканаў, *Беларусская национальная идентичность в 2022 году: опыт количественного исследования,* https://library.fes.de/pdf-files/bueros/belarus/ 19770-20221206.pdf [доступ: 06.02.2024].

[9] З. Пазняк, *„Беларусь перадусім" – гэта сёння наша галоўная націдэя*, З. Лукашук, М. Гаруноў, *Беларуская нацыянальная ідэя*. Варшава 2022, с. 34; П. Латушка, *Веру ў Беларусь, беларускі народ і яго будучыню*, З. Лукашук, М. Гаруноў, *Беларуская нацыянальная ідэя на маршы*. Варшава 2022, с. 37 – 38.

[10] *Бел-Чырвона-Белы. Сцяг. Нацыя. Ідэнтычнасць*. Ząbki 2023, с. 91–102.

ных ідэнтыфікацый беларусаў, хутчэй трэба вывучаць і даследаваць гісторыю апошніх 50–70 гадоў, перыяду рэальнага жыцця сучаснага беларускага грамадства (прынамсі трох – чатырох апошніх пакаленняў беларусаў). Таму ключавымі тут з'яўляюцца пасляваенная гісторыя БССР і найноўшая гісторыя Рэспублікі Беларусь. Аднак у беларускай гістарыяграфіі гэты перыяд настолькі запрапагандаваны і ідэалагізаваны, што з цяжкасцю можна прыгадаць значную колькасць айчынных агульнапрызнаных і ўплывовых гістарычных даследаванняў гэтага перыяду[11]. Тое самае датычыцца беларускай этнаграфіі/этналогіі, якая засяродзілася на вывучэнні ці можа нават „вымысленні" „пражыткаў" традыцыйнай вясковай беларускай культуры, як аўтэнтычнай канцэнтрацыі сакральнай „беларускасці"[12]. Ідэнтычнасць ці свядомасць беларусаў (ці вузей палякаў Беларусі) цікавіла польскіх этнолагаў і філолагаў[13]. Гістарычныя даследаванні гэтага перыяда накіраваныя на даследаванні элітаў і інтэлігенцыі[14]. Татальна не хапае даследаванняў мясцовай,

---

[11] І. Раманава, І. Махоўская, *Мір: Гісторыя мястэчка: что расказалі яго жыхары.* Вільня 2009. 248 с; Д. Марціновіч, *Слюнькоў. Палітычная біяграфія.* Ząbki, 2023. 294 с.; В. Шадурскі, *Нараджэнне беларускага Левіафана. Беларусь: ад парламенцкай рэспублікі да аўтарытарнага рэжыму (1990–1996).* Беласток 2024. 280 с. і інш.

[12] С. Захаркевіч, *Традыцыйная культура беларусаў: удалы праект культурнай спадчыны Беларусі, інструменталізаваны этнаграфіяй,* CTRL+. Утопіі нашай спадчыны. Вільня, 2023, с. 39 – 48.

[13] K. Waszczyńska, *Kto to est szlachcic, czyli o obrazie szlachcica w oczach współczesnych mieszkańców pogranicza litewsko-białoruskiego*. Etnografia Polska. 40. Z. 1– 2, с. 155 – 187; I. Kabzińska, *Wśród „kościelnych Polaków"*. Warszawa 1999; A. Engelking, *Kołchoźnicy. Antropologiczne studium tożsamości wsi białoruskiej przełomu XX i XXI wieku*. Toruń 2012; J. Kozłowska-Doda, *Tożsamość, losy i język najstarszych mieszkańców okolic Dociszek na Białorusi*. Lublin 2021.

[14] Т. Астроўская*, Культура і супраціў. Інтэлігенцыя, іншадумства і самвыдат у савецкай Беларусі (1968– 1988).* Беласток 2022. 278 с.; Г. Сагановіч. *Іншадумства акадэмічнай інтэлігенцыі ў БССР эпохі адлігі,* „Беларускі Гістарычны Агляд" (далей БГА). 2021 Т. 28 Сш. 1– 2. [Доступ: 10.04.2024]; Г. Сагановіч. *„Возможны негативные последствия", або Дыскусія пра балцкі субстрат у БССР эпохі Машэрава*, БГА. 2023 Т. 30 Сш. 1– 2 [Доступ: 10.04.2024].

рэгіянальной і агульнарэспубліканскай паўсядзённасці, руціны, масавай культуры, публікацыі крыніц аб гэтым. Прамая гістарызацыя такога складанага і дыскусійнага феномена як ідэнтычнасці ці ідэнтыфікацыі вельмі небяспечная. Буйны тэарэтык нацыяналізму Роджэр Брубэйкер, напрыклад, вельмі скептычна выказаўся аб гістарызацыі нацыянальных ідэнтычнасцей[15].

З гістарызацыі выцякае трэцяя тэндэнцыя – імкненне сфармуляваць, апісаць, а значыць і сканструяваць наяўнасць у беларускім грамадстве падзелу па палітычнаму (а аўтаматычна значыць і па ідэнтычнасцёваму і свядомаснаму прынцыпу) выбару беларусаў. Такое спрашчэнне зразумелае і чаканае. Сацыялагічныя апытанні з-за мяжы яго знаходзяць, а эксперты аналізуюць і асэнсоўваюць, а затым канструююць сацыяльную рэчаіснасць. Так, напрыклад, вядомы беларускі сацыёлаг Андрэй Вардамацкі прама кажа „пра падзеленасць ідэнтычнасці сярод беларусаў. Ізноў-такі, мы бачым праяўленне паралельнага грамадства – фактар, пра які мы не раз казалі ў дачыненні да іншых сфер”[16]. Ён актыўна называе гэта „водападзелам ідэнтычнасці”, аналізуе гістарычную памяць (ВКЛ, БССР і г.д.), выкарыстоўвае тэрмін „падзеленасць ідэнтычнасці сярод беларусаў”. Пры гэтым уяўляе ідэнтычнасць як статычны вынік, дасягальную кропку: „працэс *станаўлення* ідэнтычнасці працягвае дынамічна развівацца”[17].

Чацвёртая тэнденцыя – адсутнасць дыстанцыі ці выразнага падзелу паміж мовай палітычнай практыкі і катэгорыямі навуковага аналізу свядомасці і ідэнтыфікацыі. Акадэмічныя даследчыкі ўжо разумеюць гэтую праблему, і адмыслова ствараюць уласныя тэрміны для аналізу, каб паказаць і дапамагчы чытачам усвядоміць розніцу паміж палітыкай і навукай[18].

---

[15] Р. Брубейкер, *Мифы и заблуждения в изучении национализма*, Мифы и заблуждения в изучении империи и национализма. Москва 2010, с. 80.

[16] А. Вардамацкі. *Беларусы і іх нацыянальная ідэнтычнасць*, БГА. 2020 Т. 27 Сш. 1– 2, с. 189– 198. [доступ: 10.04.2024].

[17] Ibidem.

[18] Р. Брубейкер, *Мифы и заблуждения в изучении…* с. 64.

Вылучаючы гэтыя тэндэнцыі і падыходы, вельмі важным падаецца таксама вызначыцца з дэфініцыямі. Што значыць нацыянальная ідэя, нацыянальная свядомасць, самасвядомасць, ідэнтычнасць ці можа ідэнтыфікацыя, а нават ідэнтыфікацыі ў множным ліку. Як разумець гэтыя катэгорыі абстрактна і асобна, так і ў звязку з Беларуссю, беларусамі, асобамі і групамі. А таксама што значаць вартасцёвыя іх адзнакі: быць свядомым ці самасвядомым беларусам добра і правільна, а тым, хто не падпадае пад гэтакую нарматыўнасці – быць нядобрымі і неправільнымі. Той, хто размаўляе па-беларуску, носіць вышымайку ці нават мае сапраўдную вышыванку, хто падзяляе еўрапейскія каштоўнасці (цікава гэта якія?), той лічыцца „сапраўдным беларусам". Дзе праходзіць мяжа дакладнага вызначэння „сапраўднага" і „несапраўднага" беларуса? Але звярніце, калі ласка, увагу, што ў гэтым пытанні і той і другі ўсё адно беларус!

Польская даследчыца беларускай культуры Катажына Вашчыньска ў сваім грунтоўным аналізе праблемы ідэнтычнасці звяртае ўвагу на тое, што гэты феномен звязаны з рознымі аспектамі спадчыны, традыцый, этнічнай і культурнай разнастайнасці і гэтым ускладняецца і дадае цяжкасці ў разуменні і дакладнай катэгарызацыі[19]. Польская даследчыца Беларусі Ганна Энгелькінг так вызначала калектыўную ідэнтычнасць: „носьбіты культуры надаюць сэнс культурным адрозненням, якія фармуюць іх ідэнтычнасць, а не фармуюцца адрозненнямі, якія існуюць «аб'ектыўна»"[20]. Яна рабіла акцэнт на сімвалічныя адрозненні, а не натуралістычныя, і звяртала ўвагу на мову, з дапамогай якой ствараюцца вобразы, што могуць разглядацца як выраз ідэнтычнасці[21].

Феномен ідэнтычнасці складаны, зменлівы, спрэчны і цяжка вывучаемы. Існуе шмат дыскусій на яго конт, падыходаў да яго раз-

[19] K. Waszczyńska, *Wokół problematyki tożsamości*, Rocznik Towarzystwa Naukowego Płockiego. 2014. nr 6, c. 69.

[20] A. Engelking, *Kołchoźnicy. Antropologiczne studium tożsamości wsi białoruskiej przełomu XX i XXI wieku*. Toruń 2012, c. 25.

[21] Ibidem, c. 26.

умення і нават ідэі аб яго неіснаванні ці бессэнсоўнасці вывучэнні гэтакай аморфнай і цякучай з'явы. Вынік гэтых дыскусій залежыць ад поглядаў акадэмічных удзельнікаў дыскусій – прымардыялісцкіх, канструктывісцкіх ці інструменталісцкіх, і пазіцый палітычных экспертаў. Гэты артыкул не мае на мэце такога тэарэтычнага аналізу феномена ідэнтычнасці ў цэлым і вырашэння таго, якая з канцэпцый мае большую рацыю.

Артыкул накіраваны на вызначэнне непалітычных праяў агульнабеларускіх ідэнтыфікацый (магчыма знешніх катэгарызацый) на адным асобным прыкладзе „ідэі бульбашоў", аналіз і характарыстыка якіх могуць дадаць яшчэ крок да нашага разумення сістэмы каштоўнасцей сучаснага беларускага грамадства і яго ўдзельнікаў, якія, на жаль, моцна скажоныя прапагандысцкімі маніпуляцыямі і палітызацыяй. Падаецца, што гэта дазволіць больш дэтальна зразумець палітычныя і нацыянальныя працэсы ў беларускім грамадстве. Па-сутнасці, усе дыскусіі аб беларусах у межах праблемы ідэнтычнасці звужаюцца да нацыянальнай ідэнтычнасці і гендэрных уяўленняў, як самых актуальных палітызаваных тэм і іх т.зв. „грантарэсурснасці". Аднак, калі эксперты размаўляюць аб феномене адчування прыналежнасці чалавека з Беларусі да беларускай нацыі (дзе адразу ўзнікае новае складанае пытанне – а што такое беларуская нацыя!), то гэтая праблема не можа вырашацца без вывучэння і разумення іншых формаў праяў ідэнтыфікацыі людзей з Беларусі. Гэта абумоўлена перш за ўсё тым, што нацыянальныя і палітычныя ўяўленні людзей будуюцца не абстрактна, а ў межах больш складаных „букетаў" ідэнтыфікацый. Напрыклад, адчування прыналежнасці да мясцовасці, лакальных груп і супольнасцей і г.д. І ўсе яны яшчэ пастаянна змяняюцца ў часе, прасторы і пад уплывам розных навакольных фактараў.

Гэты артыкул – спроба выйсці за межы палітызацыі і гістарызацыі вывучэння ідэнтыфікацый беларусаў. Я наўмысна не буду выкарыстоўваць такія анталагічныя і халістычныя, а можа нават эсэнцыялістычныя тэрміны як ідэнтычнасць ці свядомасць, бо

мне падаецца, што зараз адсутнічаюць дастатковыя магчымасці і матэрыялы, каб сфармуляваць іх, калі яны сапраўды існуюць.

Гэта як раз спроба паразважаць аб падзелах, уяўленнях і катэгарызацый, што рэальна функцыянуюць у беларускім грамадстве, аказываюць уплывы на руцінныя і штодзённыя практыкі жыцця, выбары і маральныя правілы. „Менавіта недахоп у беларускім грамадстве згоды наконт культурнай самабытнасці, значэння беларускай мовы і ўзгодненасці розных уяўленняў пра ўласную культуру і гісторыю разглядаецца як слабасць беларускай калектыўнай ідэнтычнасці”[22].

У пэўным сэнсе гаворка будзе ісці аб так званых „гібрыдных” ідэнтыфікацыях, якія змагаюцца адна з адной[23]. У дадзеным выпадку можна прапанаваць тэрмін „культурныя катэгарызацыі”, як калектыўныя ўяўленні, што дапамагаюць беларусам разумець сябе і іншых, адносіць сябе да пэўнай групы ці супольнасці, набор каштоўнасцей, што дапамагаюць арганізоўваць свет вакол сябе, катэгарызаваць, структураваць яго, рабіць зразумелым і прагназаваным.

Артыкул абапіраецца на аналіз сацыяльных сетак (перадусім Facebook’a) і вялікай колькасці мемаў і reels, створаных у сувязі з даследуемай тэматыкай. З-за абмежаванасці аб’ёма тэкста артыкула, аўтар сканцэнтраваўся на аналізе толькі аднага прыклада гэтакай ідэнтыфікацыі – выкарыстання катэгорыі „бульбаш”[24].

---

[22] О. Шпарага, *Национальные идентичности в 21-м веке: перспектива для Беларуси,* https://reform.by/nacionalnye-identichnosti-v-21-m-veke-perspektiva-dlja-belarus [доступ: 10.03.2024].

[23] M. Rohava, *Identity in an Autocratic State: Or What Belarusians Talk about When They Talk about National Identity*, East European Politics and Societies and Cultures, August 2018, https://www.researchgate.net/publication/326456493 [доступ: 09.03.2024].

[24] Выказваю падзяку ўсім сваім студэнтам і слухачам, на занятках з якімі ў розных установах за апошнія 5-6 гадоў неаднаразова абмяркоўвалася гэтая тэма.

«Бульбяны» патрыятызм ці як любіць «Драніклэнд»: катэгорыя „бульбаш" як апалітычны/анархістскі маркер беларускай ідэнтыфікацыі

Дранікі – сіла, кажуць, што дранікі
Гэта культура нейкай керамікі
Дранікі – гэта смачная акцыя
Якую праводзіць бульбяная нацыя[25]

Кухня заўсёды адыгрывае важную ролю ў ідэнтыфікацыях чалавека: «Скажы мне, што ты ясі, і скажу, хто ты»[26]. Ежа з'яўляецца эфектыўным і зразумелым інструментам нацыяналізму[27]. Беларусы доўгі час былі носьбітамі традыцыйнай аграрнай культуры, займаліся земляробствам і жывёлагадоўляй. Гэта абумоўлівала і рацыён харчавання – беларусы елі шмат кашаў і хлеба. Бульба даволі позна ўвайшла ў рацыён харчавання і культуру беларусаў, аб чым сведчыць яе адсутнасць у традыцыйных святочных і рытуальных стравах беларусаў. Аднак у рэгіёне яна з'явілася дастаткова рана[28]. З другой паловы XIX ст. бульба становіцца важнай сельскагаспадарчай раслінай і стравай у рацыёне беларусаў. Культурную сувязь беларусаў з бульбай адзначалі падарожнікі, даследчыкі, этнографы. Ужо пачатку XIX ст., напрыклад, гэта засведчыў В. М. Севяргін, апісваючы ваколіцы Гродна: «картофели здесь есть, как и во всей Литве; но в недовольно большем количестве»[29]. А ў пачатку XX

[25] Я. Карлюк, *Дранікі*, https://vershy.ru/content/draniki [Дата досутпа: 15.10.2023].

[26] Дж. Ковини, *Гурманистика. Культура еды и еда как культура*. Харьков 2016, с. 39–40.

[27] K. Walczak, *Patriotyzm w kuchni. Kilka uwag o kształtowaniu polskiej tożsamości narodowej za pomocą noża i widelca*, Kulturowe analizy patriotyzmu. Gdańsk 2016, c. 555 – 572.

[28] P. Badyna, *Wybrane historie kartofla – Fryderyk II i ziemie polskie od XVII do połowy XIX stulecia*, Kultura – Historia – Globalizacja. 2015. nr 18, c. 1 – 20.

[29] В. Севергин, *Записки путешествия по западным провинциям Российскаго государства*. Санкт-Петербург, 1803, с. 115. Цыт. па: Ю. Внуковіч, *Характары-*

ст. гэты тэзіс стаў нормай: „Бульба ці размазня з жытняй крупы – звычайная ежа небагатага беларуса. Хлеб не заўсёды маецца ў запасе”.[30] Чэслаў Пяткевіч ў кнізе „Рэчыцкае Палессе” ўзгадваў, што фартэпіяна мясцовыя называлі картаплянам ці ў некаторых мясцовасцях на памежжы з Магілёўскай губерніяй называлі картапляскі: „Ніхто так чудна не грае на картапляні, як маканавіцкі пан”[31]. Магчыма, гэта ўжо сведчыць аб пашырэнні вартасцей бульбы за межы толькі комплекса харчавання.

Расійская імперыя і СССР, як вялікія сукупнасці этнічных супольнасцяў і культураў, стваралі ўмовы для міжэтнічных кантактаў сярод насельніцтва буйных эканамічных і індустрыяльных цэнтраў, мабілізаваных мужчынаў у арміі і г.д. Кожная з этнічных груп, супольнасцей і народаў атрымлівала пэўныя назвы (этнафалізмы), якія маглі абапірацца на розныя стэрэатыпы. Шырокае выкарыстанне страў з бульбы дзякуючы этнаграфічнай літаратуры стала заўважным не толькі ў інтэлектуальнай прасторы, але і сярод шырокіх слаёў грамадскасці, чаму дапамагала і павышэнне мабільнасці людзей. А гэта паступова пачынае ўплываць і на этнічную катэгарызацыю і ідэнтыфікацыю. Так у XX ст. бульба зрабіліся адным з цэнтральных кулінарных маркераў беларусаў[32]. У палявых этнаграфічных матэрыялах беларускага этнографа Лідзіі Малчанавай з экспедыцыі 1951 г. у аповядах аб службы ў арміі падчас Другой сусветнай вайны зафіксавана: «Нас беларусаў звалі бульбянікамі»[33].

стычныя прыкметы беларусаў і літоўцаў у народаапісаннях XIX – пачатку XX стагоддзя, Беларускі фальклор: матэрыялы і даследаванні. 2024, с. 30.

[30] *Народы России. Краткие объяснительные очерки к Художественно-Этнографическому Альбому*, изданному под редакцией Н. А. Янчука. Москва 1905, с. 81 – 82.

[31] Ч. Пяткевіч, *Рэчыцкае Палессе*. Мінск 2004, с. 522 – 523.

[32] Ю. Внуковіч, *Характарыстычныя прыкметы беларусаў і літоўцаў у народаапісаннях XIX – пачатку XX стагоддзя*, Беларускі фальклор: матэрыялы і даследаванні. 2024, с. 29.

[33] Архіў аддзела этнаграфіі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклора НАН Беларусі. Ф. 6, воп. 2, спр. 28. Материалы по истории семейных

Нават у кіраўніцтве СССР беларусы стэрэатыпна ўспрымаліся звязанымі з бульбай. Так, у першай палове 1980-х гг. пасля спробы кіраўніка Брэсцкага абкама партыі Яфрэма Сакалова наладзіць больш цесныя кантакты з Польшчай, яго выклікалі ў Маскву, дзе Міхаіл Суслаў (другая асоба ў СССР) зрабіў яму заўвагу: „Не лезьце ў не сваю справу. Вяртайцеся дадому і займайцеся сваёй картоплей”[34].

Набыццё Беларуссю незалежнасці прывяло да неабходнасці выпрацоўкі групамі ці беларускім грамадствам у цэлым новых ідэнтыфікацый і новых нацыянальных сімвалаў, альтэрнатыўных савецкім ці нейтральных у дачыненні да іх. Большасць вясковых кананічных традыцый ужо было знішчана ці забыта ў працэсе масавай урбанізацый 1970-1980-х гг., ці яшчэ не было ўзноўлена ці сканструявана „турыстычнымі прапановамі” і новай палітычнай прапагандай. У гэтай сітуацыі вобраз бульбы і „бульбашоў” ў шырокім сэнсе, а дранікі, як апалітычнае блюда маглі аб’яднаць правых і левых, еўрапейцаў, „савецкіх” і рускаарыентаваных. Гэта тэндэнцыя падмацоўвалася ўстойлівымі стэрэатыпамі з савецкіх часоў. У „народным” расійскім фільме „Любіць па-руску”, у трэцяй частцы (1999), адзін з галоўных герояў, губернатар Мухін, едзе ў Беларусь да даўняга сябра па дапамогу з словамі „Бульбашы не кінуць”[35]. Гэта была дэманстрацыя ўжо ўстойлівых і масава зразумелых у Расіі этнафалічных катэгорый, якія маглі б выклікаць абурэнне ці нязгоду ўласна беларусаў. Аднак масавых рэакцый не адбылося.

отношений. Записи ст. научн. сотрудника Молчановой Л.А. Полесская этнографическая экспедиция. Люты 1951 г. Хойницкий район. Арк. 13. Дакладная ідэнтыфікацыя дакументаў даволі складаная, што адзначалі і спецыялісты: С. Жумарь, *Документальные собрания Института искусствоведения, этнографии и фольклора Национальной Академии наук Беларуси, Архівы і справаводства*. 2003, nr 5, с. 74 – 75.

[34] Д. Марціновіч, *Слюнькоў. Палітычная біяграфія.* Ząbki 2023, с. 114.

[35] *Любить по-русски-3. Губернатор*. 1999. https://www.youtube.com/watch?v=BALzi-fUicw [Дата доступа: 12.03.2023].

Падчас палітычных крызісаў і моцнай палітызацыі асяроддзя, пошук і выкарыстанне палітычна нейтральных знешніх катэгарызацый і ідэнтыфікацый актуалізаваліся. Менавіта „харчовыя катэгорыі" маглі стаць аб'ядноўчым фактарам – усе, незалежна ад палітычных перавaг, разам сядаюць за стол, „прэламляюць хлеб", ужываюць „бізнэс-ланч", ідуць з офіса „на абед" і г.д. Моцным стымулам у час эканамічных праблем і інфляцыі для аб'яднання беларусаў стала знакамітая сезонная „гульня" 1990-х гг. – саджэнне і капанне бульбы на вёсцы, куды да бацькоў і дзядоў з'язджаліся дзеці і ўнукі, каб дапамагчы выкапаць „соткі". На адным полі сустракалася ўся сацыяльная структура грамадства Беларусі за адной справай: настаўнікі, чыноўнікі, вайскоўцы, працоўныя, навукоўцы, бізнэсоўцы. Бульба аб'ядноўвала беларусаў усіх узростаў, рангаў і статусаў! Да сённяшняга часу адгалоскі гэтага агульнага занятку беларускага грамадства можна назіраць у палітычным полі Беларусі[36]. Амерыканская антраполаг Нэнсі Рэйс лічыць, што бульба – гэта не проста расліна і ежа, а сімвал і каштоўнасная катэгорыя, што дапамагае канцэптуалізаваць постсацыялістычны свет, а таксама структураваць і падтрымоўваць яго[37]. У пэўным сэнсе аб падобным, звязаным з імкненнем беларусаў да лецішчаў і земляробству ў складаны час 1990-х пісаў французскі сацыёлаг Ронан Эрвуэ[38]. Бульбяны дыскурс таксама мог фактычна легітымізаваць і рэпрэзентаваць здольнасць беларусаў пракарміць сябе аўтаномна, нават насуперак дзяржаве і ўладам[39].

У пачатку незалежнасці Беларусі ў хаосе палітычных і эканаміч-

[36] *Лукашенко и картошка: зачем политики копаются в земле*, https://www.bbc.com/russian/society/2015/08/150817_tr_lukashenko_gardening_adventures [доступ: 16.02.2024].

[37] N. Ries, *Potato ontology: Surviving Postsocializm in Russia*, Cultural Anthropology, vol. 24, Issue 2, s. 182.

[38] R. Hervouet, *Dachas and vegetable gardens in Belarus: economic and subjective stakes of an „ordinary passion",* The Anthropology of East Europe Review. 2003. Vol. 21, nr 1, c. 163–164.

[39] N. Ries, *Potato ontology: Surviving*… c. 181.

ных ідэй, канцэпцый і практык быў патрэбны зразумелы і агульны сімвал, таму канцэпт „бульбашы" набыў новы сэнс – беларусы атрымалі ўласную „сакральную" харчовую пеяратыўную суб'ектнасць у лоне еўрапейскіх краінаў. „Бульбашы" атрымалі магчымасць патрапіць у адну катэгорыю з „макароннікамі", „жабаядамі", „калбаснікамі" і інш. А „бульбяная сімпатыя" супадае з абсалютна і бездакорна еўрапейскімі ірландцамі.

Бульбяная ідэнтыфікацыя стала настолькі заўважная, што яе пачалі выкарыстоўваць маркетолагі. Гарэлка „Бульбаш", напрыклад, стала адной з самых вядомых алкагольных марак ў Беларусі, і прадаецца практычна ў кожнай краме. Прычым з самага пачатку назву імкнуліся прывязаць да вобразу вясковага беларуса. На этыкетцы ў пачатку развіцця брэнда быў намаляваны вусаты дзядзька ў брылі і вышыванцы. Асацыяцыі вобраза адсылалі да кананічнага выгляду Уладзіміра Мулявіна з „Песняроў" ці амерыканскага кінагероя-рэстлера канца 1980 – пачатку 1990-х Халка Хогана. Цалкам магчыма, што вобраз з этыкеткі „Бульбаша" мог узнікнуць пад уплывам папулярных малюнкаў з дзіцячых кніжак беларускага мастака Уладзіміра Савіча, якія былі, напрыклад, надрукаваныя ў кнізе казак Ніны Мацяш у 1982 г. накладам 60 тысяч асобнікаў[40]. Сетка беларускіх кавярняў „Мама дома" некалькі год таму, калі ўводзіла ў сваё меню дранікі, рэкламавала гэта праз слоган „Дранікі. Краіна ўзыходзячай бульбы". Гэты слоган рабіў алюзіі на існаванне ў Беларусі своеасаблівай уласнай эстэтыкі, як і ў Японіі, але звязанай са складанасцю гадавання і прыгатавання бульбы.

Дарэчы, і алкагольны брэнд „Бульбаш" і іншыя падобныя яму, напрыклад, хлеб „Бульбаш" Слуцкага хлебзавода выклікалі заўважную рэакцыю інтэлектуалаў. Юрыст і вядомы грамадскі абаронца беларускай мовы Ігар Случак распачаў грамадскую кампанію

[40] Н. Мацяш, *Казка пра суседзяў, змяю і мядзведзя. Паводле беларускай народнай казкі*. (Мастак У. Савіч). Мінск 1982. Кніга аздоблена вялікай колькасцю малюнкаў мастака. Выказваю падзяку і ўдзячнасць за дапамогу С. Харэўскаму.

„Стоп бульбаш”, якая была накіраваная на барацьбу супраць выкарыстанне гэтага тэрміна ў маркетынгавых кампаніях і брэндах. Ім была замоўлена філалагічная экспертыза ў Інстытуце мовы НАН Беларусі, якая дала пазітыўную ацэнку выкарыстання тэрміна „бульбаш”, у адрозненні ад такіх, напрыклад, як экзаэтнонімы „маскаль”, „жыд”, „лабус” ці „пшэк”[41]. Асобная кампанія была арганізаваная І. Случаком супраць брэнда „Бульбаш” Слуцкага хлебазавода. Паказальнай з’яўлялася пазіцыя кіраўніцтва прадпрыемства, якое адзначала, што гэтых хлеб стаў візітнай карткай краіны і не раз атрымліваў высокія адзнакі на выставах. Акрамя гэтага, „прававых падставаў для забароны вытворчасці і рэалізацыі хлеба „Бульбаш” няма”[42]. Цікава, што кіраўніцтва прадпрыемства тлумачыла гэта тым, што „галоўны прадукт харчавання беларусаў – гэта бульба. Тое наша традыцыйнае, роднае і блізкае, на чым грунтуецца самасвядомасць людзей”[43]. Можна тут згадаць, што грамадская актыўнасць І. Случака прынесла плён – пасля шматгадовых зваротаў і актывізму Слуцкі хлебазавод у 2023 г. адмовіўся ад свайго брэнда хлеба „Бульбаш”, які існаваў з 2007 г.[44]

Таксама сваю негатыўную пазіцыю па пытанню выкарыстання тэрміна „бульбаш” выказаў вядомы мовазнаўца і філосаф Пётр Руд-

---

[41] *В Беларуси выясняли, оскорбительны ли слова «бульбаш», «москаль», «лабус» и «жид»*, https://www.delfi.lt/ru/abroad/belorussia/v-belarusi-vyyasnyali-oskorbitelny-li-slova-bulbash-moskal-labus-i-zhid-79081077 [доступ: 04.02.2024].

[42] Слуцкий хлебозавод ответил на обращение активистов с просьбой изменить название хлеба «Бульбаш», http://slutsk-gorod.by/novosti/item/slutskij-khlebozavod-otvetil-na-obrashchenie-aktivistov-s-prosboj-izmenit-nazvanie-khleba-bulbash [доступ: 10.02.2024].

[43] Слуцкий хлебозавод ответил на обращение активистов с просьбой изменить название хлеба «Бульбаш», http://slutsk-gorod.by/novosti/item/slutskij-khlebozavod-otvetil-na-obrashchenie-aktivistov-s-prosboj-izmenit-nazvanie-khleba-bulbash [доступ: 10.02.2024].

[44] І. Случак, *Бульбаш – усё*, https://www.facebook.com/ihar.sluchak/posts/pfbid0CT3vyDqV1HgQ7Smv1ZAKzpggHqv8ssRmW1abwX8Gq8VwG2V5UFhUX1kTyDrh5hMHl [доступ: 04.02.2024]; *Слуцкий хлебозавод больше не будет выпускать хлеб «Бульбаш»*, https://nashaniva.com/ru/332344 [доступ: 04.02.2024].

коўскі[45]. Ён падкрэсліваў менавіта пеяратыўнасць гэтага тэрміна і дзяліўся ўласным досведам адчування адмоўных эмоцый у войску, калі да беларусаў выкарыстоўвалі гэты экзаэтнонім.

Мовазнаўца Вінцук Вячорка прысвяціў асобную перадачу праблеме выкарыстання тэрміну „бульбаш"[46]. У сваім выступе ён падкрэсліў галоўны аргумент праціўнікаў аўтавыкарыстання беларусамі гэтага тэрміну і вобразу, бо ён з'яўляецца пеяратывам і мае адназначную негатыўную канатацыю. Аднак у выступе ён таксама прапанаваў вынікі журналісцкіх апытанняў на вуліцах Мінску, дзе да яго здзіўлення, беларусы дакладна тлумачылі што такое „бульбаш" і хто такі „бульбаш", а таксама ацэньвалі тэрмін абсалютна станоўча[47]. В. Вячорка прывёў толькі адзін прыклад негатыўнага стаўлення да гэтай катэгорыі – ад беларускі, якая чула яго ў Расіі ў дачыненні да сябе і ацэньвала яго як негатыўны. І тут бачная розніца паміж знешней катэгарызацыяй уласна беларусаў і экзаэтнонімам, які выкарыстоўвалі „не-беларусы", у дадзеным выпадку – расіяне. Унутраная ацэнка аўтаідэнтыфікацыі праз вобраз „бульбаша" абсалютна пазітыўная, а экзаэтнанімічная вызначэнне, асабліва ў канкрэтных асабістых выпадках камунікацый за мяжой Беларусі выклікае негатыўныя эмоцыі.

Аднак негледзячы на адмоўныя ацэнкі беларускіх інтэлектуалаў, знешняя катэгарызацыя беларусамі ўласна сябе праз тэрмін „бульбаш" працягваецца. Прычым назіраецца замацаванне гэтай тэндэнцыі праз вобраз бульбы як галоўнай расліны харчавання беларусаў.

У 2020 г. беларускі лінгвіст і даследчык Расійскага дзяржаўнага гуманітарнага ўніверсітэта і Вышэйшай школы эканомікі Антон

---

[45] П. Садоўскі, *Калі страляюць гарматы і словы: яшчэ раз пра гандлёвы брэнд „Бульбаш"*, https://www.facebook.com/sadouskip/posts/pfbid0vjzsq9TDBMamSWTMyucZcrt2RLChSkKnPovu3d5NpWwAXn2Zf5nLeeNMxfk8aqx8l [доступ: 04.02.2024].

[46] В. Вячорка, *Ці падабаецца беларусам быць „бульбашамі"?*, https://www.facebook.com/watch/?v=1746634735360782 [доступ: 04.02. 2024].

[47] Ibidem.

Сомін каб дапамагчы расійскай аўдыторыі зразумець беларускую культуру і сітуацыю, што склалася падчас выбараў 2020 г. выбраў 12 беларускіх слоў і даў цікавыя тлумачэнні кожнаму з іх. Адным з іх была „бульба". Лінгвіст падкрэсліваў, што беларусы самі з задаваленнем жартуюць і робяць мемы пра бульбу і не крыўдуюць на мянушку «бульбашы». Ён таксама звярнуў увагу на выраз «хавайся ў бульбу», які азначае, што здарылася нешта вельмі непрыемнае[48]. У размове аб бульбе і „бульбашах" як вобразе і візіі свету беларусамі амаль заўсёды ўзгадваюцца дранікі, як „квінтэсэнцыя бульбяной стравы", як цэнтральная частка пантэону нацыянальнай кухні. А. Сомін адзначаў важнасць дранікаў у жыцці беларусаў і прыводзіў цікавыя прыклады: вымярэнне інфляцыі па індэксе драніка і вялікі попыт на шкарпэткі з выявай драніка ад беларускай фірмы Mark Formelle.

Дранікі – найважнейшы элемент „бульбянога" патрыятызму

Бульба і „бульбашы" непасрэдна сведчаць аб драніках як галоўнай страве нацыянальнага пантэону беларусаў. Па-сутнасці дранікі ўвасабляюць не толькі ежу, а катэгарызацыю свету. Менавіта аб гэтым сведчаць спрэчкі і дыскусіі аб правільных рэцэптах і памылках у іх. З аднаго боку, дранікі могуць лёгка палітызавацца. Пытанне аб правільным рацэпце дранікаў (з мукою ці без мукі, з цыбуляй ці без і іншае) задавалася нават патэнцыйным кандыдатам у прэзідэнты на выбарах 2020 года[49]. З другога боку дранікі

[48] *Лінгвіст расказаў расійскай аўдыторыі пра ментальнасць беларусаў з дапамогай дванаццаці слоў. Не ўсе з іх літаратурныя*, https://nashaniva.com/lr/315199?fbclid=IwAR22DeAHQkhb65o6WPnUyzCFkSnLZBcWW9_U2zGhe8JUkNiNaSZSEzRajt0 [доступ: 07.10.2022].

[49] *Виктор Бабарико: Настоящие драники — это только картошка и соль*, https://nashaniva.com/ru/252559 [доступ: 07.10.2022].

ў гастрафэсткультуры сучаснай Беларусі набываюць каштоўнасць рэпрэзентанта беларускай культуры і ўвасабляюць яе нарматыўнасць: „Чаму менавіта дранікі? Па-першае, гэтыя аладкі – першае, што прыходзіць на розум пры згадванні нацыянальнай кухні”[50]; „Дранікі – гэта ўжо сфармаваны сімвал беларускай культуры”[51]. Кожны беларус, які сустракаў замежнага госця стаяў перад пытаннем – чым такім нацыянальным пачаставаць „інтурыста”. Любы беларус, які працаваў ці вучыўся за мяжой, рэпрэзентаваў беларускую культуру сярод калег хутчэй за ўсё менавіта дранікамі. Дранікі – класічны адказ на гэтае, між іншым, вельмі важнае і прасякнутае нацыянальным гонарам і катэгарызацыяй пытанне! Дыскусіі сярод экспертаў аб небеларускасці дранікаў і іх прастаце не змяняюць сам факт – дранікі сталі агульным сімвалам рэпрэзентацыі беларускай культуры ежы.

Асабліва актуалізавалася праблема выбудовы этнічных межаў падчас масавай міграцыі пасля выбараў 2020 г., калі для вялікай колькасці беларусаў стала важным выбудова сацыяльных межаў уласнай этнічнасці, рэпрэзентацыі своеасаблівасці ўласнай культуры ў прасторы, дзе яна незаўважная (у Польшчы, Літве, дзе знешнія характарыстыкі не даюць магчымасці вылучыцца ці заявіць аб сваёй адметнасці). Алесь Пілецкі жартаўліва назваў дранікі „беларускім нацыянальным антыдэпрэсантам”[52].

13 мая 2022 г. дранікі разам з іншымі стравамі з таркаванай бульбы былі ўнесены ў Рэспубліканскі спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Беларусі. Па сутнасці, гэта яшчэ больш замацавала сувязь паміж бульбай, дранікамі і катэгарызацыяй „бульбашы”. По-

[50] А. Орловская, *Тайный гость в поиск драников по слуцкому общепиту*, Інфа-Кур’ер, 30.10.2014, nr 44 (717), с. 8–9.

[51] П. Латушко, *Наши драники достойны пополнить список нематериального культурного наследия ЮНЕСКО*, Минск-Новости, https://minsknews.by/pavel-latushko-odna-iz-otlichitelnyih-chert-belorusov-obyazatelnost/ [доступ: 10.02.2024].

[52] *Беларускі нацыянальны антыдэпрэсант,* https://www.facebook.com/alespilecki/posts/pfbid02Sw5KTfRz1oPKQMq9ZYPFLmyZGWbkBWSFY6Z9KZ79ezXvsupFrunon1a4xGaaDVhil [Дата доступа: 23.02.2024].

гляды спецыялістаў у сферы спадчыны на магчымасць прызнаць дранікі каштоўнасцямі беларусаў падзяліліся[53].

Сімвалічнае асэнсаванне і прыватызацыя драніка адбываецца ўвесь час. Гэта і фестывалі дранікаў, прыгатаванне найбуйнейшага драніка ў свеце для кнігі рэкордаў Гінэсу, вынаходніцтва дранікбургера і шмат чаго яшчэ. Дранік стаў увасабляць сабой космас і салярны сімвал. Дізайнер Уладзімір Цеслер стварыў лінейку адзення „Драніклэнд"[54]. Ідэя „Драніклэнда", увасаблённая ў мапу Беларусі ў выглядзе драніка цудоўна лягла на папулярныя сярод расійскіх турыстаў ідэі на інтэрнэтфорумах аб рахманасці беларусаў праз празмернае ўжыванне бульбы і крухмалу. Вобраз краіны-драніка моцна дадае аргументаў на гэты конт. Асобна трэба заўважыць знакамітыя білборды, якія стаяць па ўсёй краіне – „Я люблю Беларусь", дзе сэрца выканана ў выглядзе драніка[55].

Такім чынам, бульба і дранікі сталі неад'емнай часткай культурнай самапрэзентацыі і катэгарызацыі беларусаў, а экзаэтнонім „бульбашы" (хутчэй за ўсё савецкі і расійскі) стаў ужывацца для ўнутраных патрэбаў падчас ідэалагічнага вакума і моцнай палітызацыі.

Выкарыстанне катэгарызацыі „бульбаш" ці любога слова з дадаткам „бульба" адразу дае беларусу адказ аб „уласнасці" на нейкую з'яву ці працэс, яе прыватызацыі і засваення. „Бульбамуві" – гэта фестываль беларускага кіно, што ладзіцца ў Польшчы. „Бульбаш Нано" – гэта гарэлка з інавацыйнымі тэхналогіямі (што б гэта не значыла). Песня і кліп новай папулярнай аўтаркі з Беларусі – „Бульбадэнс"[56]. Нават спецыфічная ўласнабеларуская сварка ў фэйсбуку

---

[53] Сварка з-за дранікаў. З'есці дранік — знішчыць каштоўнасць, https://novychas.online/kultura/svarka-z-za-dranikau-z-esci-dranik-zniszczyc-ka [доступ: 15.12.2023].

[54] Цеслер. *DranikLand*, https://www.facebook.com/vtsesler/photos/a.146919293 3368130/1609717445982344/?type=3 [доступ: 14.04.2023].

[55] *Я люблю Беларусь!*, https://starcom68.livejournal.com/1844947.html [доступ: 14.04.2023].

[56] *Премьера клипа на новый народный суперхит – Ангелина Волкова – «Бульбадэнс»*, https://www.youtube.com/watch?v=V8_5UBacU5c [доступ: 10.04.2024].

(ці шырэй – усюды) набыла яскравую патрыятычную саманазву – „бульбасрач”[57]. Тэрмін стаў устойлівы і не выклікае пратэсту ці негатыву. З гэтага бачна, што бульба аб’ядноўвае розныя рэальнасці і рэгістры, розныя кропкі гістарычнай памяці і розныя групы насельніцтва Беларусі. Паралельна яна паказвае на сацыяльныя рознагалоссі і індэксуе сацыяльныя падзелы. Пасля распаду СССР у Беларусі, дзе быў вялікае запатрабаванне на сацыяльную роўнасць, бульба была эфектыўным сімвалам аб’яднання – пры капаніі бульбы аб’ядноўвалася ўся сям’я, усе яе пакаленні, негледзячы на сацыяльныя, эканамічныя і палітычныя розніцы.

Таксама бульба заўсёды была асноўнай стравай у цяжкія часы. Бульба „легітымізуе і ўслаўляе здольнасць насельніцтва пракарміць сябе аўтаномна, „нягледзячы ні на што””[58]. Аўтаномнасць, самастойнасць і недавер да дзяржавы ў пэўным сэнсе з’яўляецца беларускай ідэяй і рэчаіснасцю. У гэтай прасторы палітычная ўлада, якая персаналізаваная ў Беларусі, метафарычна надзяляецца „бульбяным” ярлыком з заўважна пеяратыўным сэнсам – „бульбафюрэр”.

З другога боку, бульба заўважна становіцца інструментам палітычнага ўплыву або легітымацыі ў руках дзяржавы і эліты. На думку Н.Рэйс „бульбяныя сістэмы, практыкі і ідэалогіі сапраўды адыгрываюць пэўную ролю ў стабілізацыі і легітымізацыі асаблівай няроўнасці, характэрнай для постсацыялізму, у Расіі і за яе межамі”[59]. З аднаго боку ўлады Беларусі імкнуцца мабілізаваць людзей (як у прамым, так і ўскосным сэнсах) для збору ўраджаю бульбы[60]. З другога боку, эліты і прэзідэнт актыўна выкарыстоўваюць традыцыйныя каштоўнасці беларусаў і катэгарызацыю „буль-

[57] А. Сомин, *12 слов, помогающих понять культуру Беларуси*, https://arzamas.academy/mag/878-zhyve_belarus [доступ: 10.04.2024].

[58] N. Ries, *Potato ontology: Surviving Postsocializm in Russia*, Cultural Anthropology, Vol. 24, Issue 2, с. 182.

[59] Ibidem, с. 185.

[60] *Лукашенко призвал мобилизовать всех белорусов*, https://obzor.lt/news/n84848.html [доступ: 22.04.2024].

башы", каб замацоўваць уладу і маніпуляваць беларусамі: „і толькі праз сто год бульба з'явілася на сталах усіх беларусаў. І паступова ператварылася ў галоўную нацыянальную гародніну, з-за чаго нас жартам сталі называць „бульбашамі""[61].

Такім чынам, на мяжы 1980-х – 1990-х гг. адбылася значная эрозыя савецкай ідэалогіі і сімвалічнай сістэмы. Яна страціла сваю каштоўнасць у грамадстве, а новыя палітычныя прапановы не сталі агульнапрынятымі, не сфармавалі агульнабеларускую ідэнтыфікацыю і сістэму каштоўнасцей. У гэтай сітуацыі еўрацэнтрычныя, савецкацэнтрычныя ці расійскацэнтрычныя праекты былі моцна палітызаваныя і дзялілі грамадства. „Бульба" магла стаць нізавым дэпалітызаваным канцэптам, які аб'ядноўваў нават тых, хто меў розныя палітычныя погляды. Таму гэтая сімвалічная мадэль у пэўны момант аб'яднала беларусаў. Аднак для часткі інтэлектуалаў такая катэгарызацыя з'яўляецца непрымальнай, яна вяртае іх ў свет традыцыйнай культуры. Для шмат каго яна выглядае занадта простай. Аднак для большасці катэгорыя „бульбашы" зразумелая, ясная, і, што, можа самае галоўнае, апалітычныя, бо не нясе пагрозы расколу сем'яў, эмацыянальных і псіхалагічных траўмаў.

Бібліяграфія

Archiu addzieła etnahrafii Instytuta mastactwaznaustwa, etnahrafii i falkłora NAN Biełarusi. F. 6. Wop. 2. Spr. 28. Matieriały po istorii siemiejnych otnoszenij. *Zapisi st. nauczn. sotrudnika Mołczanowoj Ł.A. Polesskaja etnograficzeskaja ekspiedicyja. Fiewral 1951 g. Chojnickij rajon.* Ark. 13.

Astrouskaja T., *Kultura i supraciu. Intelihiencyja, inszadumstwa i samwydat u sawieckaj Biełarusi (1968– 1988)*. Biełastok 2022.

Badyna P., *Wybrane historie kartofla – Fryderyk II i ziemie polskie od XVII do połowy XIX stulecia*, „Kultura – Historia – Globalizacja" 2015, nr 18, s. 1 – 20.

Biełaruski nacyjanalny antydepresant, https://www.facebook.com/alespilecki/

[61] *«Это дороже нефти». Как Лукашенко сделал картофель национальным продуктом Беларуси*, https://www.belta.by/president/view/eto-dorozhe-nefti-kak-lukashenko-sdelal-kartofel-natsionalnym-produktom-belarusi-581349-2023/ [доступ: 22.04.2024].

posts/pfbid02Sw5KTfRz1oPKQMq9ZYPFLmyZGWbkBWSFY6Z9KZ79ezXvsupFrunon1a4xGaaDVhil [dostęp: 23.02.2024].

Biel-Czyrwona-Bieły. Sciah. Nacyja. Identycznasć. Ząbki 2023.

Bikanow F., *Biełarusskaja nacyonalnaja idienticznost' w 2022 godu: opyt koliczestwiennogo issledowanija*, https://library.fes.de/pdf-files/bueros/belarus/19770-20221206.pdf [dostęp: 06.02.2024].

Brubiejkier R., *Mify i zabłużdienija w izuczenii nacyonalizma*, [w:] *Mify i zabłużdienija w izuczenii impierii i nacyonalizma*. Moskwa 2010.

Ciesler. *DranikLand*, https://www.facebook.com/vtsesler/photos/a.14691929333 68130/1609717445982344/?type=3 [dostęp: 14.04.2023].

Engelking A., *Kołchoźnicy. Antropologiczne studium tożsamości wsi białoruskiej przełomu XX i XXI wieku*. Toruń 2012.

«Eto doroże niefti». Kak Łukaszenko sdiełał kartofiel nacyonalnym produktom Biełarusi, https://www.belta.by/president/view/eto-dorozhe-nefti-kak-lukashenko-sdelal-kartofel-natsionalnym-produktom-belarusi-581349-2023/ [dostęp: 22.04.2024].

Fukujama F., *Idienticznost': Striemlenije k priznaniju i politika nieprijatija*. Moskwa 2019.

Gleason, P. *Identifying Identity: A Semantic History*, „The Journal of American History" Vol. 69, nr 4, 1983, s. 910–931.

Hervouet R., *Dachas and vegetable gardens in Belarus: economic and subjective stakes of an „ordinary passion"*, „The Anthropology of East Europe Review" 2003, vol 21, nr 1, s. 159–168

Ja lublu Biełaruś!, https://starcom68.livejournal.com/1844947.html [dostęp: 14.04.2023].

Kabzińska I., *Wśród „kościelnych Polaków"*. Warszawa 1999.

Karluk J., *Draniki*, https://vershy.ru/content/draniki [dostęp: 15.10.2023].

Kowini Dż., *Gurmanistika. Kultura jedy i jeda kak kultura*. Char'kow, 2016.

Kozłowska-Doda J., *Tożsamość, losy i język najstarszych mieszkańców okolic Dociszek na Białorusi*. Lublin, 2021.

Kwiatkouski S., *Jak stać biełarusam. Sto historyj*. Minsk 2014.

Łatuszka P., *Wieru u Biełaruś, biełaruski narod i jaho buduczyniu*, [w:] Łukaszuk Z., Harunou M., *Biełaruskaja nacyjanalnaja ideja na marszy*. Warszawa 2022.

Łatuszko P., *Naszy draniki dostojny popołnit'spisok niematierialnogo kulturnogo nasledija JUNIESKO*, Minsk-Nowosti, https://minsknews.by/pavel-latushko-odna-iz-otlichitelnyih-chert-belorusov-obyazatelnost/ [dostęp: 10.02.2024].

Linhwist raskazau rasijskaj audytoryi pramientalnasć biełarusau z dapamohaj dwanaccaci слоў. Nie usie z ich litaraturnyja, https://nashaniva.com/

lr/315199?fbclid=IwAR22DeAHQkhb65o6WPnUyzCFkSnLZBcWW9_U2zGhe8JUkNiNaSZSEzRajt0 [dostęp: 07.10.2022].

Lubit' po-russki-3. Gubiernator. 1999. https://www.youtube.com/watch?v=BALzi-fUicw [dostęp: 12.03.2023].

Łukaszenko i kartoszka: zaczem politiki kopajutsia w ziemle, https://www.bbc.com/russian/society/2015/08/150817_tr_lukashenko_gardening_adventures [dostęp: 16.02.2024].

Łukaszenko prizwał mobilizowat' wsiech biełorusow, https://obzor.lt/news/n84848.html [dostęp: 22.04.2024].

Łukaszuk Z., Harunou M., *Biełaruskaja nacyjanalnaja ideja na marszy*. Warszawa 2022.

Łukaszuk Z., Harunou M., *Biełaruskaja nacyjanalnajaideja*. Warszawa 2022.

Maciasz N., *Kazka pra susiedziau, zmiaju i miadzwiedzia.Pawodle biełaruskaj narodnaj kazki*. (Mastak U. Sawicz). Minsk 1982.

Marcinowicz D., *Słuńkou. Palitycznaja bijahrafija*. Ząbki 2023.

Milinkiewicz A., *Biez idientiticznosti my potieriajem Biełarus'* https://www.youtube.com/watch?v=ndch2i-JhZE [dostęp: 11.03.2024].

Narody Rossii. Kratkije objasnitielnyje oczerki k Chudożestwienno-Etnograficzeskomu Albomu, izdannomu pod riedakcyjej N. A. Janczuka. Moskwa 1905.

Orłowskaja A., *Tajnyj gost' w poisk dranikow po słuckomu obszczepitu*, „Infa-Kur'jer", 30.10.2014, nr 44 (717), s. 8–9.

Pazniak Z., *„Biełaruś pieradusim" – heta sionnia nasza hałounaja nacideja*, [w:] Łukaszuk Z., Harunou M., *Biełaruskaja nacyjanalnaja ideja*. Warszawa 2022, s. 33 – 37.

Piatkiewicz Cz., *Reczyckaje Palessie*. Minsk 2004.

Priemjera klipa na nowyj narodnyj supierchit – Angielina Wołkowa – «Bulba-dens», https://www.youtube.com/watch?v=V8_5UBacU5c [dostęp: 10.04.2024].

Radzik R., *Wakoł identycznasci biełarusau*. Minsk 2017.

Radzik R., *Wytoki suczasnaj biełaruskasci*. Minsk 2012.

Ramanawa I., Machouskaja I., *Mir: Historyja miasteczka: czto raskazali jaho żychary*. Wilnia 2009.

Ries N., *Potato ontology: Surviving Postsocializm in Russia*, "Cultural Anthropology", Vol. 24, Issue 2, s. 182 – 212.

Rohava M., *Identity in an Autocratic State: Or What Belarusians Talk about When They Talk about National Identity*, East European Politics and Societies and Cultures, August 2018, https://www.researchgate.net/publication/326456493 [dostęp: 09.03.2024].

Sadouski P., *Kali stralajuć harmaty i słowy: jaszcze raz pra handlowy brend „Bulbasz"*, https://www.facebook.com/sadouskip/posts/pfbid0vjzsq9TDBM

amSWTMyucZcrt2RLChSkKnPovu3d5NpWwAXn2Zf5nLeeNMxfk8aqx8l [dostęp: 04.02.2024].

Sahanowicz H., *„Wozmożny niehatuwnyje posledstwuia", abo Dyskusija pra bałcki substrat u BSSR epochi Maszerawa*, „Biełaruski Histaryczny Ahlad (dalej BHA)", 2023, t. 30, ssz. 1-2 [dostęp: 10.04.2024].

Sahanowicz H., *Inszadumstwa akademicznaj intelihiencyi u BSSR epochi adlihi*,. „BHA", 2021, t. 28, ssz . 1– 2. [dostęp: 10.04.2024].

Siewiergin W., *Zapiski putieszestwija po zapadnym prowincyjam Rossijskago gosudarstwa*. Sankt-Pietierburg, 1803.

Słuckij chlebozawod bolsze nie budiet wypuskat' chleb «Bulbasz», https://nashaniva.com/ru/332344 [dostęp: 04.02.2024].

Słuckij chlebozawod otwietił na obraszczenije aktiwistow s pros'boj izmienit' nazwanije chleba «Bulbasz», http://slutsk-gorod.by/novosti/item/slutskij-k-hlebozavod-otvetil-na-obrashchenie-aktivistov-s-prosboj-izmenit-nazvanie-khleba-bulbash [dostęp: 10.02.2024].

Temu poglądowi zdaje się przeczyć opinia pisarza i krytyka Władimira Bieriezina, który kilka lat później doszukał się w powieści kolejnego możliwego znaczenia: „[Opisana w powieści] inwazja na Krym *na prośbę rządu krymskiego* wyraźnie przypominała lądowanie Rosjan w Afganistanie po wyrażeniu analogicznej *prośby*”[12].

Mam jednak przekonanie, że choć w epizodzie, w którym Aksionow opisuje desant Armii Czerwonej na fikcyjną wyspę, można dopatrywać się podobieństw do interwencji Rosjan w Afganistanie (jak i do wielu innych tego typu operacji wojskowych na świecie), to porównanie przyczyn obu najazdów, realiów panujących w obu regionach świata, ich poziomu rozwoju, a także reakcji tubylców na inwazję oraz towarzyszących wtargnięciu okoliczności i skutków nie uzasadnia powyższej refleksji, nawet przy uwzględnieniu faktu, że wydarzenia historyczne zostały tutaj zestawione z fikcyjnymi.

W odnajdywaniu ukrytych znaczeń i nawiązań – jakby nie do końca dowierzając w tej kwestii czytelnikom i badaczom – pomocni oka-

[11] К. Зорина, *Остров Крым: Роман. Василий Аксёнов. Обзор*. Книжные обзоры. Русский Журнал, 17 апреля 1998. https://web.archive.org/web/20140422075744/http://old.russ.ru/journal/kniga/98-04-17/zorina.htm [dostęp: 2.01.2023].

[12] В. Березин, *Крымский оборонный фэнфик*. НЛО 70/2004, https://web.archive.org/web/20150709021046/http://magazines.russ.ru:8080/nlo/2004/70/be24.html [dostęp: 2.01.2023].

zują się bohaterowie powieści. Jeden z nich opowiada, jak wyglądały pierwsze lata poststalinowskie na wyspie: „Krym jawił się teraz jako odrażająca międzynarodowa jaskinia rozpusty, eldorado awanturników i szpiegów […]. Krym odsunął się od Rosji, zrównał z się z różnymi Hongkongami, Singapurami, Honolulu, stał się symbolem zachodniej rozwiązłości”[13].

Nowe znaczenia

Na wstępie tego rozdziału należy powtórzyć – *Wyspa Krym* nie jest powieścią o relacjach rosyjsko-ukraińskich. Rzeczownik *Ukraina* nie pojawia się w utworze ani razu, przymiotnik *ukraiński* zaś tylko raz i to w wątku zdecydowanie pobocznym, gdy jeden z bohaterów wspomina wojnę domową 1920 r. toczoną gdzieś na *ukraińskich stepach*. Pojawia się natomiast w powieści wiele nazw geograficznych, które dziś pojawiają się w mediach w zupełnie innym kontekście – są to zarówno Krym, Jałta czy Symferopol, ale na przykład również Kachowka – jeden z bohaterów powieści nazywa tak swoją pełną przepychu krymską rezydencję na pamiątkę miasta, w którym podczas wojny domowej 1920 r. poznał swoją ukochaną. Czytamy też o cieśninie Czonharskiej, sześćdziesięciokilometrowym przesmyku, który w powieści dzieli Krym od kontynentu, a którym po przegranej wojnie domowej biała armia mogła przeprawić się na wyspę tylko dlatego, że podczas silnych mrozów przesmyk zamarzł.

Nie można się jednak pozbyć wrażenia, że Wasilij Aksionow mniej więcej z 35-letnim wyprzedzeniem przewidział sytuację z marca roku 2014, gdy premier Autonomicznej Republiki Krymu (notabene, nazwiskiem Siergiej Aksionow) zwrócił się do Władimira Putina z prośbą *o pomoc w zapewnieniu spokoju na terytorium Autonomicznej Republiki Krymu*, co było pretekstem do aneksji półwyspu przez Rosję. Uzasadnione są również skojarzenia fikcyjnej fabuły z powstaniem i póź-

[13] W. Aksionow, *Wyspa Krym…*, s. 57.

niejszym włączeniem do współczesnej Rosji tzw. republik ludowych: Ługańskiej i Donieckiej, co miało m.in. *uchronić rosyjskojęzycznych mieszkańców przed uciskiem nazistowskiego rządu w Kijowie*.

Zupełnie uniwersalny i ponadczasowy charakter ma rozdział, w którym członkowie Biura Politycznego KPZR debatują nad sposobami inwazji na Krym-Rosję. Jeden z członków Biura „spytał wprost, czy do rozwiązania tak zwanego problemu krymskiego wystarczy zgrupowanie desantowe generała N. […] – Przy okazji można byłoby przetestować czołgi na poduszce powietrznej[14].

Zastosowanie sprawdzonych sowieckich metod jest rozważane również w przypadku poradzenia sobie z systemem wielopartyjnym i wielonarodową populacją wyspy:

> Partia ma duże doświadczenie w rozwiązywaniu podobnych problemów – odparł [jeden z rozmówców]. – Problem wielopartyjności, jak wszyscy wiemy, można rozwiązać w ciągu kilku dni. Z zagadnieniami narodowościowymi sprawa jest bardziej skomplikowana. […] – Zsyłka? – zaskrzeczał „Pierwszy". – Znów babrać się z takimi sprawami? – Nie zsyłka, lecz dokładnie zbilansowane przesiedlenie […]. Inaczej niż kiedyś, z uwzględnieniem wymogów humanitarnych […] Ludność rdzenna, znaczy Tatarzy krymscy, zostanie na miejscu, utworzymy obszar autonomiczny, wchodzący w skład powiedzmy Gruzińskiej SRR[15].

Wyspa Krym jest także w dużej mierze powieścią o relacjach obywateli państwa reżimowego z ich pobratymcami na emigracji, co jest sferą dobrze znaną Aksionowowi z własnego doświadczenia. Mamy w powieści opis skomplikowanych stosunków w trójkącie: ZSRR – Krym-Rosja – Paryż. Główny bohater, Andriej Łucznikow, zwolennik połączenia Rosji z Krymem i inicjator Unii Wspólnego Losu, udaje się do stolicy Francji, aby spotkać się ze znajomym, który jest delegatem Krymu w UNESCO[16], zrobić zakupy w luksusowych sklepach, dowie-

[14] Ibidem, s. 236–237.

[15] Ibidem, s. 239.

[16] Fikcyjna Krym-Rosja nie należy do ONZ, bo jej członkostwo blokuje ZSRR, ale działa w agendach innych organizacji międzynarodowych.

dzieć się o planach hollywoodzkiej ekranizacji swojej powieści, a także odwiedzić całą plejadę tamtejszych emigrantów – od niedawno przybyłych niepokornych artystów, po zasiedziałych nad Sekwaną od dekad carskich generałów. Warto wspomnieć, że Łucznikow spotyka się ze skrajnie zróżnicowanym przyjęciem miejscowych: „Zawsze rad jestem gościom z Rosji, zwłaszcza młodzieży. Wprawdzie pół wieku żyję na wygnaniu, ale duszą jestem w ojczyźnie […] Gdyby pan wiedział, jak tu na obczyźnie cieszy nas rosyjska mowa!”[17]. Wita wylewnie gościa baron von Witte w swojej pełnej przepychu rezydencji, a jeszcze tego samego dnia na studenckim party dawny przyjaciel reaguje na widok Łucznikowa stekiem wyzwisk: „Zdrajco, k*wo bolszewicka, ile ci zapłacono za Wyspę Krym, ch*u złamany, wesz kagiebowska […] Takich jak ty na każdym skrzyżowaniu powinno się częstować kopniakiem, gówno marksistowskie, gnoju przeklęty!”[18].

W powieści jest mowa również o emigrantach, którzy wyjechali do Izraela, choć nie jest to szczególnie eksponowany wątek, nie ma on także większego znaczenia dla fabuły.

Podsumowanie

Mam pewność, że *Wyspę Krym* warto ponownie przeczytać i że nie jest to bynajmniej *parodia, która po dwóch dekadach stała się archaiczna*. Powieść Aksionowa to dzieło wybitne i ponadczasowe z co najmniej czterech powodów.

Po pierwsze, ze względu na zaskakujące (choć niezamierzone przez autora) podobieństwo relacji łączących ZSRR z fikcyjną Krym-Rosją oraz stosunków obecnej Rosji i Ukrainy. W obu uniwersach oba państwa połączone są wspólną historią (czasem bolesną i zagmatwaną), a także więzami krwi ich mieszkańców. Kraje te koegzystują w miarę zgodnie dzięki rozmaitym umowom dwustronnym i protektoratowi organizacji

[17] Ibidem, s. 96-97.
[18] Ibidem, s. 107.

międzynarodowych, ale głównie dzięki niepisanym zasadom i międzyludzkim kontaktom, utrwalonym przez długie lata koegzystencji. Gdy w tej wspólnej historii następuje punkt zwrotny, wszystkie te od dekad obowiązujące reguły przestają obowiązywać, podobnie jak więzi między ludźmi. Konieczne staje się przewartościowanie pojęć w rodzaju *przyjaźń, lojalność* czy *patriotyzm*, ponowna ewaluacja i określenie, kto jest przyjacielem, a kto wrogiem, a także opowiedzenie się po którejś ze stron, niekoniecznie tej, z którą łączą nas więzy krwi czy paszport.

Po drugie, autor *Wyspy Krym* obrazowo przedstawia mechanizmy, tok myślenia i sposób postępowania władzy radzieckiej lat 70. jako żywo przypominające *modus operandi* współczesnego nam obozu putinowskiego, ale zapewne również wielu innych światowych reżimów. Oficjalne komunikaty, których celem jest wyłącznie dezinformacja, decyzje o życiu i śmierci całych narodów zapadające w partyjnych gabinetach lub prywatnych saunach, wszechwładza i bezwzględność tajnych służb, konflikty rozwiązywane przy wsparciu oddziałów desantowych, bezwzględne tłumienie wszelkich przejawów wolności słowa i poglądów sprzecznych z oficjalną linią, absolutna nieczułość na cierpienie pojedynczych ludzi – to tylko niektóre elementy sztafażu będącego na porządku dziennym zarówno w ZSRR, jak i XXI-wiecznej Rosji.

Po trzecie wreszcie, równie trafnie oddał Aksionow realia funkcjonowania różnej proweniencji diaspór, nie tylko rosyjskich. Bo także dziś tworzą się, mieszają i ewoluują środowiska emigracyjne, zasilane kolejnymi falami uciekinierów przemieszczających się pomiędzy Rosją, Ukrainą, Białorusią, Izraelem czy państwami Europy Zachodniej. Czy Rosjanin spotkany nad Sekwaną jest uchodźcą politycznym czy zarobkowym, a może zamożnym oligarchą-rezydentem stolicy Francji lub wysłannikiem FSB? Czy przedstawicieli poprzedniej fali emigracji z tego samego kraju można uważać za sojuszników czy wrogów? Czy człowiek, który uciekł przez zieloną granicę w obawie przed przymusową mobilizacją, zasługuje na współczucie i pomoc tak jak ten, który wyjechał legalnie? Pytania można mnożyć, ale większość z nich pozostaje aktualna.

Ciekawy i ponadczasowy wydaje się w powieści również zabieg umieszczenia akcji na fikcyjnej wyspie – kawałku ziemi, który na realnej mapie ma połączenie ze stałym lądem. Tak jak u wielkich poprzedników Aksionowa próba stworzenia raju na wydzielonym terytorium, stanowiącego sól w oku sąsiadów, jest z góry skazana na niepowodzenie, jednak, co unikalne, utrata suwerenności na kartach *Wyspy Krym* odbywa się *de facto* na prośbę podbitych i przy (przynajmniej) milczącym przyzwoleniu całej populacji. Mimo że mieszkańcy są świadomi fatalnych skutków, jakie może przynieść okupacja ich lądu przez wielkiego sąsiada, witają ich z otwartymi ramionami! Absurdalność tej sytuacji idealnie oddaje groteskowy dialog, prowadzony przez funkcjonariusza aparatu państwowego ZSRR (ale przyjaźnie nastawionego do Krymu i jego mieszkańców) oraz krymskiego kupca, który nie może się wprost doczekać nowych gospodarzy wyspy:

> – Och, panie Mercator – westchnął Marlen Michajłowicz, zmartwiony gadaniną sklepikarza. – Czy pan rozumie, że [w ZSRR] mamy ustrój socjalistyczny? Jeśli się połączymy, straci pan swój piękny sklep! – Będę kierownikiem, socjalistycznym dyrektorem – rozpromienił się pan Mercator. – Przecież wielki Związek Radziecki nie zrezygnuje z mego doświadczenia, z moich śródziemnomorskich kontaktów![19] .

Ta powszechna samobójcza skłonność wyspiarzy wydaje się niezrozumiała – poparcie dla powrotu niepodległego Krymu do socjalistycznej macierzy można wytłumaczyć nostalgią pierwszych mieszkańców wyspy tęskniących za starym krajem czy ideologią niektórych grup politycznych (zwłaszcza tych wspieranych finansowo przez Kreml), ale trudno zrozumieć 100-preocentowe poparcie dla idei Unii Wspólnego Losu ze strony radykalnych partii niepodległościowych, przedsiębiorców działających na rynkach międzynarodowych czy licznych bohaterów powieści, którzy mają świadomość, że aneksja zakończy się całkowitym podporządkowaniem ich wolnego kraju Rosji Radzieckiej i jej socjalistycznym ideom. Jedyne wyjaśnienie, jakie się tu nasuwa,

[19] Ibidem, s. 275.

nakazuje założyć, że całą opisaną w powieści historię należy traktować jedynie na płaszczyźnie metaforycznej – choć dla współczesnych (ale i ówczesnych) Europejczyków wydarzenia te są zupełnie niezrozumiałe i racjonalnie niewytłumaczalne, to są całkiem charakterystyczne dla zjawiska, które zwykliśmy określać *rosyjską duszą*, pod którą – w tej akurat specyficznej sytuacji – kryje się skłonność do działań nieracjonalnych i autodestrukcyjnych pod wpływem silnych emocji, ale także bezwzględne posłuszeństwo wobec działań władzy (nawet tych prowadzących do samozagłady) czy silnie zakorzeniona potrzeba posiadania nad sobą władcy, *хозяина*, który nawet jeśli jest okrutny i tępy, to także potężny i wszechwładny, co zwiastuje bezwzględną dyktaturę, ale także porządek i stabilizację.

Jak się jednak okazuje – i w przypadku ZSRR, i współczesnej Rosji – ten porządek i stabilizacja nie są przez dyktatora dane raz na zawsze.

Bibliografia

Aksionow W., *Wyspa Krym*, tłum. M. Putrament, Warszawa 2001.

Archipelagi wyobraźni, red. E. Łukaszyk, Kraków 2007.

Barmetova I., *Tamariskovyy park redkikh zemel'. Beseda s Vasiliyem Aksenovym*. „Oktyabr'" 2007, nr 3 [Барметова И., *Тамарисковый парк редких земель. Беседа с Василием Аксеновым*. Октябрь 2007, nr 3], https://web.archive.org/web/20131219074343/http://magazines.russ.ru/october/2007/3/ba2-pr.html [dostęp: 2.01.2023].

Huxley A., *Wyspa. Cień Kształtu*, tłum. S.J. Białostocki, Warszawa 2017.

More T., *Utopia*, tłum. J. Smoczyński, Lublin 1993.

Ostrowski W., *Wprowadzenie do „Utopii"* [w:] T. More, *Utopia*. PAX, Warszawa 1954, s. 62.

Slovar' literaturovedcheskikh terminov, red. S. Belokurova [*Словарь литературоведческих терминов*, ред. С. Белокурова], http://gramma.ru/LIT/?id=3.0 [dostęp: 17.10.2023].

Sovremennaya russkaya literatura, 1950-1990 gody, red. N. L. Leyderman, M. N. Lipovetskiy. Moskva 2003, t. 2 [*Современная русская литература, 1950–1990 годы*, ред. Н. Л. Лейдерман, М. Н. Липовецкий. Москва 2003, т. 2].

Zorina K., *Ostrov Krym: Roman. Vasiliy Aksonov. Obzor.* Knizhnyye obzory. „Russkiy zhurnal", 17 aprelja 1998 [Зорина К., *Остров Крым: Роман. Ва-*

силий Аксёнов. Обзор. Книжные обзоры. „Русский журнал", 17 апреля 1998]. https://web.archive.org/web/20140422075744/http://old.russ.ru/journal/kniga/98-04-17/zorina.htm [dostęp: 2.01.2023].

Березин В., *Крымский оборонный фэнфик*. НЛО 2004, t. 70, https://web.archive.org/web/20150709021046/http://magazines.russ.ru:8080/nlo/2004/70/be24.html [dostęp: 2.01.2023].

The Island of Crimea by Vasily Aksionov re-read

Vasily Aksionov's novel *The Island of Crimea* (*Остров Крым*, *Ostrov Krym*), written in the late 1970s in the USSR and published in exile in the early 1980s, was surprising both with the author's unlimited fantasy and creativity, as well as with the number of meanings and possible interpretations at that time. However, the further history of Russia (especially 2014, when the annexation of Crimea took place, and 2022, when the war in Ukraine broke out) allows us to see other meanings in the 40 years old plot, which – although unintentional by the author – are worth articulating as a manifestation of the unprecedented timelessness of this story, as well as the visionary of the writer, now somewhat forgotten person. Aksionov's novel is also an excellent example of a fiction work that proves that creating unreal worlds can have a much deeper meaning than just intellectual fun or satisfying the desire for entertainment.

The author of the article tries to find the meanings hidden on the pages of *The Island of Crimea* by Aksionov, but also to point out new meanings added by recent history. The novel's universe, being innovative for that (but also current!) times and having features of both anti-utopia and alternative history, offers enormous scope for creativity in this respect.

The Crimea created by Aksionov (in the novel country called Crimea-Russia) is not – as we are used to thinking – a peninsula, but an island in the Black Sea, as well as a democratic, multi-party, independent, neutral state flourishing right next door to the USSR, which looks jealously at the prosperity and freedom in neighboring country. After the novel was published in 1981, literary scholars interpreted this structure as a reference to the relations between China and Taiwan, as well as Russia and Afghanistan, or even Moscow and the rest of Russia, but since 2024, this universe brings to mind a clear, yet surprising association with contemporary Russian-Ukrainian relations. Although Aksionov completely omits the latter in the novel, one cannot escape the impression that the author predicted the historical events of March 2014 and of February of 2022 in Ukraine, approximately 35 years in advance. Moreover, during these few decades, the

events that took place in the fictional Crimea-Russia and the mechanisms that led to them, could be observed in many places around the globe.
The timeless structure of the plot makes it worth returning to read *The Island of Crimea* as an outstanding and timeless work, allowing us to better understand the contemporary way of thinking and the mechanisms governing politics and societies not only in Eastern Europe.
K e y w o r d s: Vasily Aksionov, Crimea, The Island of Crimea, USSR, Ukraine, alternative history, anti-utopia

RECENZJE

This article is distributed under the terms of the Creative Commons Attribution 3.0 PL
© Copyright by Uniwersytet Warszawski Katedra Studiów Interkulturowych Europy Środkowo-Wschodniej & individual articles to their Authors

doi: 10.32612/uw.2543618X.2024.pp.249-262

Przegląd Środkowo-Wschodni, 9, 2024
ISSN 2543-618X eISSN 2545-1324

Nr art. 20240912

Data przesłania: 29.05.2024
Data akceptacji: 27.06.2024

Павел Котаў
Univerzita Palackého v Olomouci
Filozofická fakulta
Katedra historie
pavel.kotau@gmail.com
ORCID: 0000-0003-4615-3371

Метадалогія і дэмагогія або яшчэ раз пра год нараджэння Францішка Скарыны

Илья Лемешкин, *Портрет Франциска Скорины = Pranciškaus Skorinos portretas = Portrait de Francisk Skorina. Travaux du cercle linguistique de prague, nouvelle série, vol.* 10, Vilnius-Prague: Lietuvių kalbos institutas (Institut national de langue lituanienne) la 2e édition, revue et augumentée, 2021, 314 c.

У 2020 годзе пабачыла свет кніга Ільі Лямешкіна, прысвечаная партрэту Францішка Скарыны[1]. Сярод іншага ў ёй прапаноўвалася новая дата нараджэння друкара. Паводле аўтара, спалучэнне „MZ“ на партрэце 1517 года трэба чытаць не як ініцыялы разьбяра або мастака, а як кірылічны лічэбнік 47, які пазначае Скарынаў узрост. Адпаведна, датай нараджэння Ф. Скарыны даследчык прапанаваў лічыць 1470 год. На недахопы аргументацыі аўтара я паказаў у рэцэнзіі[2], якая, аднак, выйшла ўжо пасля таго, як з’явілася другое

[1] И. Лемешкин, *Портрет Франциска Скорины. К 550-летию со дня рождения книгоиздателя*, Vilnius – Prague 2020.

[2] P. Kotau, *Новое прочтение или дорисовка? [rec.:] Лемешкин И. Портрет Франциска Скорины. К 550-летию со дня рождения книгоиздателя. Vilnius – Prague, 2020*, „Rocznik Lituanistyczny“ 2022, T. 8, s. 273-277.

выданне манаграфіі. У новым выданні І. Лямешкін свае палажэнні пакінуў амаль без зменаў, таму выказаныя мной крытычныя заўвагі захоўваюць сваю актуальнасць. Аднак выданне 2021 году атрымала новую дзясятую главу пад назвай „Метадалогія і дэмалогія", у якой аўтар разбірае магчымыя контраргументы супраць прапанаванай ім даты нараджэння Ф. Скарыны, і якая заслугоўвае асобнага разгляду і рэакцыі.

Новая глава напісаная ў палемічным духу, пры гэтым палеміка, якую вядзе аўтар мае дзве асаблівасці. Па-першае, І. Лямешкін не спрачаецца з канкрэтным тэкстам канкрэтнага аўтара, а рэагуе на розныя заўвагі розных асоб выказаныя пры рознай нагодзе, не называючы за адзіным выключэннем імёнаў сваіх апанентаў. У тэксце главы чуваць рэха рэакцыі грамадскасці на выставу прысвечанай Скарыне, якая на працягу 2021 году падарожнічала па чэшскіх гарадах у рамках прэзентацыі беларускай спадчыны ЮНЭСКА[3], а таксама заўваг, якія прагучалі на прэзентацыі першага выдання ў лістападзе 2021 году ў Празе. Трэба таксама адзначыць, што за такі кароткі час, які прайшоў паміж двума выданнямі, грунтоўныя навуковыя рэцэнзіі на першае выданне проста не маглі паспець выйсці. Гэтая акалічнасць дазваляе аўтару прэзентаваць усіх сваіх апанентаў агулам, як „нарадаведаў, якія „в интенциях националь-

[3] Выстава „František Skorina (1470–1552). Renesanční intelektuál mezi Prahou a Vilniusem". Інтэрнэт версія: https://www.cultural-heritage.cz/skorina-vystava/ [доступ 29.05.2024]. Выстава была перапрацаванай версіяй выставы „František Skorina a Praha", якая адбылася ў Нацыянальнай бібліятэцы ў Празе ў 2017 годзе і абапіралася на публікацыю S. Narbutas (sud), *Pranciškaus Skorinos Rusėniškajai Biblijai – 500*, Vilnius 2017. У маі 2021 г. у допісе ў сваім профілі на сацыяльнай сетцы я выказаў свае крытычныя заўвагі, якія тычыліся недастатковага тлумачэння этнаканфесійных рэалій Вялікага Княства Літоўскага, амаль поўнай адсутнасці Полацка і ўзгадвання Беларусі толькі ў кантэксце вывучэння Скарыны і „некарэктнай" мемарыялізацыі, а таксама прадстаўленне гіпотэз (1470 як дата нараджэння Скарыны, праца садоўнікам у 1539) як навукова даказаных фактаў. На гэтым маё ангажаванне скончылася. Аднак тэкст майго допісу быў прыкладзены да аднаго са зваротаў да арганізатараў. Пазней арганізатары, рэагуючы на розгалас, прыбралі панэль „Skorinova přítomnost v současných Čechách"

ного возрождения продолжают работать «во благо народа» і прадстаўляюць „псевдо- и околонаучное скоринознание", а любую крытыку працы І. Лямешкіна з боку беларускіх аўтараў, прадстаўляць як праяву тзв. ненавуковай „дэмалогіі". Такая крытыка на думку І. Лемешкіна наогул не заслугоўвае адказу. Але, паводле сваіх слоў, І. Лямешкін, вымушаны рэагаваць, бо

> псевдо- и околонаучное скоринознание якое имеет тенденцию приобретать арогантный и всё более агресивный характер. Во многом это связано со значительно возросшими возможностями самореализации посредством печатного и виртуального слова, а также с консолидацией «борцов» за Ф. Скорину в социальных сетях.

Стыль, які месцамі набліжаецца да тэкстаў „Советской Белоруссии", з'яўляецца другой асаблівасцю вядзення палемікі І. Лямешкінам.

Для навуковай дыскусіі важным з'яўляецца прадстаўлены І. Лямешкінам ў новай главе агляд дакументальных сведчанняў, на падставе якіх дагэтуль у скарыназнаўстве вызначалася дата нараджэння Ф. Скарыны. Першым такім сведчаннем з'яўляецца запіс палачаніна на факультэт вызваленых мастацтваў Кракаўскага ўніверсітэта ў зімовым семестры 1504 году[4]. У скарыназнаўчай літаратуры, пачынаючы ад Пятра Уладзіміравa, было прынята датаваць нараджэнне друкара як *не пазней за 1490*, сыходзячы з таго, што мінімальным ўзростам запісу ва ўніверсітэт былі 14 год[5]. І. Лямешкін такі падыход, які ён называе „решение вопроса на основании среднестатистических выкладок", крытыкуе. Паводле аўтара ў XVI ст. не існавала ўзроставая цэнзу для паступлення ва ўніверсітэт, і да таго ж сёння не існуе надзейнай статыстыкі ўзросту іматрыкуляцыі студэнтаў:

---

[4] А. Жлутка, А. Доўнар, П. Котаў, С.Кнырэвіч, *Францыск Скарына ў дакументах і сведчаннях.* Мінск 2020, с. 54–57, №3; A. Gąsierowski, T. Jurek, I. Skierska, R. Grzesik, *Metryka Uniwersytetu Krakowskiego z lat 1400–1508: Biblioteka Jagiellońska rkp. 258*, Kraków 2004, T. 1, s. 612.

[5] П. Владимиров, *Доктор Франциск Скорина. Его переводы, печатные издания и язык*, СПб 1888, с 44.

> До сих пор распространённый советский стереотип о том, что молодой человек после окончания средней школы (службы в армии) сразу поступает в вуз либо идёт работать и в таком случае образование ему уже не грозит, не должен искажать наших представлений о далёком XVI. в. Тогда было по другому. Насколько по другому мы можем, к сожалению, только гадать, так как внятной возрастной статистики на тот период у нас нет.

Рознаўзроставасць студэнцтва ў часы Скарыны І. Лямешкін ілюструе ілюмінацыяй рукапісу, які паходзіць з Балоніі. Пры гэтым аўтар сцвярджае, што нават наяўнасць уцямнай статыстыкі не дасць адказу на пытанне аб даце нараджэння, бо Ф. Скарына быў выбітнай асобай і пражыў нетыповае для свайго часу жыццё: „сомнительно, можем ли мы в его случае полагаться на среднестатистические выкладки".

Трэба пагадзіцца з І. Лямешкінам у тым, што мы не маем сведчанняў пра мінімальны ўзрост запісу ва ўніверсітэт на мяжы XV і XVI стагоддзяў. Аднак працэдура іматрыкуляцыі ўключала ў сябе акт прысягі, які патрабаваў юрыдычнай поўнагадовасці. Юрыдычная адказнасць наступала ў 14–15 год[6]. Сыходзячы з гэтага і прынята адлічваць мінімальны ўзрост. Аднак існавала магчымасць прыняцця прысягі за непоўнагадовага ягоным прадстаўніком, таму вядомыя выпадкі іматрыкуляцыі і 12-гадовых студэнтаў. Няпраўда аднак, што не існуе ўцямнай узроставай статыстыкі. Прасапаграфічныя даследаванні цэнтральнаеўрапейскіх ўніверсітэтаў пачаліся яшчэ ў 80-ых гадах мінулага стагоддзя, і калі іх пачынальнік Райнэр Крыстаф Швінгес піша, што тыповы студэнт пачынаў навучанне на факультэце вызваленых навук у 14–16 год, то робіць ён так не на аснове „савецкага стэрыятыпу" а на базе назапашанага

[6] Паводле артыкулу 8, раздзела 14 Статута ВКЛ 1566 г. прававая адказнасць наступала пасля дасягнення 14 год, паводле Статутаў Казіміра Вялікага ў Польшчы – у 15 год: Т. Доўнар, У. Сатолін, Я. Юхо, *Статут Вялікага Княства Літоўскага 1566 года*, Мінск 2003, с. 205–206; J. Bardach, B. Leśnodorski, M. Pietrzak*, Historia ustroju i prawa polskiego*, Warszawa 1993, s. 131.

матэрыялу[7]. Пад кіраўніцтвам прафесара Р. Швінгеса дваццаць год таму распачаліся працы над датабазай Repertorium Academicum Germanicum. Сёння там сярод іншага ўтрымліваюцца звесткі пра 1125 асобаў з акадэмічнай ступенню, якія так ці інакш былі звязаныя з кракаўскім універсітэтам у 1450–1550 гадах. У выпадку 45 з іх нам вядомы год іх нараджэння. 42 з іх (93,3%) запісалася на факультэт вольных мастацтваў ва ўзросце 25 год і ніжэй, прычым 33 з іх (73,3%) пачалі сваё навучанне калі ім не было і 20-ці год. Наймаладзейшаму на момант іматрыкуляцыі магло быць 12 год, найстарэйшаму 34[8].

Выява лекцыі ў Балоніі не можа служыць ілюстрацыяй сітуацыі на факультэце вызваленых навук Кракаўскага ўніверсітэта, бо ён адносіўся да ўніверсітэтаў тзв. Парыжскай мадэлі, якая адрозніваласа ад мадэлі Балонскай арганізацыяй і сацыяльна-ўзроставай структурай. Мікразрэз узроставай структуры ў Кракаве прыводзіць Кшыштаф Барода: у запісе у кнізе рэктарскіх актаў у Кракаве з 1489 году прыведзены ўзрост чатырох студэнтаў. Ідэнтыфікацыя іх у метрыцы дазволяе вызначыць іх узрост у час іматрыкуляцыі: 24, 19, 18, 22 гады[9].

Такім чынам абапіраючыся на вядомыя дадзеныя, можна сцвярджаць, што найменшым вядомым узростам запісу ў Кракаўскі ўніверсітэт былі 12 год, запісы асобаў старэйшых за 25 здараліся, але былі выключэннем з правіла, а большасць запісвалася на навучанне да 20 год. Беручы пад увагу тое, што, як заўважыў Алесь Жлутка, Францішак Скарына хутчэй за ўсё іматрыкуляваўся ў сакавіку-красавіку 1505 году,[10] найпазнейшай магчымай (вядома малаверагоднай) датай нараджэння Скарыны трэба лічыць 1493 год.

---

[7] R. C. Schwinges, *Studenten und Gelehrte. Studien zur Sozial- und Kulturgeschichte deutscher Universitäten im Mittelalter.* Leiden 2008. с. 432.

[8] Спіс: https://database.rag-online.org/viewer.p/17/4/selection/JkQNmGXnnbk45yaqXPKxq [доступ 05. 06. 2023].

[9] K. Boroda, *Studenci Uniwersytetu Krakowskiego w późnym średniowieczu*, Kraków 2010, s. 43–44.

[10] А. Жлутка, *Францыск Скарына*…, с. 257–258.

Аднак найбольш верагодна Францішак нарадзіўся ў прамежку 1485–1490 гадоў. Безумоўна, нельга выключаць і таго, што Скарына мог нарадзіцца раней.

Адносна заяўленай нетыповасці Скарыны і адпаведна бессэнсоўнасці статыстыкі ў дачыненні да яго неабходна зрабіць дзве заўвагі. Па-першае, Скарына відавочна прыйшоў у Кракаў не адзін, а ў складзе групы студэнтаў з ВКЛ[11]. Таму можна казаць аб тыповасці яго паводзін як студэнта, бо такія Reisegruppen асоб з аднаго рэгіёну былі пашырынай з'явай для цэнтральнаеўрапейскіх універсітэтаў у XV стагоддзі[12]. А па-другое, аўтар сам, аналізуючы партрэт Скарыны, сыходзіць з таго, што гэта тыповы чэшскі партрэт XVI ст. і не цураецца статыстыкі, калі яна падмацоўвае ягоны тэзіс:

> „Печатный графический материал XVI века … выявляет естественную закономерность: люди заказывали и помещали в книгу собственный портрет, лишь достигнув определённого положения, которое у представителей мещанского сословия было связано с возрастом. В среднем они давали изображать себя в возрасте около 50 и более лет, когда их заслуги перед обществом не вызывали сомнений. Наивно думать, будто Ф. Скорина в Библии мог быть изображен 27-летним юнцом. Никаких прецедентов и постцедентов этому нет" (с. 127–128).

Узнікае пытанне: чаму аўтар дэкларуючы нетыповасць Ф. Скарыны адмаўляе магчымасць таго, што ён мог мець нетыповы партрэт, на якім выявіў сябе ў нетыповым узросце?

Другой пісьмовай крыніцай, якая ўзгадваецца у літаратуры ў кантэксце ўзросту Скарыны, з'яўляецца запіс у акце акадэмічных ступеняў падуанскай калегіі дактароў вызваленых навук[13]. Там палачанін тры разы азначаны словам iuvenis, якое звычайна

---

[11] Побач са Скарынам у метрыцы запісаныя Мікалай з Ашмян, Мікалай з Дзітвы, Тамаш з Падлесся. Гл. А. Жлутка, *Францыск Скарына…*, с. 55.

[12] R. C. Schwinges,. *Studenten und Gelehrte…*, с. 119, 271–295.

[13] А. Жлутка, *Францыск Скарына…*, с. 65–67. №8; Martellozzo F. E. (cur.), *Acta graduum academicorum Gymnasii Patavini III/1 ab anno 1501 ad annum 1525*, Padova 1969, p. 226, Nr. 649.

перакладаецца як „малады чалавек". І. Лямешкін, абапіраючыся на тое, як вызначае ўзроставыя межы Ісідор Сівільскі ў адзінаццатай кнізе сваіх „Этымалогій", сцвярджае, што „человек 42 лет от роду тогда абсолютно уверенно относился к категории „молодых людей" (с.278). Абсалютная ўпэўненасць аднак вартая карэкцыі. Рэч у тым, што пры ўсёй аўтарытатыўнасці Ісідора значэнне паняццяў iuvenis і iuventia было даволі размытым. Часам iuventia было сінонімам adolescentia, а часам наогул указвала не на ўзрост, а на статус у сацыяльнай або інстытуцыянальнай іерархіі[14]. І на маю думку хутчэй за ўсё iuvenis у дачыненні да Скарыны ў 1512 годзе ўжыты не ў біялагічным, а менавіта ў сацыяльна-іерархічным сэнсе.

Пры ўсіх вышэйпрыведзеных агаворках варта пагадзіцца з І. Лямешкінам у тым, што запісы з Кракава і Падуі не дазваляюць дакладна вызначыць год нараджэння Ф. Скарына і не абвяргаюць пранаванае ім датаванне. Аднак пагадзіцца з прапанаванай І. Лямешкінам датай не дазваляе перадусім слабасць яго аргументацыі, асабліва з пункту гледжання эмпірычна-крытычнага метада рэканструкцыі гістарычнай рэальнасці, які засвойвае падчас свайго навучання кожны прафесійны гісторык. Менавіта на гэта я звяртаў увагу падчас пражскай прэзентацыі. На жаль, неадэкватнае разуменне аўтарам маіх слоў вылілася ў другім выданні ў пасаж з элементамі шавіністычнага хамства:

> Упрёк в том, что жанрово-детерминированное чтение портрета и, соответсвенно, идентификация хрононима не обрели предварительного благославления со стороны белорусских историков звучит комично. С таким же успехом консилиум скарыназнавцев (так у тэксце! *П. К.*) мог бы рассматривать и ставить под сомнение идентичные (и по содержанию и по функции) сопроводительные тексты, читаемые на произведениях Лукаса Кранаха или Ганса Гольбейна.

[14] K. G. Cushing, *Pueri, Iuvenes, and Viri: Age and Utility in the Gregorian Reform*, «The Catholic Historical Review» , 2008, Vol. 94, No. 3 (Jul., 2008), p. 435–449, p. 439–441; J. A. Burrow, *The Ages of Man. A Study in Medieval Writing and Thought*, Oxford 1988, p. 445–447.

Разгледзім праз прызму эмпірычна-крытычнага метада пытанне прачытання спалучэння MZ на партрэце. Версія, што MZ гэта ініцыялы мастака ці разбяра, мае апору ў крыніцах, бо ў графічных і жывапісных творах таго часу такое спалучэнне з'яўляецца аўтарскай манаграмай. Менавіта так чыталі гэта спалучэнне іншыя даследчыкі. Ды і сам І. Лямешкін прызнае, што MZ падобнае па форме на манаграму (с. 157–158). Аднак аўтар сцвярджае, што гэта кірылічны лічэбнік запісаны вяззю без цілта, які пазначае ўзрост Скарыны. Найлепшым доказам быў бы, безумоўна, іншы партрэт з таго часу, дзе такая ідэнтыфікацыя была б бясспрэчнай – напрыклад лічэбнік быў бы запісаны пад цілтам, або лічба адпавядала б узросту, надзейна ўстаноўленаму з іншых крыніц. Такіх партрэтаў І. Лямешкін не прыводзіць. Выразна падмацаваць тэзіс аўтара маглі б прыклады: а) абазначэння веку выяўленай асобы на еўрапейскім партрэце таго часу толькі лічбай, без слоўнага суправаджэння, б) напісання Скарынам лічэбніка без цілта, в) напісання лічэбнікаў без цілта ў 15–16 ст. І такіх прыкладаў І. Лямешкін не прадстаўляе, абмяжоўваючыся кароткай рэмаркай без спасылкі на крыніцу :«без титла напр., обозначали денежные суммы» (с. 157). Дзіўна, што ў кнізе вельмі багата ілюстраванай, дзе некаторыя дакументы прэзентуюцца тройчы: у выглядзе факсіміле, транслітэрацыі і пераклада, дзе аб'ёмныя цытаты суправаджаюць аб'ёмныя пераклады, не знайшлося месца для ілюстрацыі, ці хаця б спасылкі, якая б падмацавала ключавы тэзіс аўтара. Сыходзячы са спосабу працы І. Лямешкіна з крыніцамі, пра які гаворка пойдзе ніжэй, дазволю сабе высунуць здагадку, што пра абазначэнне грашовых сумаў І. Лямешкін мог прачытаць на старонцы Вікіпедыі „Система записи чисел кириллицей", дзе прыведзенае факсіміле „Примеры записи денежных сумм без титла (Акт передела меди в монету начала XVIII века)" і проста пасароўмеўся даць на яго спасылку[15]. Як

[15] https://ru.wikipedia.org/wiki/Система_записи_чисел_кириллицей; https://ru.wikipedia.org/wiki/Система_записи_чисел_кириллицей#/media/Файл:Rur1.jpg [доступ 06. 06. 2023].

бы там не было аўтар не прывёў у сваім даследаванні крыніц, якія б адназначна пацвяржалі прачытанне MZ як лічэбніка 47.

Аўтар сцвярджае, што „бласлаўлення гісторыкаў" не патрабуе, бо яго жанрава-стуктурны аналіз абапіраецца на прынцыпы „цэласнай філалогіі" Пражскага лінгвістычнага гуртка. Перасячэнне двух метадаў дзвюх дысцыплін у адным пытанні адкрывае прастору для метадалагічнай дыскусіі. Такой дыскусіі аднак перашкаджала тое, што ў першым выданні метадалогію аўтар экспліцытна не прадставіў, знайшоўшы ёй месца толькі на старонках 271–273 другога выдання, у главе, якая, па яго словах, пісалася „вынужденно". Відавочна, што ў навуковым выданні метадалогія мае займаць больш пачэснае месца.

Аўтар разлядае партрэт як „цэласны знак", які ў розных камунікатыўных сітуацыях і пры наяўнасці ці адсутнасці пэўных элементаў мяняе сваё значэнне. Згодна з І. Лямешкінам партрэт 1517 года – гэта рэпрэзентацыйны партрэт, які ў сваёй кампазіцыі парафразуе гравюру Дзюрэра 1514 года. Элементамі свецкага партрэта з'яўляецца пазначэнне ўзроста (абавязковы элемент чэшскага партрэта на той час) і муха, якая мае указваць на тое што перад чытачом выява не сакральнага характару. У кнізе 1519 года Скарына выкарыстаў свой партрэт як выяву Св. Ераніма, прыбраўшы дзеля гэта вышэйназваныя элементы.

Пры знаёмстве з метадалогіяй аўтара і яе аплікацыяй узнікае пытанне: якія ўласна патрабаванні мае ў рамках „цэласнай філалогіі" споўніць выказванне, каб лічыцца даказаным? Бо аўтар у сваім даследаванні выкарыстоўвае вельмі размыты доказавы стандарт. Так медытацыя над дзвюмя выявамі становіцца неабвержным доказам сувязі дзюрэраўскага Ераніма і Скарынавага партрэта. „Аблігаторнасць" пазначэння ўзросту на партрэце даказваецца постцэдэнтамі, у той час як немагчымасць прысутнасці манаграмы адсутнасцю прэцэдэнтаў. Адным з доказаў, што MZ не манаграма становіцца яе вялікі памер:

> Такой размах, если бы здесь была действительно авторская монограмма, подошёл бы для художника с незаурядными амбициями (ср. Дюрера, который со временем модифицировал и увеличивал свою монограмму) При таких амбициях пражский автор должен был бы своим знаком разбрасываться направо и налево, однако этого нигде не происходит (с. 156).

Можна толькі пазайздросціць здольнасці І. Лямешкіна вызначаць памер амбіцый безыменных асоб, якія жылі 500 год таму! Аднаму з асноўных палажэнняў аўтара – паўторнаму выкарыстанню партрэта як выявы Св. Ераніма, якое прымусіла выдаліць манаграму і муху, супярэчыць факт таго, што на выяве ў Кнізе царстваў пакінуты подпіс „Доктор Францискъ Скорін[а]”. Аўтар тлумачыць гэту супярэчнасць арыентацыяй на розныя чытацкія аўдыторыі. Існаванне ж гэтых аўдыторыі даказваецца… неабходнасцю вырашыць узгаданую супярэчнасць. Спосаб аргументацыі І. Лямешкіна ў абагуленым выглядзе выглядае наступным чынам: магло быць так, а значыць так было і толькі так было. Вяршыняй падобнага спосабу аргументацыі з’яўляецца шостая глава, дзе выказанае аўтарам дапушчэнне праз 20 старонак тэксту ператвараецца без нейкіх дадатковых аперацый ва ўпэўненае сцверджанне[16].

Магчыма, аднак, што ўзгаданыя недахопы вынікаюць не са слабасці абранай метадалогіі, а з аўтарскім падыходам, які сярод іншага вызначаецца працай з крыніцамі на ўзроўні, які не адпавядае навуковым стандартам, а таксама шырокім выкарыстаннем рытарычных прыёмаў, якім не месца ў навуковым дыскурсе. Гэта можна праілюстраваць на двух прыкладах.

Так глава 10 завяршаецца наступнымі радкамі:

> Портрет, созданный в 1517 г. в традиции Северного Возрождения, – это информативный и подлинный документ своей эпохи … Как и все другие источники XVI. в. он требует к себе уважительного отношения, что предполагает его исключительно научное изучение

[16] Падрабязней: P. Kotau, *Новое прочтение…*, с. 275–276.

– изучение в культурно историческом контексте своего времени. Пренебрегать информацией, которую нам сообщили Ф. Скорина и пражский художник, мы не имеем права. Не хотелось бы, что бы его постигла судьба грамоты Фердинанда I от 29. 01. 1552…: не смотря на то, что в ней чешский король назвал Ф. Скорину „нашим садовником", до сих пор появляются те, кто скептически оценивает службу Ф. Скорины в должности королевского садовника. В нашем распопяжении слишком мало аутентичных источников и данных, что бы мы могли позволить себе их игнорировать или интерпретировать „по зову сердца". (с. 281)

Такім чынам той, хто ставіць пад сумнеў высновы І. Лямешкіна зневажае „дакумент", якім з'яўляецца партрэт 1517 году, так, як зневажаюць пацвярджальны ліст Фердынанда I Сімяёну Русу 1552 тыя, хто скептычна ставіцца да таго, што Скарына быў каралеўскім садоўнікам.

Першай падменай паняццяў, магчыма несвядомай, з'яўляецца змешванне ў кучу розных тыпаў гістарычных крыніц. Графічны партрэт не з'яўляецца такім жа „дакументам" як копія каралеўскага акту ў кнізе копій. У тэксце дакумента 1552 г. няма элементаў, якія б дапускалі розначытанняў у адрозненні ад партрэта. Доказы свайго прачытання, якія б меў прывесці І. Лямешкін, калі б сапраўды разглядаў партрэт так, як ставіцца гістарыяграфія да пісмовых крыніц, былі пералічаныя вышэй.

Другой маніпуляцыяй з'яўляецца апісанне пазіцыі адносна службы Ф. Скарыны садоўнікам неназваных І. Лямешкінам „тех". Рэч у тым, што ніхто не аспрэчвае сведчанняў Фердынадавага дакумента 1552 г. Скепсіс, які мае пад сабой падставы выклікае атаясамленне „італьянскага садоўніка", „майстра Францыска", які ўзгадваецца ў карэспандэнцыі ў 1535–39 гг.[17] Сумнявацца ў тым, што Ф. Скарына быў садоўнікам у трыцатыя гады ў Празе не тое ж самае, што адмаўляць яго службу у Фердынанда ў якасці садоўніка наогул.

[17] А. Жлутка, *Францыск Скарына*… с. 347.

Разгледзім аднак падрабязней, як сам І. Лямешкін працуе з дакументам, за лёс якога так перажывае. Дакумент аўтар змяшчае ў факсіміле, аўтарскай транслітэрацыі і ўласным перакладзе (с. 63–64). Пры гэтым І. Лямешкін дае спасылку толькі на архіў, не ўзгадваючы папярэднія выданні. Што ж, магчыма аўтар вырашыў не звяртаць увагі на папярэднікаў, якія дапускалі памылкі, і працаваў з крыніцай самастойна. Адна дэталь паказвае, што гэта не так. Рэч у тым, што папярэднія выдаўцы памыліліся ў даціроўцы. Дакумент дадзены ў чацвер пасля Св. Фабіяна і Себасцьяна. Гэтае свята мае ў царкоўным календары фіксаваную дату і адзначаецца 20 студзеня. У 1552 годзе 20 студзеня прыпадала на сераду, таму пацвярджальны ліст быў выдадзены 21. 01. 1552. Аднак першы выдавец Францішак Дворнік з незразумелых прычын датаваў дакумент 28-м студзеня, а Антон Фларoўскі выправіў на абсалютна немагчымае 29 студзеня (калі б 29-га было чацверам то паміж ім і Св Фабіянам і Себасцьянам быў бы яшчэ адзін чацвер – 22-га).[18] Ад Фларoўскага памылка перакачавала ва ўсю скарыназнаўчую літаратуру і выпраўленая была толькі ў сборніку дакументаў пад рэдакцыяй А. Жлуткі[19]. Калі б І. Лямешкін сапраўды самастойна працаваў з дакументам, то датаваў бы яго правільна, але ён паслядоўна выкарыстоўвае перанятую без спасылкі ў папярэднікаў дату 29. 01. Як бачым І. Лямешкін сам „пагарджае інфармацыяй якую нам паведамілі складальнікі дакумента".

У другім выданні І. Лямешкін выправіў сваё памылковае атаясамленне пажылога лысага чалавека на чатырох гравюрах Скарыны з найвышэйшым канцлерам чэшскага каралеўства Ладзіславам з Штэрнберка і на Бехіне. Для ідэнтыфікацыі аўтар памылкова выкарыстаў надмагілле яго ўнука Ладзіслава з Штэрберка на Зеленай Горы а Планіцэ з касцёла ў горадзе Нэпамук. Аўтар прыносіць

[18] F. Dvorský, *Přispěvky k dejinam Slovanským*, „Slovansky sborník" 1885, R. 4, č. 4, s. 212; A. Florovskij, *Nové zprávy o pobytu Františka Skoryny v Praze*, „Časopis Národního Musea, oddíl duchovědný", 1936, R. 110, s. 11–12.

[19] А. Жлутка, *Францыск Скарына*…, с. 216–217, 355–356.

выбачэнні за памылку і тлумачыць яе прычыны. Паводле ягоных словаў, аднаго з найвышэйшых ураднікаў чэшскага каралеўства ў постаці гэтага мужчыны аўтар пазнаў на падставе таго, што мужчына гэты выяўлены на гравюрах побач з манархам. Праверыць самастойна гіпотэзу І. Лямешкіну не дазволілі супрацьковідныя абмежаванні, таму ён даслаў запыт у касцёл у горадзе Непамук, адкуль прыйшоў фотаздымак часткі надмагілля, без надпісу, што, маўляў, і прывяло даследчыка у зман.

Памылкі здараюцца і ёсць часткай працы любога даследчыка, таму пасля прызнння памылкі, яе выпраўлення і прынесеных прабачэнняў можна б было лічыць пытанне закрытым. Але І. Лямешкін маніць у сваіх тлумачэннях. Па-першае, пра прысутнасць найвышэйшага канцлера на гравюрах Скарыны аўтар узгадваў яшчэ ў публікацыях, якія выйшлі ў 2017 і 2019 годзе[20]. У яго было мінімум тры гады, каб сваю гіпотэзу спраўдзіць, але ён з гэтым не спяшаўся, спакойна пры гэтым выкарыстоўваючы бяздоказнае суаднясенне ў сваіх працах. Калі б аўтар цягам трох год адкрыў, напрыклад, працу Паўла Юржыка, якая пабачыла свет у 2013 годзе, то знайшоў бы там інфармацыю і пра Ладзіслава са Штэрнберка на Бехіне памерлага ў 1521 годзе, і пра яго ўнука Ладзіслава (Лацка), які памёр у 1566 годзе і быў пахаваны ў касцёле горада Непамук. Змешчана там выява і таго самага надмагілля[21]. Дзіўным выглядае і тое, што вырашыўшы ўрэшце праверыць сваю гіпотэзу І. Лямешкін скіраваў свой запыт менавіта ў Непамук. Што яго магло туды накіраваць?

Калі даверыцца першым вынікам пошуку выявах у гугл, то можна патрапіць на аматарскую старонку, з выявавай барэльефа ў Непамуку з выдання пачатку 20-стагоддзя, падпісаную Ladislav

[20] S. Narbutas, *Pranciškaus Skorinos…,* s. 64; Лемешкин И., *1470 – год рождения Ф. Ско́рина* [w:] *Францыск Скарына: новыя даследаванні*, Укл. А. Груша, Мінск 2019. С. 31.

[21] P. Juřík, *Šternberkové: panský rod v Čechách a na Moravě*, Praha 2013, s. 61–64.

ze Šternberka[22]. Дадзеная акалічнасць можа служыць тлумачэннем вышэйназваных няяснасцяў. Ёсць падставы лічыць, што І. Лямешкін „знайшоў" Штэрнберка найпазней у 2017 годзе, і зрабіў суаднясенне не толькі на аснове ўласных спекуляцый, але і грунтуючыся на рысунку ў інтэрнэце. Упэўнены ў сваёй ідэнтыфікацыі, аўтар і не спрабаваў знайсці пацверджанне ў навуковай літаратуры і толькі неабходнасць мець якасную выяву для кніжнага выдання прымусіла яго зрабіць запыт у касцёл у Непамуку. Такое некрытычнае выкарыстанне інфармацыі з інтэрнэта без спасылкі на крыніцу не адпавядае стандартам навуковай працы, а спробы недагаворкамі схаваць нізкія стандарты – простай чалавечай прыстойнасці.

Значнасць асобы Скарыны і яго папулярнасць у Беларусі сапраўды прыводзяць да ўзнікнення вялікай колькасці калянавуковых і ненавуковых публікацый. Як вынік жыццё і дзейнасць друкара хутка абрастаюць тым, што Георгій Галенчанка назваў „пацінай версій, стэрыятыпаў і міфаў". У такіх умовах яшчэ большая адказнасць кладзецца на навукоўцаў, якія мусяць у сваіх працах выразна аддзяляць факты ад уласных гіпотэз і спекуляцый. І. Лямешкін піша пра „неблагополучие" скарыназнаўства, асабліва беларускага. Аднак яго ўласная кніга пры падразбязным разглядзе выяўляецца не лекам на хваробу, а яе сімтомам.

[22] https://hradyplzenskehokraje.estranky.cz/fotoalbum/nahrobky-a-podobizny/nahrobek---ladislav-ze-sternberka---kostel-nepomuk--.html [доступ 14.06.2023].

Noty o Autorach

Mikołaj Chaustowicz – profesor, pracownik Katedry Białorutenistyki Uniwersytetu Warszawskiego. Zainteresowania naukowe: historia literatury białoruskiej XIX wieku.

Tomasz Cudowski – absolwent Instytutu Filologii Rosyjskiej Uniwersytetu Adama Mickiewicza, obecnie doktorant na Uniwersytecie Warszawskim. Zainteresowania naukowe: rosyjska literatura fantastyczna i fantastycznonaukowa.

Kevin Foglar – magister prawa, absolwent Wydziału Prawa i Administracji Uniwersytetu Jagiellońskiego. Założyciel kancelarii prawnej Foglar Law and Translation (https://foglar.pl/). Tłumacz przysięgły języka angielskiego.

Pavel Kotau – magister, historyk. Pracuje w Katedrze Historii na Wydziale Filozofii Uniwersytetu Palackiego w Ołomuńcu. Zainteresowania badawcze: historia religijna na ziemiach Wielkiego Księstwa Litewskiego, stosunki międzywyznaniowe na Białorusi w średniowieczu.

Dangiras Mačiulis – profesor, pracownik Instytutu Historii Litwy (Wilno). Zainteresowania naukowe: historia polityczna i historia kultury Litwy (w tym pamięć zbiorowa) XX w.

Andrei Mastyka – magister, historyk. Współpracownik Uniwersytetu Witolda Wielkiego w Kownie. Zainteresowania naukowe: historia białoruskiego ruchu studenckiego w Polsce w okresie międzywojennym.

Yury Tamkovich – badacz niezależny, absolwent Wydziału Historycznego Białoruskiego Uniwersytetu Państwowego. Zainteresowania naukowe: kultura rycerska w Wielkim Księstwie Litewskim w XIV–XVI w.

Tetyana Trofimenko – doktor literaturoznawstwa, krytyk literacki. Zainteresowania naukowe: współczesna literatura ukraińska.

Viktar Yakubau – doktor historii, stypendysta na Wydziale Artes Liberales Uniwersytetu Warszawskiego. Zainteresowania naukowe: historia wojskowości Wielkiego Księstwa Litewskiego w XVI–XVII w.

Jakob Wunderwald – pracownik Uniwersytetu w Poczdamie. Zainteresowania naukowe: białoruska literatura wojenna.

Stsiapan Zakharkevich – doktor etnologii, pracownik Europejskiego Uniwersytetu Humanistycznego w Wilnie. Zainteresowania naukowe: antropologia kulturowa, białoruska tożsamość narodowa na współczesnym etapie.

Projekt okładki
Paweł Patelski

Ilustracja na okładce
autor nieznany, miniatura z ewangeliarza Ottona III, ok. 1000 r.

Realizacja wydawnicza
Akant Alina Wiszenko-Zabrowarny (akant@home.pl)

Korekta i redakcja tekstów w językach angielskim, białoruskim i ukraińskim
Jerzy Grzybowski, Marzena Grzybowska, Rostysław Kramar

Korekta i redakcja tekstów w języku polskim
Elżbieta Morawska, Monika Grącka

Wydawca
Uniwersytet Warszawski
Instytut Studiów Interkulturowych Europy Środkowo-Wschodniej
ul. Dobra 55, 00-312 Warszawa

© Copyright by Uniwersytet Warszawski Katedra Studiów Interkulturowych Europy Środkowo-Wschodniej & individual articles to their Authors, 2024

ISSN 2543-618X

Adres redakcji
Uniwersytet Warszawski
Instytut Studiów Interkulturowych Europy Środkowo-Wschodniej
ul. Dobra 55, 00-312 Warszawa
psw@uw.edu.pl
www.psw.uw.edu.pl

Wszystkie artykuły są recenzowane
Wersja pierwotna czasopisma: papierowa
Nakład: 50 egz.

Instytut Studiów Interkulturowych Europy Środkowo-Wschodniej istnieje na Uniwersytecie Warszawskim jako jednostka, która powstała z myślą o prowadzeniu badań nad regionem Europy Środkowo-Wschodniej, obejmującym takie kraje jak: Polska, Białoruś, Czechy, Litwa, Niemcy i Austria, Rosja, Słowacja, Ukraina. Instytut posiada również własną koncepcję studiów na kierunku „Kulturoznawstwo Europy Środkowo-Wschodniej", mającą zapewnić studentom gruntowną i wszechstronną wiedzę w zakresie języków, historii, kultury i sztuki danego regionu. Misją Instytutu jest dążenie do coraz pełniejszego i prawdziwszego rozumienia sytuacji interkulturowej w regionie w ujęciu historycznym i współczesnym.

Więcej informacji na stronie: www.ksi.uw.edu.pl

ISSN 2543-618X